Частное учреждение образования
«Институт современных знаний имени А. М. Широкова»

Факультет гуманитарный
Кафедра межкультурной коммуникации

| | |
|---|---|
| СОГЛАСОВАНО<br>Заведующий кафедрой<br>Сидорович Л. Н.<br>______________________<br>09.02.2018 г. | СОГЛАСОВАНО<br>Декан факультета<br>Пуйман С. А.<br>______________________<br>09.02.2018 г. |

# БЕЛОРУССКАЯ И ВСЕМИРНАЯ ЛИТЕРАТУРА

*Электронный учебно-методический комплекс*
*для студентов специальностей 1-17 03 01 Искусство эстрады (по направлениям), 1-21 04 01 Культурология (по направлениям)*

Составитель
Гурская Е. С., доцент кафедры межкультурной коммуникации частного учреждения образования «Институт современных знаний имени А. М. Широкова», кандидат филологических наук, доцент

Рассмотрено и утверждено
на заседании Совета Института
протокол № 6 от 06.02.2018 г.

УДК 821.0(075.8)
ББК 83.3я73

Р е ц е н з е н т ы:

кафедра зарубежной журналистики и литературы Института журналистики Белорусского государственного университета (протокол № 11 от 20.01.2018 г.);

*Воробей А. Л.,* доцент кафедры истории белорусской литературы Белорусского государственного университета, кандидат филологических наук, доцент.

Рассмотрено и рекомендовано к утверждению
кафедрой межкультурной коммуникации
(протокол № 5 от 19.12.2017 г.)

Б43 **Гурская, Е. С.** Белорусская и всемирная литература : учеб.-метод. комплекс для студентов специальностей 1-17 03 01 Искусство эстрады (по направлениям), 1-21 04 01 Культурология (по направлениям) [Электронный ресурс] / Авт.-сост. Гурская Е. С. – Электрон. дан. (1,8 Мб). – Минск : Институт современных знаний имени А. М. Широкова, 2018. – 252 с. – 1 электрон. опт. диск (CD).

Систем. требования (миним.) : Intel Pentium (или аналогичный процессор других производителей) 1 ГГц ; 512 Мб оперативной памяти ; 500 Мб свободного дискового пространства ; привод DVD ; операционная система Microsoft Windows 2000 SP 4 / XP SP 2 / Vista (32 бит) или более поздние версии ; Adobe Reader 7.0 (или аналогичный продукт для чтения файлов формата pdf).

Номер гос. регистрации в НИРУП «Институт прикладных программных систем» 1181814846 от 16.03.2018 г.

Учебно-методический комплекс представляет собой совокупность учебно-методических материалов, способствующих эффективному формированию компетенций в рамках изучения дисциплины «Белорусская и всемирная литература».

Для студентов вузов.

ISBN 978-985-547-228-6

© Институт современных знаний
имени А. М. Широкова, 2018

# ПОЯСНИТЕЛЬНАЯ ЗАПИСКА

Учебно-методический комплекс по дисциплине «Белорусская и всемирная литература» составлен в соответствии с требованиями к обязательному содержанию и структуре данного типа учебно-методической литературы, к уровню подготовки дипломированного специалиста. Надобность в подобном издании возникает по причине отсутствия современного, подготовленного по новым технологиям учебника по такому сложному, объемному, интеллектуально насыщенному курсу, как «Белорусская и всемирная литература». Учебно-методический комплекс предназначен для студентов 1–2 курсов специальностей «Искусство эстрады», «Культурология».

Основными задачами изучения истории белорусской и всемирной литературы являются: углубленное познание творческих процессов в национальных литературах, предопределивших развитие мирового литературного процесса, их интерпретация отечественными и зарубежными литературоведами; освоение основного корпуса художественных текстов, представляющих золотой фонд классической мировой литературы.

В структуре курса наиболее целесообразным представляется сочетание национально-хронологического принципа с теоретическим, обзорных лекций и монографических характеристик творчества крупнейших писателей. При изучении художественного наследия писателей-классиков и творческих достижений современных авторов нет необходимости останавливаться на всех произведениях – важно выделить этапные, самые известные, раскрыть разные грани творчества одного автора. В то же время в лекционном курсе представлены наиболее трудные для понимания студентов произведения, литературно-исторические явления. Автор-составитель осознает, что при всем стремлении к объективности в отборе имен, художественных идей и стилевых форм трудно избежать субъективности в системе самих критериев отбора и оценки литературных фактов. Но это только подчеркивает, что предложенный материал не претендует на абсолютность и законченность и предоставляет возможность сотворчества, включения новых имен, идей, творческой полемики.

Дисциплина «Белорусская и всемирная литература» читается в течение 1–3-го семестров. Курс способствует усвоению принципов основных литературоведческих методов исследования, формированию представления об общих закономерностях развития литературного процесса, овладению приемами литературоведческого анализа текста, определению идейно-эстетического своеобразия произведений и творчества писателя в целом; развитию навыков работы с исследовательской литературой, умению применять знания в практике филологической интерпретации художественного произведения.

Содержание учебно-методического комплекса по дисциплине «Белорусская и всемирная литература» структурировано в соответствии с учебной программой и включает все необходимые компоненты. Выбор теоретического материала для освещения в курсе лекций обусловлен количеством часов, определенных в учебной программе, степенью сложности литературного явления, актуальностью проблематики. Практический блок включает вопросы для обсуждения в аудитории с целью закрепления наиболее сложных учебных тем, понимания закономерностей литературных явлений и фактов. В разделе контроля знаний и вспомогательном разделе содержится необходимая учебно-методическая документация (перечень вопросов к экзаменам, учебная программа). Сориентироваться в выборе необходимых теоретических и практических сведений поможет список научной литературы.

# 1. ТЕОРЕТИЧЕСКИЙ РАЗДЕЛ

## 1.1. КОНСПЕКТ ЛЕКЦИЙ ПО ДИСЦИПЛИНЕ

## Беларуская літаратура

### Тэма 1. Літаратура як частка сусветнай мастацкай культуры

Літаратура (лац. lit(t)eratura − напісанае, рукапіс, ад lit(tera) − літара) − адзін з асноўных відаў мастацтва – мастацтва слова. Тэрмінам «літаратура» абазначаюць таксама любыя тварэнні чалавечай думкі, якія замацаваны ў пісьмовым слове і валодаюць грамадскім значэннем. У звычайным і больш строгім сэнсе літаратурай называюць творы мастацкай пісьменнасці. Паводле характару адлюстравання рэчаіснасці літаратура падзяляецца на мастацкую, публіцыстычную, дакументальную, дыдактычную, эпісталярную, літаратурную крытыку і мастацкі пераклад. У сваю чаргу, мастацкая літаратура дзеліцца на прозу, або белетрыстыку (у тым ліку раманістыку, навелістыку), паэзію і драматургію; з публіцыстыкі вылучаецца аратарская проза, або красамоўства; мастацка-дакументальная літаратура ўключае мемуарную, у т. л. летапісную, а таксама жыційную (старажытныя апавяданні пра жыццё святых), гістарычную; з дыдактычнай літаратуры можна выдзеліць навуковую паэзію. Да эпісталярнай літаратуры адносяцца лісты пісьменніка, яго перапіска з іншымі асобамі. Літаратурная крытыка далучаецца да ўласна літаратуры не толькі таму, што таксама адлюстроўвае (хоць і апасродкавана, шляхам разгляду твора) рэальнае жыццё, але і дзякуючы выяўленчым мажлівасцям слова, што зблiжае крытыку з публіцыстыкай. Мастацкі пераклад мае непасрэднае дачыненне як да твораў літаратуры, так і да слоўна-вобразнай творчасці ўвогуле. З усяго масіву літаратуры паводле сваёй скіраванасці вылучаецца дзіцячая літаратура і так званая масавая літаратура − шматтыражныя забаўляльныя творы, разлічаныя на не надта патрабавальных чытачоў.

Тэрмін «літаратура» (ці, як гаварылі раней, прыгожае пісьменства) узнік параўнальна нядаўна і пачаў шырока выкарыстоўвацца ў XVIII ст., выцесніўшы тэрміны «паэзія», «паэтычнае мастацтва», якія зараз абазначаюць вершаваныя творы. Ён быў выкліканы да жыцця кнігадрукаваннем, якое, з'явіўшыся ў сярэдзіне XV ст., параўнальна хутка зрабіла «літаратурную» (г. зн. прызначаную для чытання) форму быцця мастацтва слова асноўнай і безумоўна пануючай; раней мастацтва слова існавала перш за ўсё для слухання, для публічнага выканання і разумелася як умелае, адмысловае мастацкае ажыццяўленне «паэтычнага дзеяння сродкамі асаблівай паэтычнай мовы» («Паэтыка» Арыстоцеля, старажытныя і сярэдневяковыя паэтычныя трактаты Захаду і Усходу).

Літаратура (мастацкае слова) узнікае на глебе вуснай народнай славеснасці ў глыбокай старажытнасці − у перыяд фарміравання дзяржавы, якая з неабходнасцю нараджае развітую форму пісьменнасці. Аднак першапачаткова літаратура не выдзяляецца з пісьменнасці ў шырокім сэнсе слова. У старажытных помніках, такіх, як Біблія, Махабхарата ці «Аповесць мінулых гадоў», элементы слоўнага мастацтва існуюць у непадзельным адзінстве з элементамі міфалогіі, рэлігіі, зачаткамі прыродазнаўчых і гістарычных навук, рознага роду інфармацыяй, маральнымі і практычнымі ўказаннямі і г. д. У канцы XIX ст. рускі літаратуразнаўца і фалькларыст А. М. Весялоўскі паклаў пачатак традыцыі, згодна з якой мастацтва слова прынята выводзіць з першабытнага сінкрэтызму. «Ядро першабытнай духоўнай культуры, − адзначае даследчык Е. М. Меляцінскі, − склалі цесна звязаныя паміж сабою міф і абрад. Міф быў дамінантаю ў ідэалагічным сінкрэтызме першабытнай культуры, а абрад быў цэнтрам і галоўным змяшчальнікам фармальнага адзінства. Міф і абрад можна лічыць тэарэтычным і практычным аспектамі аднаго і таго ж феномена». Лічыцца, што ў межах народнага абраду ўзніклі старажытная паэзія і старажытны тэатр. Паэзія ўяўляла сабой песню хору, якая суправаджалася пантанімічнымі рухамі і танцамі.

Асноўнай крыніцай эпасу Е. М. Меляцінскі называе міф. Першым героем міфа быў культурны герой, першапродак. Культурны герой – «міфічны персанаж, які здабывае або ўпершыню стварае для людзей розныя прадметы культуры (агонь, культурныя расліны, прылады працы), вучыць іх прыёмам палявання, рамёствам, мастацтвам, уводзіць пэўную сацыяльную арганізацыю, шлюбныя правілы, магічныя прадпісанні, рытуалы, святы». Выдатны прыклад культурнага героя – Праметэй (вынайшаў падземныя багацці, стральбу з лука, дойлідства, лячэнне, мастацтва пісьма і ліку, пазнанне законаў прыроды, гаданне па птушках, ганчарства, кавальства, прыручэнне жывёл, агонь). У старажытных грэкаў былі наступныя культурныя героі: каваль Гефест, багатыр-волат Геракл, забойца Медузы Гаргоны і выратавальнік Андрамеды Персей і інш. На Усходзе адным з найбольш вядомых культурных герояў з'яўляецца Гільгамеш (стваральнік культурнага асяродку горада Урука ў Міжрэччы, дзе герой будуе храм, крэпасць і інш.). Сінкрэтычны характар ранніх літаратурных помнікаў не пазбаўляе іх эстэтычнай каштоўнасці, паколькі выяўленая ў іх рэлігійна-міфалагічная форма свядомасці была па сваёй структуры блізкая да мастацкай. Літаратурная спадчына самых старажытных цывілізацый – Егіпта, Кітая, Іудзеі, Індыі, Грэцыі, Рыма і інш. – утварае свайго роду фундамент сусветнай літаратуры.

Вечныя вобразы ў сусветнай літаратуры – умоўная назва вобразаў, што ўвасабляюць агульначалавечыя, «вечныя» якасці. Яны ўзніклі ў канкрэтную гістарычную эпоху, але ў свядомасці наступных пакаленняў, у творчасці буйных пісьменнікаў пераўтварыліся ў мнагазначныя, шырокавядомыя сімвалы. Класічных вечных вобразаў пяць. Яны паходзяць з міфалогіі (Праметэй), легенд розных народаў (Дон Жуан, Фаўст), літаратурных крыніц (Гамлет) як вынік прынцыпова новай трактоўкі даўняга падання або арыгінальнае тварэнне пісьменніка (Дон Кіхот).

Хоць гісторыя літаратуры налічвае некалькі тысячагоддзяў, літаратура ва ўласным значэнні – пісьменная форма мастацтва слова – фарміруецца і ўсведамляе сябе з нараджэннем «грамадзянскасці» буржуазнага грамадства.

Славесна-мастацкія творы мінулых часоў таксама набываюць у гэту эпоху спецыфічнае літаратурнае быццё, перажываючы істотнае пераўтварэнне ў новым – не вусным, а чытацкім успрыняцці. Адначасова адбываецца разбурэнне нарматыўнай «паэтычнай мовы» – літаратура ўбірае ў сябе ўсе элементы агульнанароднага маўлення, яе слоўны «матэрыял», становіцца ўніверсальным. Паступова ў эстэтыцы (у пач. XIX ст., пачынаючы з Гегеля) на першы план вылучаецца чыста змястоўная, духоўная своеасаблівасць літаратуры, і яна ўсведамляецца ў шэрагу іншых (навуковай, філасофскай, публіцыстычнай) відаў пісьменнасці, а не іншых відаў мастацтва. Да сярэдзіны XX ст. сцвярджалася, аднак, сінтэтычнае разуменне літаратуры як адной з форм мастацкага асваення свету, як творчай дзейнасці, якая належыць да мастацтва, але разам з тым з’яўляецца такой разнавіднасцю мастацкай творчасці, якая займае ў сістэме мастацтваў асаблівае месца; гэта адрознае становішча літаратуры зафіксавана ва ўжыванні формулы «літаратура і мастацтва».

Літаратура, як і іншыя віды мастацтва, спалучае ў сабе творчы працэс і працэс успрыняцця, а таксама выконвае разнастайныя функцыі (эстэтычную, забаўляльную, пазнавальную і інш.). Творчы працэс заўсёды звязаны са стварэннем канкрэтнага твора (верша, аповесці, драмы). Гэта заўсёды індывідуальная з’ява. Да творчага працэсу адносіцца ўсё, што звязана з творам: задума, яе ўвасабленне (чарнавыя рэдакцыі і варыянты, рэальны вынік). Літаратура з’яўляецца вынікам творчага працэсу, дзе чалавек – галоўны прадмет мастацтва.

Літаратура – своеасаблівае мастацтва, бо гэта мастацтва слова. Кожнае мастацтва валодае сваімі магчымасцямі ў выяўленні знешняга і ўнутранага свету чалавека. У адрозненне ад астатніх відаў мастацтва (жывапісу, скульптуры, музыкі, танца, інш., якія валодаюць непасрэдна прадметна-пачуццёвай формай, што ствараецца з якога-небудзь матэрыяльнага аб’екта (камень, фарба) ці з дзеяння (рухі цела, гучанне струны), літаратура стварае сваю форму са слоў, з мовы, якая, маючы матэрыяльнае ўвасабленне (у гуках і

апасродкавана літарах), сапраўды спасцігаецца не ў пачуццёвым успрыняцці, а ў інтэлектуальным разуменні.

Такім чынам, форма літаратуры ўключае ў сябе прадметна-пачуццёвы бок – пэўныя комплексы гукаў, рытм верша і прозы (прычым гэтыя моманты ўспрымаюцца ў той ці іншай меры і пры чытанні «пра сябе»), але гэты непасрэдны пачуццёвы бок літаратурнай формы набывае рэальнае значэнне толькі ў яе ўзаемадзеянні з уласна інтэлектуальнымі, духоўнымі пластамі мастацкага маўлення. Нават самыя элементарныя кампаненты формы (эпітэт, метафара, аповед ці дыялог) засвойваюцца толькі ў працэсе разумення (а не непасрэднага ўспрыняцця). Духоўнасць, якая наскрозь пранізвае літаратуру, дазваляе ёй разгарнуць свае ўніверсальныя, у параўнанні з іншымі відамі мастацтва, магчымасці.

«Паэзія ёсць вышэйшы від мастацтва. Усякае іншае мастацтва больш ці менш абмежавана ў сваёй творчай дзейнасці тым матэрыялам, пасродкам якога яно праяўляецца... Паэзія выражаецца ў свабодным чалавечым слове, якое ёсць і гук, і карціна, і пэўнае, ледзь вымаўленае ўяўленне. Таму паэзія заключае ў сабе ўсе элементы іншых мастацтваў, як бы карыстаецца раптам і непадзельна ўсімі сродкамі, якія дадзены паасобку кожнаму з іншых мастацтваў» (В. Г. Бялінскі).

Кожная літаратура мае свае нацыянальныя асаблівасці. Беларуская літаратура, як і любая іншая, непасрэдна ці апасродкавана (шляхам уплыву на суседнія, больш вядомыя і развітыя, літаратуры) уносіць свой уклад у скарбніцу сусветнага мастацкага слова. Агульнаеўрапейскі розгалас набыла творчасць многіх беларускіх пісьменнікаў ХХ ст.: Я. Коласа, Я. Купалы, М. Багдановіча, М. Гарэцкага, К. Чорнага, У. Караткевіча і інш. Творы В. Быкава перакладзены больш чым на пяцьдзясят моў, без іх нельга ўявіць гісторыю не толькі беларускай, але і сусветнай літаратуры др. пал. ХХ ст.

## Тэма 2. Старабеларуская літаратура (лекцыя 1)

*Умовы ўзнікнення і асаблівасці бытавання старажытнай літаратуры*

Для ўзнікнення літаратуры неабходна наяўнасць дзяржавы, якая мела б патрэбу ў пісьменстве, а таксама высокі ўзровень развіцця вуснай народнай творчасці. Зараджэнне літаратуры адбываецца ў перыяд, калі старажытныя ўсходнеславянскія землі былі ў складзе адной дзяржавы, што перажывала часы культурна-гістарычнага ўздыму і палітычнай магутнасці (X – XII стст.).

Пісьменнасць на тэрыторыі рассялення ўсходніх славян існавала і раней, аднак моцным імпульсам для літаратурнага развіцця стала прыняцце хрысціянства ў візантыйскім варыянце (988). Хрышчэнне Русі спрыяла яе палітычнаму развіццю і ўзмацненню сувязяў з іншымі дзяржавамі (Візантыяй, Балгарыяй). З Візантыі праз Балгарыю, якая прыняла хрысціянства на 100 год раней – у 869 г., на нашы землі траплялі царкоўна-рэлігійныя кнігі. Царкоўна-рэлігійнае пісьменства напачатку вызначала змест і характар усёй літаратуры, выконвала ідэалагічную ролю, яно паслужыла падмуркам для зараджэння арыгінальнай літаратурнай творчасці. Працэс перасадкі літаратуры з адной краіны ў другую, такім чынам, быў вельмі плённым і прагрэсіўным.

Заснавальнікамі літаратурнай (старaславянскай, царкоўнаславянскай) мовы былі балгарскія асветнікі Кірыла і Мяфодзій, якія стварылі славянскую азбуку. На стараславянскай мове напісаны амаль усе рэлігійныя творы, мова ж помнікаў свецкага пісьменства адрознівалася: яна ўяўляла сабой варыянт апрацаванай гутарковай мовы тагачасных усходніх славян.

Сярод *спецыфічных асаблівасцей* даўняй літаратуры варта назваць: 1) колькасную перавагу царкоўна-рэлігійных твораў над свецкімі; 2) рукапісны характар; 3) сувязь з фальклорам; 4) узаемадзеянне паганскай і хрысціянскай культур; 5) ананімны характар многіх твораў; 6) шматмоўе; 7) сінкрэтызм; 8) шматжанравасць.

Першымі рукапіснымі кнігамі на ўсходнеславянскіх землях з’яўляюцца Астрамірава Евангелле (50-я гг. XI ст., Кіеў), Ізборнік Святаслава (1073). Пазнейшым часам датуецца Тураўскае Евангелле, або Тураўскія лісткі (XI ст.),

Полацкае Евангелле (канец XII ст.), Аршанскае Евангелле (канец XII – пач. XIII ст.).

***Літаратура ранняга Сярэднявечча***

*Перакладная літаратура.* Перакладная візантыйская літаратура ў той час цесна спалучалася з арыгінальнай, з мясцовымі традыцыямі, творча перапрацоўвалася. Яна знаёміла ўсходнеславянскага чытача з сусветнай гісторыяй, узбагачала маладую арыгінальную літаратуру новымі жанрамі. Найбольшае распаўсюджанне ў часы ранняга Сярэднявечча праз пасрэдніцтва Балгарыі атрымалі кнігі Біблii (Старога і Новага Запавету). Першыя пераклады біблейскіх тэкстаў былі зроблены Кірылам і Мяфодзіем. Тры з рукапісаў X – XI стст. створаны на беларускіх землях (Тураўскае, Полацкае і Аршанскае Евангеллі).

*Патрыстыка*, або апалагетыка (грэч. apologetikos – абарончы), займала адно з цэнтральных месцаў сярод перакладной літаратуры. Гэта творы айцоў царквы, рымскіх і візантыйскіх багасловаў, напісаныя ў раннехрысціянскі перыяд (II – III стст., росквіт у эпоху Рыма, у IV – V стст.). Сярод класікаў патрыстыкі вылучаўся Іаан Залатавуст, творы якога карысталіся вялікай папулярнасцю і аказалі значны ўплыў на арыгінальную творчасць мясцовых майстроў слова – Кірылы Тураўскага, Рыгора Цамблака, пісьменнікаў-палемістаў. Апалагетамі хрысціянства таксама з’яўляюцца Іаан Дамаскін, Рыгор Назіанзін (Багаслоў), Васіль Кесарыйскі, патрыстычныя творы якіх былі добра вядомы на Русі ў перакладах на царкоўнаславянскую мову. У патрыстычнай літаратуры абгрунтоўваліся асноўныя палажэнні хрысціянства, даваліся каментары да біблейскіх тэкстаў, вялася палеміка з ерэтыкамі. Двум галоўным відам такой літаратуры адпавядаюць дзве асноўныя жанравыя формы: павучанне і пропаведзь.

Распаўсюджаны быў такі від перакладной царкоўна-рэлігійнай літаратуры, як апокрыфы. *Апокрыфы* (з грэч. таемны) – легендарна-рэлігійныя творы, тэматычна блізкія да кананічных тэкстаў, але з іншай трактоўкай падзей, сюжэтным несупадзеннем. Акрамя таго, у некаторых апокрыфах закраналіся

сацыяльныя праблемы, выказваліся ерэтычныя ідэі. Так, у «Аповесці пра стварэнне Богам Адама» сцвярджаецца, што ў стварэнні чалавека прымалі ўдзел боская і д'ябальская сілы, а гэта было недапушчальнай ерассю. У старажытнарусіх спісах захаваліся «Хаджэнне Агапія ў рай», «Жыццё прарока Ераміі, «Сказанне прарока Данііла», «Хаджэнне Багародзіцы па пакутах».

*Жыційная літаратура*, або *агіяграфія* (з грэч. – жыццяпісы святых), – такі від літаратуры, дзе расказваецца пра жыццё духоўнай ці свецкай асобы, кананізаванай хрысціянскай царквой. Агіяграфічныя творы ўзніклі ў першыя стагоддзі хрысціянства ў Рымскай імперыі і ўяўлялі сабой павучальныя гісторыі з жыцця пакутнікаў, якое павінна было служыць прыкладам для вернікаў. Генетычна жыціі ўзыходзяць да антычнай белетрыстыкі, паступова элемент займальнасці саступае месца прагматызму і схематычнасці, творы набываюць выразна выяўлены дыдактычна-павучальны характар. Жыціі складаюцца па пэўнай схеме-каноне. Звычайна герой ідэалізаваны, пазбаўлены індывідуальных рыс, дзейнічае ва ўмоўных абставінах. З перакладных агіяграфічных твораў бытавалі жыціі Васіля Новага, Ірыны, Антонія Вялікага, «Жыціе Аляксея – чалавека Божага».

Шырока распаўсюджаным жанрам былі *гістарычныя хронікі* – перакладныя грэчаска-візантыйскія творы, у якіх выкладаецца гісторыя народаў Еўропы і Блізкага Усходу, распавядаецца пра дынастыі візантыйскіх імператараў. У хроніках прыводзіцца шмат легендарных паданняў. Добра вядомымі на Русі былі пераклады з грэчаскай мовы на царкоўнаславянскую хронікі Іаана Малалы (VI ст.), Георгія Амартала (IX ст.). Так, дзякуючы хроніцы Малалы старажытнарускі чытач пазнаёміўся з антычнымі міфамі пра Зеўса, Геракла, Дзядала і Ікара, героямі Траянскай вайны. Папулярнасцю карысталася «Гісторыя Іудзейскай вайны» Іосіфа Флавія пра паўстанне Іудзеі супраць Рыма, удзельнікам якога быў аўтар, разбурэнне рымлянамі Іерусаліма (напісана каля 75 – 79 гг. н. э.).

Перакладаліся таксама творы *белетрысты*кі, найбольш вядомыя з якіх «Троя» і «Александрыя». Папулярнасцю карысталіся аповесці пра Акіра Пра-

мудрага, раман «Дзяўгеніевы дзеі», героі якіх – выдуманыя персанажы, а не рэальныя асобы.

Акрамя таго, перакладаліся зборнікі прыродазнаўчага характару: «Хрысціянская тапаграфія», «Фізіялог», «Шасціднёвік». Вельмі папулярным быў зборнік афарызмаў, прымавак, кароткіх апавяданняў «Пчала».

*Арыгінальная літаратура*

*Агіяграфія.* Хрысціянства на Русі ўсталёўвалася вельмі марудна, таму ўзнікла неабходнасць кананізаваць уласных святых, абавязковая ўмова кананізацыі – наяўнасць жыція.

Шмат твораў прысвечана князям Барысу і Глебу: «Сказанне пра Барыса і Глеба» (канец XI – пач. XII ст.), «Чытанне пра жыццё і пагубленне Барыса і Глеба» манаха Нестара (80-я гг. XI ст.). Напісанае невядомым аўтарам на аснове летапіснай аповесці «Сказанне...» паклала пачатак і стала ўзорам княскага жыція. У жыціі не захоўваецца агіяграфічны канон, у цэнтры аўтарскай увагі не ўсё жыццё святых, а толькі адзін эпізод забойства. У творы праводзіцца важная палітычная ідэя радавога старшынства, што павінна было ўмацоўваць феадальны парадак.

Своеасаблівасці «Сказання» наступныя: 1) аўтар перадае толькі адзін эпізод, а не ўсё жыццё; 2) няма пасмяротных цудаў; 3) галоўная ідэя не рэлігійная, а палітычная – падпарадкаванне старэйшаму ў родзе.

Ужо ў XI ст. з’яўляецца шэраг твораў пра славянскіх хрысціянскіх пакутнікаў (найбольш вядомае з іх – «Жыціе Феадосія Пячорскага», манаха Кіева-Пячорскага манастыра, напісанае Нестарам).

Больш як у 100 спісах захавалася напісанае на царкоўнаславянскай мове «Жыціе Еўфрасінні Полацкай». Гэты твор – першы выпадак, калі гераіня не пакутніца, а дзейсная асоба, здольны арганізатар. У «Жыціі…» спалучаюцца адзнакі жанраў жыція і хаджэння. Мова твора вобразная, экспрэсіўная, надаецца вялікая ўвага рытмічнгай арганізацыі, выразная тэндэнцыя да арнаменталізму, упрыгожання тэксту.

*Аратарская проза.* Радзімай красамоўства лічыцца антычная Грэцыя, аднак на самой справе яно зарадзілася на Сіцыліі ў V ст. Распаўсюджанне на Русі аратарскай прозы (павучанняў) звязана з прыняццем хрысціянства, з прапагандай новай рэлігіі. Помнікі свецкага і царкоўнага красамоўства падзяляюцца на 2 віды: дыдактычныя (павучанні Лукі Жыдзяты, Феадосія Пячорскага) і ўрачыстыя творы. Выдатным узорам урачыстага красамоўства стала *«Слова пра закон і ласку Божую»*, напісанае паміж 1037 – 1050 гг. святаром Іларыёнам. «Слова» прасякнута патрыятычным пафасам. Асноўная яго ідэя – услаўленне Русі як раўнапраўнай сярод іншых дзяржавы, сцвярджэнне незалежнасці рускай царквы ад Візантыі. Іларыён праводзіць ідэю роўнасці ўсіх хрысціянскіх народаў.

Пісьменнікам-прапаведнікам XII ст. быў ***Клімент Смаляціч,*** звесткі пра якога захаваліся ў Іпацьеўскім летапісе, дзе вельмі высока ацэньваецца яго асоба. Захаваўся адзін твор Смаляціча «Пасланне да Фамы прасвітара», у прыпісцы да якога пазначана, што аўтар напісаў 15 твораў, але нам яны невядомыя. «Пасланне…» узнікла як адказ на гнеўны ліст прасвітара, у якім Фама абвінавачваў Клімента ў славалюбстве, у тым, што ён у сваіх творах больш абапіраўся на вучэнне паганцаў Арыстоцеля і Платона, чым на хрысціянскія аўтарытэты. Клімент не адмаўляе сваёй прыхільнасці да грэчаскіх філосафаў, сцвярджае, што Біблію можна зразумець, абапіраючыся на філасофскія пастулаты. Фама лічыць, што Святое Пісанне трэба ўспрымаць праз веру, а не асэнсоўваць. Клімент перакананы, што яго трэба ўспрымаць як духоўна, пачуццёва (гэта першая прыступка), так і праз розум. Такая вера не сляпая, а абгрунтаваная. Пазнанне, на думку Смаляціча, − неабходны працэс, які павінен узвышаць чалавека, у розуме чалавечая душа знаходзіць сваё зямное быццё.

***Творчасць Кірылы Тураўскага***

Кірыла Тураўскі − пісьменнік, царкоўны дзеяч, багаслоў, заслужыў славу «другога Залатавуста, што ярчэй за ўсіх праззяў на Русі».

На думку даследчыкаў (І. Яроміна, В. Чамярыцкага, інш.), да літаратурнай спадчыны Кірылы Тураўскага належаць: 8 слоў-казанняў (Слова на вербніцу, Слова на нядзелю Фаміну); 2 прытчы пра душу і цела, або пра сляпога і кульгавага (кароткая і поўная рэдакцыі); некалькі аповесцяў павучальнага зместу (Сказанне пра чын чарнарызца, Аповесць пра беларызца і манаха); пасланні да Васіля – ігумена Пячорскага, князя Андрэя Багалюбскага; 2 пакаяльныя каноны на спачын княгіні Вольгі; каля 30 спавядальных малітваў.

*«Прытча пра чалавечую душу і цела».* Кірыла Тураўскі – майстар алегорыі, на падставе якой і будуецца прытча. У творы арганічна спалучаюцца элементы прытчы, візантыйскага красамоўства, публіцыстыкі. Майстэрства Тураўскага – ва ўменні звязваць некалькі планаў: канкрэтны і сімвалічны, яго творы заўсёды маюць падтэкст. Еворчасць КТ для маладой хрысціянскай літаратуры была адкрыццём красы і мастацкай сілы слова, магчымасць узнікнення такіх дасканалых твораў сведчыць пра існаванне ў той час школьнай адукацыі.

## Тэма 2. Старабеларуская літаратура (лекцыя 2)

***Літаратура позняга Сярэднявечча***

Пачынаючы з XIV ст., можна гаварыць пра ўласнабеларускую літаратуру, станаўленне якой было досыць марудным. Літаратура XIV – XV стст. была яшчэ цесна звязана са старажытнарускімі традыцыямі. Напачатку існавалі творы, напісаныя ў папярэдні перыяд. Калі ўзнікала новае, то ў межах традыцыйных форм і жанраў. Найбольшае распаўсюджанне мела літаратура царкоўна-рэлігійнага характару, па-ранейшаму актыўна перапісваліся Евангелле і Псалтыр, творы «айцоў царквы», хаджэнні, апокрыфы і інш. Аднак старажытнаруская літаратура цалкам задаволіць духоўныя запатрабаванні не магла. Неадпаведнасць яе часу звязвалася таксама з мовай: старажытнаруская і асабліва стараславянская мовы станавіліся цяжкімі для разумення, адбываўся разрыў паміж вуснай і пісьмовай мовай.

У XIV ст. пры князю Альгердзе (1345 – 1377) т. зв. руская мова ў яе мясцовым варыянце стала дзяржаўнай і была афіцыйнай мовай зносін амаль тры стагоддзі. Гэта садзейнічала яе пранікненню ў царкоўна-рэлігійную літаратуру і звужэнню сферы ўжывання старaславянскай мовы.

Станаўленне ўласна беларускай літаратуры адбывалася ў новых гістарычных умовах і непасрэдна звязана з фарміраваннем беларускай народнасці. Беларускія землі ў гэты перыяд уваходзілі ў склад Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

Размах на тэрыторыі Беларусі набыла кніжная справа. Захаваліся па-майстэрску выкананыя, з густам упрыгожаныя пергаментныя Евангеллі – Полацкае, Аршанскае, Друцкае, Лаўрышаўскае, Мсціжскае − выдатныя помнікі беларускай кніжнай культуры XIII − XIV стст.

У XV ст. з’яўляюцца пераклады на беларускую мову рэлігійных аповесцей: «Жыціе Аляксея, чалавека Божага», «Пакуты Хрыстовы», «Аповесць аб трох каралях-волхвах», а ў XVI ст. і кніг Свяшчэннага Пісання, свецкіх твораў «Троя», «Аповесць пра Трышчана».

Арыгінальная беларуская літаратура XIV – XV стст. адносна небагатая, прадстаўлена традыцыйнымі жанрамі. Асабліва плённа развіваецца жанр летапісу («Летапіс вялікіх князёў літоўскіх», «Беларуска-літоўскі летапіс 1446 года»). Некаторыя традыцыйныя жанры ў гэты час прыходзяць у заняпад, напрыклад, жыціі. У XIV – XV стст. не было створана ніводнага арыгінальнага жыція.

З усіх жанраў царкоўна-рэлігійнай літаратуры на беларускіх землях найбольш плённа развіваюцца хаджэнні. Гэтыя творы непасрэдна не звязаны з кананічнай, богаслужэбнай літаратурай, яны мелі вялікае пазнавальнае значэнне. Жанр узнік у выніку паломніцтва вернікаў у Святую зямлю. Палесціны. Адно з першых падарожжаў у Палесціну здзейсніла Еўфрасіння Полацкая, яе паломніцтва занатавана ў прысвечаным ёй жыціі.

У XIV – XV стст. падарожжы з Беларусі на Бліжні Усход сталі больш частымі – узнік шэраг твораў. Самым цікавым у мастацкіх адносінах з’яўляецца

*«Хаджэнне ў Царград і Іерусалім»,* напісанае ў канцы XIV ст. смаленскім дыяканам Ігнаціем Смалянінам. Гэты твор мае важнае літаратурнае і навукова-пазнавальнае значэнне, уяўляе сабою пераход ад уласна хаджэнняў у Святую зямлю да апісання падарожжаў за мяжу наогул.

*Другі паўднёваславянскі ўплыў.* У XIV – XV стст. краіны Балканскага паўвострава былі захоплены туркамі-асманамі, ярмо якіх працягвалася амаль чатыры стагоддзі. Многія выдатныя дзеячы балгарскай і сербскай культуры вымушаны былі эмігрыраваць у іншыя славянскія краіны, у тым ліку і ВКЛ. Так, на беларуска-літоўскіх землях жыў балгарскі царкоўны дзеяч Кіпрыян (пасля – мітрапаліт Кіеўскі і ўсяе Русі), яго пляменнік Грыгорый Цамблак (першы мітрапаліт ВКЛ).

***Кіпрыян*** *(каля 1330 – 1406*) у 1373 г. канстанцінопальскім патрыярхам быў накіраваны ў ВКЛ з місіяй прымірыць і аб’яднаць духавенства Кіева-Літоўскай мітраполіі і мітрапалітаў Масквы. Ён перакладаў і распаўсюджваў богаслужэбныя кнігі, да нашага часу дайшлі аўтографы некалькіх яго прамоў, якія сведчаць пра высокую філалагічную і багаслоўскую культуру аўтара.

Другі паўднёваславянскі ўплыў на культуру беларусаў, украінцаў і рускіх выявіўся ў перанясенні на нашую глебу *стылю «пляцення славес».* Гэты стыль заключаецца ў стварэнні своеасаблівага славеснага арнамента, які ўяўляе сабою спалучэнне сугучных і аднакарэнных слоў, сінанімікі і рытмікі мовы. Яму ўласцівы складаны сінтаксіс, нагнятанне аднародных параўнанняў і эпітэтаў. Асноўным прынцыпам арганізацыі тэксту з’яўляецца паўтор, на яго аснове ўзнікае скразная тэма і лейтматыў. Усе прыёмы ў творах, напісаных у стылі «пляцення славес», разлічаны на ўзмацненне сэнсу, стварэнне звышсэнсу, які надае новыя адценні асноўнай думцы. Адзнакі гэтага стылю заўважаюцца ў новых перакладах Евангелля, новых рэдакцыях «Апостала», «Псалтыра», «Служэбных міней», «Шасціднёвіка», у творах аратарскай прозы.

***Грыгорый Цамблак*** *(1364 – 1419)* − найбольш вядомым прадстаўнік красамоўства ў гэты перыяд. Будучы рэлігійны дзеяч, пісьменнік, першы мітрапаліт ВКЛ нарадзіўся ў балгарскім горадзе Вяліка-Тырнава. Яго творы на

царкоўнаславянскай мове адносяць да літаратур балгарскай, сербскай, малдаўскай, румынскай, старажытнарускай і старабеларускай. Прозвішча яго таксама пішуць па-рознаму: Цамвлак, Цымівлак, Сімівлак, але часцей – Цамблак, пазначаюць і толькі манастырскае імя Грыгорый.

У час турэцкай экспансіі на Балканах Цамблак вымушаны быў пакінуць радзіму (1394). Упершыню беларускія землі наведаў у 1406 г., калі ехаў праз іх у Маскву да свайго дзядзькі, мітрапаліта ўсяе Русі Кіпрыяна. З 1409 ён пасяліўся ў Кіеве. У 1415 г. сабор заходнерускіх епіскапаў, нягледзячы на анафемы Канстанцінопаля і рускага мітрапаліта Фоція, зацвердзіў Цамблака мітрапалітам кіеўскім і літоўскім.

Даследчыкі лічаць Цамблака аўтарам больш як 40 твораў, зберaглося і вядома 26 (у т. з. літоўскі перыяд ім напісана каля 10 твораў). Гэта пераважна дыдактычна-панегірычныя, урачыстыя словы на розныя святы і асобныя выпадкі рэлігійнага жыцця. Ён займаўся таксама перапісваннем богаслужэбных кніг, на Беларусі працягваў і развіваў традыцыі ўрачыстага красамоўства, закладзеныя Кірылам Тураўскім, уздымаў пытанні шырокага грамадскага значэння. Яго творы (пропаведзі, пахвальныя і палемічныя словы, павучанні, жыціі), напісаныя вобразнай мовай, насычанай метафарамі, параўнаннямі, рознымі складанымі фігурамі, карысталіся вялікай павагай ва ўсім славянскім свеце. Але з-за таго, што Цамблак занадта наследаваў візантыйскія ўзоры і пісаў у стылі «пляцення славес», творы часам станавіліся цяжка зразумелымі. Тым не менш пропаведзі і словы Цамблака станоўча паўплывалі на развіццё тагачаснай і больш позняй беларускай аратарскай прозы, спрыялі ўмацаванню культурных сувязяў усходніх і паўднёвых славян, пашырэнню паўднёваславянскіх уплываў на літаратуру Беларусі. Яго спадчына адыграла важную ролю ў гісторыі беларускай літаратуры, асабліва ў перыяд жорсткай палемічнай барацьбы XVI – XVII стст. за захаванне нацыянальных традыцый і культуры.

## Тэма 3. Літаратура эпохі Адраджэння

У культурна-гістарычным плане XVI ст. на Беларусі было эпохай Адраджэння (ад франц. Renaissance – адраджэнне). Сам тэрмін «адраджэнне» быў уведзены італьянскім мастаком, гісторыкам мастацтва Д. Вазары. Гэты час стаў залатым векам беларускай літаратуры і засведчыў сябе дзейнасцю Ф. Скарыны, Я. Вісліцкага, М. Гусоўскага, Л. Сапегі, А. Рымшы і інш.

Акрамя сацыяльна-эканамічных прычын (наступленне эпохі сталага феадалізму), існаваў шэраг гістарычна-грамадскіх прычын узнікнення і развіцця беларускага Адраджэння:

- паўднёваславянскі ўплыў з яго паваротам да ўнутранага жыцця чалавека;
- шырокае развіццё ў XIV − XV стст. рэлігійна-царкоўнага асветніцтва з увагай да аналітычна-разумовага пачатку;
- абуджэнне пачуцця асобы праз чытанне летапісаў, у якіх увасаблялася гістарычнае мінулае народа (нездарма першай паэмай Адраджэння стала паэма пра Грунвальд «Пруская вайна» Я. Вісліцкага, а цэнтральным героем «Песні пра зубра» М. Гусоўскага – князь Вітаўт);
- уплыў польскага і чэшскага Адраджэння, а праз іх – кантакты з заходнееўрапейскім Рэнесансам;
- светапогляд гэтай эпохі вызначалі ідэі рэнесансавага гуманізму: прызнанне чалавека свабоднай і моцнай істотай, яго магчымасці самому вырашаць уласны лёс, гарманічна развівацца і самаўдасканальвацца, сцвярджэнне прыярытэту агульначалавечых духоўных каштоўнасцей.

Усходнеславянскае, у тым ліку і беларускае, Адраджэнне гістарычна з’ява больш позняя ў параўнанні з еўрапейскім, аднак тыпалагічна блізкая, мае тыя ж характарыстыкі:

- зварот да ідэалаў антычнасці;

- антрапацэнтрычны характар, які супрацьстаяў сярэдневяковаму тэацэнтрызму (грэч. тэас – бог). У цэнтры ўвагі Адраджэння – чалавек зямны з усімі яго радасцямі, разам з тым боскі пачатак не адмаўляўся;
- прынцып уседазволу, пафас радасці жыцця, абумоўленыя разбурэннем догмаў, цікавасцю да ўсяго на свеце (напрыклад, у палітыцы ўседазвол спарадзіў макіявелізм, у грамадскім жыцці – шляхецкія вольнасці);
- культ ведаў, развіццё навук, а таксама ўздым мастацтва (у Еўропе – дзейнасць Мікеланджала, Леанарда да Вінчы, Рафаэля, Каперніка, час геаграфічных адкрыццяў Калумба і Магелана);
- своеасаблівы светапоглядны дуалізм: уздымаючы на п’едэстал чалавека-творцу, адраджэнец і на Бога глядзеў як на творцу, дэміурга-мастака;
- увага да народных моў, якія ігнараваліся Сярэднявеччам, дзе лаціна і царкоўнаславянская былі культавымі і мовамі навукі.

Побач з гэтымі агульнымі рысамі беларускае Адраджэнне мае свае *спецыфічныя асаблівасці.* 1) Найперш яно характарызуецца сінтэзам усходняй, грэка-візантыйскай, і заходняй, рымска-каталіцкай, культурных плыняў. 2) На Беларусі Адраджэнне адбывалася са спазненнем у параўнанні з класічным, італьянскім, і развівалася паралельна з Рэфармацыяй, а пазней існавала ва ўмовах развіцця Контррэфармацыі і барока.

*Рэфармацыя* (ад лац. reformatio – змяненне) – рэлігійна-культурны рух у Еўропе, які набыў форму барацьбы з каталіцкай царквой. Гэты рух узнік у Заходняй Еўропе і звязаны з імёнамі Марціна Лютэра, Жана Кальвіна. Рэфармацыя была самастойнай, паралельнай Рэнесансу з’явай, аднак таксама вынікала з асветніцкіх традыцый Сярэднявечча, з яго ерэтычных плыняў. Выдатнымі фігурамі беларускай Рэфармацыі сталі С. Будны, В. Цяпінскі, А. Волан.

Сярод прычын узнікнення на Беларусі ў XVI ст. Рэфармацыі былі наступныя: прысваенне касцёламі зямельнай уласнасці, злоўжыванні грашовымі сродкамі, парушэнне нормаў абету, хрысцянскіх запаветаў і інш.

Таму рэфармацыйны рух выступаў за чысціню веры, яго асноўнгым лозунгам быў «За Бога, але без папы рымскага».

Храналагічна беларускае Адраджэнне абмяжоўваецца XVI ст., у XVII ст. яму на змену прыходзіць барока. Рэфармацыйны рух працягваў развівацца і ў XVII ст., ва ўмовах Контррэфармацыі.

Як адзначалася, для беларускай літаратуры XVI ст. стала «залатым векам». Важнай асаблівасцю новай літаратуры было арганічнае спалучэнне ў ёй традыцый старабеларускага прыгожага пісьменства з новымі ідэямі і мастацкімі прынцыпамі. У гэты час літаратура перастае быць ананімнай, зараджаюцца індывідуальныя пісьменніцкія стылі, узнікае лірыка (яе вытокі – у панегірычнай паэзіі). Пачынальнікам беларускай лірыкі свецкага і рэлігійна-духоўнага зместу стаў Ф. Скарына. Плённае развіццё атрымаў эпас і публіцыстыка: з’явіўся шэраг буйных паэм, найбольш значныя з якіх «Пруская вайна» Я. Вісліцкага, «Песня пра зубра» М. Гусоўскага, «Радзівіліяда…» Я. Радвана; публіцыстычнае майстэрства выявілі ў сваіх прадмовах Ф. Скарына, С. Будны, В. Цяпінскі і інш. Яшчэ адна адметнасць беларускай літаратуры гэтага часу ў тым, што побач з творчасцю на народнай мове адбываецца і росквіт новалацінскага мастацтва.

***Ян Вісліцкі*** *(≈ 1480 – 90 – 1516 або 1520)* – аўтар аднаго з самых знакамітых твораў на лацінскай мове – паэмы «Пруская вайна» (1516). Акрамя таго, вядомыя яго вершы «Ода да караля Жыгімонта», «Элегія да Багародзіцы дзевы Марыі», «Эпіграма на зайздросніка».

Паэма «Пруская вайна» – твор гераічнага зместу, першы па часе напісання ў рыцарскім эпасе славян. Тут упершыню вылучаны беларусы, а таксама акрэслены межы ВКЛ як агульнай дзяржавы продкаў сучасных беларусаў, украінцаў і літоўцаў. Для еўрапейскага чытача паэма адкрывала невядомы край, яго прыроду і насельнікаў. Напісаны гекзаметрам твор прысвечаны важнай падзеі ў жыцці ВКЛ і Польскай Кароны – перамозе над крыжакамі ў Грунвальдскай бітве (15 ліпеня 1410 г.) войскаў Ягайлы і Вітаўта.

*Кампазіцыйная будова паэмы.* Твор мае некалькі структурных частак:

- Верш-заахвочванне. Вісліцкі звяртаецца да свайго настаўніка прафесара Паўла з Кросны, удзельніка Таварыства паэтаў, падтрымаць твор, напісаць да яго вершаваны ўступ.
- Празаічны зварот да Паўла Кроснінскага, у якім Я. Вісліцкі сцісла расказвае пра творчую гісторыю паэмы, успамінае некаторыя факты ўласнай біяграфіі, піша, што ён «народжаны амаль у цэнтры варварства», «у самай глыбі няпольскіх зямель» – значыць на Беларусі, – называе сябе выхаванцам Польшчы.
- Аргументы да трох кніг – сціслы пераказ зместу кожнай часткі.
- Тры кнігі, прысвечаныя каралю Жыгімонту І Старому.

*Асаблівасці Рэфармацыі на беларускіх землях:* вострапалітычны змест, недастатковая выяўленасць нацыянальнай формы, звужанасць сацыяльнай базы. Прадстаўнікі рэфарматарскай плыні на Беларусі − С. Будны, В. Цяпінскі, А. Волан.

## Тэма 4. Літаратура XVII−XVIII стагоддзяў

Літаратура пераходнага перыяду ўключае ў сябе 2 этапы: літаратура *позняга барока* (другая пал. XVII ст. – першая трэць XVIII ст.) і *Асветніцтва* (з 50 – 60-х гг. XVIII ст.). Ранняе барока развіваецца ў межах Контррэфармацыі (першая пал. XVII ст.).

*Літаратура барока*

Беларускае барока (ад італьянскага barocco – «вычварны», «мудрагелісты»), як і еўрапейскае, нараджалася ў эпоху Контррэфармацыі і было вынікам росту нацыянальнай свядомасці народа. Літаратуры барока ўласціва:

- эмацыйная напружанасць, драматызм, апеляцыя не да розуму (як у рэнесансавай літаратуры), а да пачуцця;
- спалучэнне сярэднявечных і рэнесансавых традыцый з фальклорнымі;
- кантраснасць, «сумяшчэнне несумяшчальнага», сінтэз высокага і нізкага;

- стварэнне навакольнага свету ў «знаках», «эмблемах», а не «капіраванне» яго ў вобразах;
- раздвоенасць, няпэўнасць героя, які ўвесь час вагаецца паміж аптымізмам і песімізмам, памкненнямі духу і патрэбамі цела, радасцю жыцця і перспектывай непазбежнай смерці;
- дынамічнасць кампазіцыі, пышная дэкаратыўнасць, ускладненасць формы, метафарычнасць мовы, выкліканыя жаданнем здзівіць, уразіць.

У беларускім барока вылучаюцца розныя стылявыя тэндэнцыі – «шцілі». *«Высокае»*, элітарнае, барока звязана са старабеларускай традыцыяй, характарызуецца рытарычнай узнёсласцю, фармальнай ускладненасцю, сімвалічнасцю (у паэзіі – С. Полацкі, А. Белабоцкі). *«Сярэдняе»* барока, запатрабаванае прадстаўнікамі шляхты, актыўна выкарыстоўвала заходнееўрапейскія традыцыі, не губляючы сувязь з народнымі (Д. Рудніцкі). *«Нізкае»,* народнае, барока прадстаўлена калядкамі, інтэрмедыяй, батлейкай, інтымна-песеннай лірыкай. Нягледзячы на барацьбу паміж стылямі, яны часта плённа ўзаемадзейнічалі.

*Паэзія.* Асаблівай стылявой разнастайнасцю вызначалася беларуская барочная лірыка. У эпоху ранняга барока (пач. XVII ст.) развіваецца любоўная, сатырычная і грамадска-філасофская паэзія. Прамежкавае становішча паміж сатырычнай і грамадска-філасофскай барочнай лірыкай і бурлескна-сатырычнай паэзіяй эпохі Асветніцтва займаюць *звярыныя гратэскі* Дамініка Рудніцкага.

***Андрэй (Ян) Белабоцкі*** – прадстаўнік «высокага штылю» ў паэзіі барока. Дакладных звестак пра гады яго жыцця не захавалася: хутчэй за ўсё, нарадзіўся ў сярэдзіне XVII ст. у Слуцку. Галоўны літаратурны твор – *«Пентатэугум, або пяць кніг кароткіх»*, напісаны на царкоўнаславянскай мове. Галоўная яго ідэя – асуджэнне марнасці зямнога жыцця і выказванне страху перад смерцю. Для «Пентатэугума», як і іншых твораў барока, характэрна падкрэсленая эмацыйнасць, кантраснае супрацьпастаўленне зямнога і нябеснага, жыцця і смерці, дабра і зла – шырока выкарыстоўваецца антытэза. Надзвычай вобразна

апісваецца карціна Нябеснага Суда, аднолькава страшныя пакуты цароў, князёў, баяр і рабоў. У пэўным сэнсе гэты твор з'яўляецца працягам *інфернальнай* (ад лац. пекла) тэмы ў свецкай паэзіі, пачатак якой паклаў Дантэ.

***Сімяон Полацкі** (1629 – 1680)*

Развіццё грамадскіх адносін, перакрыжаванні культурных традыцый Усходняй і Заходняй Еўропы падрыхтавалі на Беларусі глебу, якая спрыяла з'яўленню прафесійных пісьменнікаў. Першы сярод іх – Самуіл Емельянавіч Пятроўскі-Сітніяновіч, а празванне Полацкі ён атрымаў у Маскве па месцы свайго паходжання. Ён стаяў ля вытокаў беларускага барока, пісаў на беларускай, царкоўнаславянскай, лацінскай і польскай мовах, рабіў пераклады з латыні і польскай мовы, літаратурныя апрацоўкі папулярных свецкіх і царкоўных твораў. Яго пісьменніцкая спадчына стала выдатным дасягненнем старажытнай культуры ўсіх славянскіх народаў.

У *беларускі перыяд* творчасці (ранняе барока) найбольш плённым быў час знаходжання Сімяона ў полацкім Богаяўленскім манастыры. Тут ім напісаны элегіі «Стихи краесогласные...», «Прилог к преподобной матери Ефросинии», інш. Гэтыя, прасякнутыя патрыятычнымі матывамі творы сведчылі, што ў цэнтры ўвагі С. Полацкага – радзіма, яе мінулае, сучаснасць, будучыня. Аднак у 1656 г. ён захоплена вітае прыезд маскоўскага цара Аляксея Міхайлавіча ў Полацк, глыбока не асэнсоўваючы мэт яго ваенных паходаў на Захад. З гэтай нагоды паэт стварае «Метры» (т.зв. «Полацкія метры»), напісаныя ў новым, распрацаваным ім публіцыстычным жанры *дэкламацыі*.

*Маскоўскі перыяд* творчасці С. Полацкага быў вельмі плённым. Тут ён пісаў п'есы, багаслоўскія працы, вершы, займаўся перакладчыцкай дзейнасцю – выдаў паэтычны пераклад псалмоў Бібліі – *«Псалтырь рифмотворная».* Сапраўднай энцыклапедыяй XVII ст. стаў зборнік паэзіі С. Полацкага *«Вертоград многоцветный».* Тут у вершаванай форме пададзены самыя розныя звесткі па гісторыі, геаграфіі, антычнай міфалогіі, тэалогіі і іншых навуках. Патрыятычныя вершы ўтварылі яшчэ адзін даволі аб'ёмны зборнік –

*«Рифмологион»,* што, як і папярэдні, пісьменнік падрыхтаваў да друку, але выдаць не паспеў. Памёр у Маскве ў 50-гадовым узросце.

С. Полацкі ўзбагаціў літаратуру новымі жанрамі і тэмамі, чым садзейнічаў яе далейшаму развіццю:

***1.*** *Філасофска-пазнавальныя вершы* («Карціна чалавечага жыцця).

***2.*** *Дыдактычна-філасофскія алегорыі* («Арон сапраўдны», «Камень», «Хлеб», «Пагарда да славы» і інш.).

***3.*** *Грамадска-палітычная лірыка* («Праўда бессмяротнасці», «Вобраз», «Любоў да падданых»).

***4.*** *Сатырычныя вершы*. «Віншаванне ... Кржыжановскому», «Манах», «Паклёпнік», «П'янства» і інш.).

***5.*** *Сатырычныя паэмы на польскай мове* («Роспач караля шведскага», «Шведскі кароль шукае сваіх афіцэраў).

***6.*** *Графічныя вершы* («Орёл российский», «Благоприятствование цару...», «Царствуй многа лета»).

*7.* *Астралагічная паэзія* (верш-гараскоп).

***8.*** *П'есы павучальнага зместу* («Трагедия о Навуходоносоре царе..», «Комедия притчи о блудном сыне»).

***9.*** *Багаслоўскія трактаты* (кніга «Вянец веры кафаліцкія»).

***10.*** *Царкоўныя «словы» і казанні* (рукапісныя зборнікі «Абед душэўны», «Вячэра душэўная»).

Такім чынам, творчасць С. Полацкага стала своеасаблівай энцыклапедый новай барочнай культуры, якую ён стварыў на Беларусі і ў Расіі. Яшчэ пры жыцці паэт займеў сусветную славу, а ў 1980 г. яго імя было ўнесена міжнароднай арганізацыяй ЮНЕСКА ў каляндар міжнародных дат дзеячаў культуры.

*Гістарычная проза.* Да барочнай гістарычнай прозы адносіцца напісаная па-польску *«Магілёўская хроніка»*, якая ахоплівае перыяд з 1526 па 1746 гг., пазней запісы даведзены да 1856 г. Крыніцамі твора паслужылі польскія хронікі, гістарычныя запісы, архіўныя дакументы, уласныя назіранні аўтараў,

успаміны відавочцаў апісаных падзей. Хроніка ўяўляе сабой летапісныя пагадовыя запісы, аднак з канца XVII ст. аповед нагадвае дзённікавыя запісы і ўспрымаецца як своеасаблівы дзённік горада. Пад уздзеяннем барокавай паэтыкі (метафарычнасці, узнёсласці) летапіснае паведамленне ператвараецца ў мастацкі твор – гістарычнае апавяданне.

*Аўтабіяграфічная проза.* У пераходны перыяд працягваюць развівацца традыцыі мемуарыстыкі. Важная асаблівасць такой прозы – ператварэнне ўспамінаў-мемуараў у жанр біяграфічных прыгод-авантур. Яркім прыкладам сталі *«Авантуры майго жыцця»* (на польскай мове) наваградскай лекаркі Саламеі Рэгіны Пільштыновай-Русецкай (1718 – пасля 1760). Нататкі гэтай жанчыны-авантурысткі ўспрымаюцца як займальны і цікавы літаратурны твор. Аўтарка ўсведамляла мастацкія вартасці сваёй кнігі і збіралася надрукаваць яе, для чаго падрыхтавала заключную частку «Песня мае кампазіцыі», вытрыманую ў барочных традыцыях.

*Сатырычная проза* перыяду ранняга барока прадстаўлена ананімным творам *«Прамова Мялешкі»* і *«Лістом да Абуховіча»*, напісаным мазырскім (наваградскім, слуцкім – ?) шляхцічам Цыпрыянам Камунякам. У абодвух творах упершыню выкарыстоўваецца мастацкая фантазія.

*Драматургія барока.* Менавіта ў эпоху барока ўзніклі першыя беларускія п’есы. Пераважна гэта былі *інтэрмедыі* – кароткія камічныя п’есы, што разыгрываліся паміж актамі асноўнай лацінамоўнай ці польскамоўнай драмы (сюжэты для драм браліся ў асноўным са Святога Пісання, антычных і гістарычных твораў). На сёння вядома больш за 20 беларускіх інтэрмедый, якія ставіліся ў езуіцкіх школьных тэатрах у Полацку, Нясвіжы, Пінску, Гародні, Мінску, Бабруйску, Слуцку і іншых гарадах Беларусі («Чорт Асмалейка», «Іван і царкоўны стораж» і інш.).

У часы барока папулярным у Беларусі стаў і лялечны тэатр − батлейка. З’яўленне яго звязана са святамі Каляд і Хрышчэння, калі шкаляры і хрысціянскія семінарысты (а пазней – сяляне і рамеснікі) хадзілі з батлейкай па вёсках і мястэчках. У рэпертуары батлеек былі інтэрмедыі і *народныя драмы*,

сярод якіх вялікай папулярнасцю карысталіся творы «Цар Ірад» і «Цар Максіміліян». Беларуская народная драма характарызуецца сінтэзам элементаў трагедыі і камедыі-фарса, натуралістычных дэталяў і ўмоўнасцяў. Яна стала адной з самых цікавых з'яў беларускага барока.

*Літаратура Асветніцтва*

Другая палова XVIII ст. у гісторыі літаратуры і мастацтва Беларусі характарызуецца як перыяд Асветніцтва. (Прадстаўнікі Асветніцтва ў Еўропе: Вальтэр, Д. Дзідро, Ж. Ж. Русо, П. Бамаршэ, І. В. Гётэ, Ф. Шылер, Дж. Свіфт, Д. Дэфо.)

Замест барочнай няўпэўненасці, алегарычнасці, ускладненасці Асветніцтва прапануе рацыяналізм, дакладнасць. Рэчаіснасць не перасатвараецца, як раней, у «сімвалах» і «эмблемах», а ацэньваецца па законах розуму. Прыярытэт навукі, асветы становіцца вызначальнай ідэяй эпохі. Асветнікі ставілі перад сабой задачу фарміраваць чалавека як грамадзяніна і патрыёта, выхоўваць  разумовыя і маральныя якасці. Адметнасць асветніцкай літаратуры на Беларусі – змяншэнне колькасці твораў на беларускай мове, асноўная мова – польская (Ю. Нямцэвіч, Ф. Князьнін, Ф. Карпінскі). Асноўныя літаратурныя напрамкі эпохі: класіцызм з яго апеляцыяй да розуму і сентыменталізм, скіраваны да пачуцця.

*Класіцызм.* Літаратура Асветніцтва развівалася ў Беларусі пераважна ў рэчышчы класіцызму. Класіцызм – мастацкі метад, які вызначаецца кананізацыяй антычнай класікі як эстэтычнага ўзору. Адпаведнасць узору як эстэтычную норму замацоўвае жанравая і стылявая іерархія: да «высокіх» жанраў належаць трагедыя, эпапея, ода; да «нізкіх» – камедыя, сатыра, байка. Унутры кожнага жанру таксама дзейнічалі свае законы: напрыклад, у творах драматургіі павінна захоўвацца адзінства часу, месца і дзеяння.

*Паэзія.* У гэты час царкоўна-рэлігійная і панегірычная вершатворчасць цалкам перайшла на польскую мову, інтымная лірыка, якая вельмі плённа развівалася ў часы барока, амаль знікае з рукапісных зборнікаў. Асноўнае месца займалі:

- *Бурлескна-сатырычныя творы* (ад фр. – жарт) – пародыі на біблейскія сюжэты, звязаныя са святамі велікоднага і каляднага цыклаў (верш «Уваскрасенне Хрыстова»).
- *Патрыятычныя творы* (ананімны верш «Песня беларускіх жаўнераў», прысвечаны паўстанню Т. Касцюшкі).
- Зараджаецца *віншавальная паэзія* (верш Яна Храптовіча «Всем многі век в новай хаці»).

*Драматургія.* Найбольш плённа ў перыяд Асветніцтва на Беларусі развіваецца тэатр, дзе вылучаюцца 3 кірункі: прыдворны, аматарскі і школьны тэатр.

Станаўленне *прыдворнай* драматургіі было звязана з імем ***Францішкі Уршулі Радзівіл*** *(1705 – 1753),* жонкі Мікалая Радзівіла Рыбанькі, якая паходзіла з княжацкага роду Вішнявецкіх. Методыка мастацкай творчасці У. Радзівіл засноўвалася на адаптацыі замежных літаратурных сюжэтаў да беларускай глебы (перарабіла часткі «Дэкамерона» Бакача, 3 п’есы Мальера).

У *школьным тэатры* працягваюць развівацца інтэрмедыі, найбольш распаўсюджаныя ў гэты час у праваслаўных і ўніяцкіх школах, дзе набываюць востра сацыяльнае гучанне (*«Селянін у касцёле»*, *«Селянін на споведзі»*). У гэты час інтэрмедыя набывае жанравую адметнасць, зместавую самастойнасць, незалежнасць ад драмы, паміж сцэнамі якой выконвалася, з’яўляецца сюжэт у сучасным сэнсе слова. Інтэрмедыя набывае адзнакі камедыі.

*«Вахканалія»* (1725) стала першым сведчаннем узнікнення ў беларускай драматургіі новага жанру − камедыі. Тут разам з мудрацом Дыягенам і польскімі панамі дзейнічаюць беларусы Васіль, яго парабак Селівон (гаворань па-беларуску).

У другой палове XVIII ст. цэнтрам беларускай драматургіі стаў Забельскі школьны тэатр на Полаччыне. Адзін з яго стваральнікаў, выкладчык рыторыкі ***Міхал Цяцерскі***, пісаў для тэатра трагедыі на польскай мове і на лаціне. Ён перарабіў камедыю Мальера *«Доктар па прымусе»*. Замест трох актаў Цяцерскі зрабіў пяць – як таго патрабуюць каноны класіцысцкай драмы, апусціў

жаночыя вобразы, увёў вобразы сялян Хведара і Апанаса, якія гавораць па-беларуску; зрабіў павучальна-маралізатарскай канцоўку твора. Фактычна п’еса М. Цяцерскага стала самастойным творам.

Найбольш арыгінальным драматычным творам беларускага Асветніцтва можна лічыць *«Камедыю»* ***Каятана Марашэўскага***, прафесара рыторыкі і паэтыкі той жа Забельскай дамініканскай гімназіі-калегіі. Яго першая літаратурная праца – трагедыя «Свабода ў няволі» (1787), пастаўленая ў школьным тэатры, была напісана па-польску. Але ў наступным творы пад назвай «Камедыя» (1787) асноўны тэкст падаецца па-беларуску. «Камедыя» К. Марашэўскага стала першым значным праяўленнем новай беларускай драматургіі.

## Тэма 5. Літаратура XIX стагоддзя (лекцыя 1)

Узнікненне новай беларускай літаратуры датуецца першымі дзесяцігоддзямі XIX ст. Яна, як і іншыя еўрапейскія літаратуры, развівалася ў час, што характарызаваўся важнымі гістарычнымі працэсамі. Фактарамі, якія вызначалі характар грамадскага жыцця, былі наступныя: паступовы распад феадальна-прыгонніцкага ладу, станаўленне і развіццё капіталістычных адносін і ў сувязі з гэтым фарміраванне нацый, узмацненне вызваленчага руху народа. Беларуская літаратура XIX ст. развівалася ў цеснай сувязі з ідэйна-мастацкімі традыцыямі суседніх літаратур. Уплыў на яе фарміраванне аказала Вялікая французская рэвалюцыя, ідэі Асветніцтва з яго верай у розум і творчыя сілы чалавека і рамантызму, з уласцівай яму павышанай увагай да духоўнага свету чалавека, культам фальклору. Новая беларуская літаратура абапіралася таксама на ідэалы Адраджэння і па-новаму сцверджаныя ім эстэтычныя традыцыі антычнасці. Беларуская літаратура XIX ст. была глыбока гуманістычнай па сваёй ідэйнай накіраванасці, у сваім імкненні да сацыяльнай справядлівасці, прапаведзі дабрыні і міласэрнасці.

*Першай характэрнай рысай* новай беларускай літаратуры з’яўляецца тое, што ў цэнтры яе ўвагі быў вобраз селяніна, які ў параўнанні з іншымі вобразамі

(пана-прыгнятальніка, царскіх чыноўнікаў, народных заступнікаў) выпісаны найбольш поўна і ўсебакова.

*Другая характэрная прыкмета* – блізкасць літаратуры да вуснай народнай творчасці, яе фальклорная аснова. Народна-сялянскі і фальклорны каларыт беларускай літаратуры XIX ст. быў гістарычна абумоўлены, вынікаў з асаблівасцей сацыяльна-палітычнага развіцця беларускага народа. З цягам часу адносіны пісьменнікаў да фальклору змяняліся: ад непасрэднага ўключэння ў арыгінальную творчасць фальклорных вобразаў і матываў, выкарыстання паэтыкі (літаратура развіваецца як ананімная) – да больш творчага засваення тэм, вобразаў, ідэй, іх трансфармацыі, абнаўлення.

Прычыны ўзнікнення новай беларускай літаратуры напрамую звязаны з грамадска-палітычнымі працэсамі развіцця Беларусі. Першым штуршком для яе зараджэння яшчэ да рэформы 1861 г. быў антыпрыгонніцкі рух сялянства, пасля рэформы – нарастанне рэвалюцыйных настрояў, абумоўленае абеззямельваннем. Другой прычынай быў рост нацыянальнай самасвядомасці ў дарэформенны час і нацыянальнай – пасля паўстання 1863 г.

Рух народных нізоў і рост нацыянальнай свядомасці ўплывалі на настроі і думкі шляхты і т.зв. краёвай інтэлігенцыі, творчая роля якой у зараджэнні новай беларускай літаратуры і яе развіцці на працягу ўсяго стагоддзя вельмі вялікая. Менавіта са шляхты выйшлі найбольш значныя прадстаўнікі літаратуры гэтага перыяду – Я. Баршчэўскі, Я. Чачот, А. Рыпінскі, В. Равінскі, В. Дунін-Марцінкевіч, К. Каліноўскі, Я. Лучына, Ф. Багушэвіч і інш. Так, Я. Чачот адзін са сваіх першых вершаў «На прыезд Адама Міцкевіча» напісаў па-беларуску ў 1819 г. (пасля выдаў каля 40 твораў на беларускай мове) і гэтым фактычна стаў пачынальнікам новай беларускай літаратуры. Аднак у выкарыстанні мовы народа пісьменнік кіраваўся навукова-этнаграфічнымі інтарэсамі, ён пісаў беларускія творы найперш для вучоных-лінгвістаў, каб захаваць узоры мовы. Чачот пра беларускую мову: «Сумнявацца трэба, каб яна стала пісьмовай і развівалася асобна».

Свядомы зварот да народнай мовы ажыццявіў В. Дунін-Марцінкевіч «для заахвочвання яго [народа] да асветы ў духу яго звычаяў, паданняў і разумовых здольнасцей».

Зараджэнне і развіццё новай беларускай літаратуры жывілі розныя крыніцы.

*Традыцыі старажытнай літаратуры.* Сувязі з мастацкімі набыткамі папярэдніх стагоддзяў не былі, у адрозненне ад іншых літаратур, што развіваліся «нармальна», непасрэднымі і шырокімі. У гісторыі беларускай літаратуры пераходны працэс быў моцна дэфармаваны сацыяльна-гістарычнымі абставінамі: даўнейшыя традыцыі ўваходзілі ў новую літаратуру не прама, а праз эстэтычны вопыт, як часціна беларускага нацыянальнага характару, асаблівасці светаразумення. Таму, нягледзячы на сувязь з літаратурай папярэдніх перыядаў, новая беларуская літаратура – з'ява ў многім якасна адрозная па ідэйных і мастацкіх асаблівасцях.

*Народная паэтычная творчасць.* Сувязі новай беларускай літаратуры з фальклорам былі значна больш разнастайнымі і плённымі. Гэтаму садзейнічалі агульныя тэндэнцыі развіцця еўрапейскіх літаратур, якія характарызаваліся павышанай увагай да этнічна-нацыянальнага элемента. На працягу ўсяго XIX ст. літаратура заставалася паўфальклорнай, творы ўзнікалі пераважна ў сялянскім асяроддзі і бытавалі ў ананімнай форме.

Спецыфічным жанрам новай беларускай літаратуры быў жанр гутаркі, які раскрываў «калектыўны» светапогляд. Гутаркі з'яўляюцца складнікамі своеасаблівга народна-сялянскага эпасу, пераважна бытавога, часткова падзейнага. Гутарка аказала ўплыў на арыгінальную літаратуру, напрыклад, на гавэнды У. Сыракомлі. Выдатнай школай паэтычнага майстэрства былі беларускія песні і казкі. Беларуская міфалогія стала першасным вытокам творчасці Я. Баршчэўскага («Шляхціц Завальня»), А. Абуховіча (байка «Ваўкалак»), Ф. Багушэвіча («Хцівец і скарб на святога Яна»).

А. Лойка вылучае 3 этапы ўзаемадзеяння новай беларускай літаратуры з фальклорам: 1 – этап рамантычнай стылізацыі (лірыка Я. Чачота, творы

Я. Баршчэўскага); 2 – рамантычна-этнаграфічны (звязаны з творчасцю В. Дуніна-Марцінкевіча); 3 – этап, звязаны з творчасцю Ф. Багушэвіча, «перадкласічны», самы шырокі па ахопе фальклорных традыцый і спосабах іх выкарыстання.

*Вопыт развіцця суседніх еўрапейскіх літаратур.* Новая беларуская літаратура амаль што «паўтарала», ішла тымі ж шляхамі, што і ўкраінская. Цесная сувязь тлумачыцца не толькі суседствам, але перш за ўсё тыпалагічным падабенствам працэсаў культурнага развіцця абодвух народаў. Беларускую і ўкраінскую літаратуры збліжала тое, што яны перажывалі працэс адраджэння, аднаўляліся на аснове жывой народнай мовы (для рускай і польскай – гэта чарговы перыяд развіцця).

Уплыў польскай рамантычнай літаратуры найбольш адчуваўся ў 1820 – 1840-я гг. (Я. Чачот. Я. Баршчэўскі, А. Рыпінскі, В. Дунін-Марцінкевіч). Пасля таго, як Беларусь апынулася пад уладай Расіі, у польскай шляхты, якая страціла ранейшае гаспадарскае становішча, абвастраецца пачуццё мясцовага патрыятызму. Гэта ў многім абумовіла ўзнікненне даволі багатай, пераважна рамантычнай, польскамоўнай літаратуры на беларускія тэмы.

Пераважна ў сферы ўплыву рускага крытычнага рэалізму знаходзілася новая беларуская літаратура ў 1890-я гг. (Ф. Багушэвіч, А. Гурыновіч, Я. Лучына). Праявы ўвагі да беларускай гісто рыі, культуры, мовы пачасціліся пасля паўстання 1863 – 1864 гг. У расійскім перыядычным друку з’явіліся першыя даследаванні па беларускім фальклоры, першыя публікацыі твораў. Развіццю новай беларускай літаратуры спрыялі зборы беларускага фальклору П. Шэйна, Е. Раманава, М. Нікіфароўскага і інш.

*Літаратурныя напрамкі.* У жанравых адносінах новая беларуская літаратура заставалася слаба развітай, беднай. У арыгінальнай літаратуры XIX ст. пераважаў эпас – вершаваныя і празаічныя гутаркі, паэмы «Энеіда навыварат», «Тарас на Парнасе», сюжэтныя вершы Ф. Багушэвіча. Сярод лірычных форм найбольш распрацаваны быў песенна-лі рычны жанр. Спробы больш шырокага асваення пейзажнага, лірыка-публіцыстычнага, элегічнага

верша з'явіліся толькі ў другой палове XIX ст. (Каліноўскі, Багушэвіч, Лучына). Беларуская драматургія, як і апавяданне, проза наогул, знаходзілася ў зародкавым стане.

Адной з асаблівасцей беларускай літаратуры гэтага перыяду было тое, што ў сваёй творчай эвалюцыі многія пісьменнікі праходзілі шлях ад рамантычных захапленняў да рэалістычнага паказу жыцця (або наадварот). Напрыклад, пераход ад рамантызму да рэалістычнага паказу жыцця назіраецца ў творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча: «Вечарніцы», «Шчароўскія дажынкі» – «Халімон на каранацыі», «Пінская шляхта», «Залёты». Рамантызм, для якога важным быў паказ ўнутранага свету выключнага чалавека, героя-бунтара, прадстаўлены творчасцю Т. Зана, Я. Чачота, Я. Баршчэўскага (балады – апрацоўка фальклорных паданняў і легенд).

У савецкім беларускім літаратуразнаўстве роля рэалістычнага метаду ў развіцці новай беларускай літаратуры перабольшана, часта рэалізм атаясамлівалі з натуралізмам, прымітывізмам. Класіцызм, для якога характэрны строгі падзел жанраў на «высокія» і «нізкія», арыентацыя на антычнае мастацтва з яго легендарнымі героямі (багі, цары), у беларускай літаратуры прадстаўлены своеасабліва: праз асмяянне («Энеіда навыварат», «Тарас на Парнасе»). Сентыменталізм з яго ўвагай да пачуццяў і перажыванняў чалавека часткова выявіўся ў творчасці Я. Баршчэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча («Ідылія», «Гапон»). Такім чынам, праблема вызначэння метаду новай беларускай літаратуры застаецца да сённяшняга часу складанай, таму што ў адным творы, у творчасці аднаго пісьменніка заўважаюцца праявы адразу некалькіх мастацкіх метадаў.

М. Лазарук вызначае некалькі асноўных мастацка-эстэтычных тэндэнцый у станаўленні і развіцці мастацкага пісьменства XIX ст.:

- Травесційна-бурлескная. Яна выяўлялася ў творах камічнага, парадыйна-сатырычнага ці гумарыстычнага характару, што вялі радавод ад «нізкіх» жанраў класіцызму (адзнакі гэтага стылю – у «Энеідзе навыварат», «Тарасе на Парнасе», вершах Ф.Тапчэўскага).

- Этнаграфічна-фальклорная з асветніцкім і сентыментальна-рамантычным ухілам (творы Чачота, Баршчэўскага, ранняга Дуніна-Марцінкевіча). У параўнанні з літаратурай травесційна-бурлескнай больш разнастайная ў жанравых адносінах, больш уважлівая да нацыянальна-культурных традыцый.
- Рэалістычна-публіцыстычная тэндэнцыя прадстаўлена пераважна ананімнымі творамі грамадска-палітычнага зместу: найперш гутаркі, што з’явіліся напярэдадні і пасля рэформы 1861 г., творы, якія ўзніклі ў сувязі з паўстаннем 1863 – 1864 гг., у тым ліку і творы К. Каліноўскага. Яны непасрэдна прычыніліся да фарміравання рэалістычнага напрамку ў новай беларускай літаратуры, вышэйшым дасягненням якога ў XIX ст. стала творчасць Ф. Багушэвіча і Я. Лучыны.

## Тэма 5. Літаратура XIX стагоддзя (лекцыя 2)

***Творчасць Яна Чачота*** *(1796 – 1847)*. Я. Чачот быў адным з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры, пісаў па-польску, але захавалася і шмат беларускамоўных твораў. Ён цалкам падзяляў філамацкія ідэі, развіваў і пашыраў іх разам з сябрамі, імкнучыся ажыццяўляць іх на практыцы, што выявілася ў яго паглыбленні ў вуснапаэтычную творчасць народа і асабліва ў спробе стварыць літаратуру на беларускай мове. Па аб’ёме беларускамоўнага матэрыялу ніхто з пісьменнікаў першай паловы XIX ст. не можа параўнацца з Я. Чачотам.

У 1816 г. Я. Чачот стаў студэнтам «галоўнай школы Літвы» – Віленскага ўніверсітэта. У чэрвені 1818 г. па рэкамендацыі А. Міцкевіча Чачота прынялі ў Таварыства філаматаў, дзе ён напачатку не адыгрываў значнай ролі. Але, дзякуючы шчырасці і сумленнасці, паэтычнаму таленту, стаў арганізацыйным цэнтрам таварыства: разам з Т. Занам Чачот наладжваў імянінныя ўрачыстасці. Яго неўзабаве абралі кіраўніком найбольш важнага аддзела Таварыства філаматаў – літаратурнага, які называўся Блакітны саюз.

У 1818 – 1820-х гг. («раннефіламацкі» перыяд творчасці) Я. Чачот стварае балады на польскай мове, у якіх ярка выявіўся яго паэтычны талент. Да нашага часу дайшло 8 балад – яркіх узораў передрамантызму: «Бекеш», «Навагрaдскі замак», «Падземны звон на горцы ў Пазяневічах», «Свіцязь», «Радзівіл, або Заснаванне Вільні», «Мышанка», «Узногі», «Калдычэўскі шчупак». На імяніны Міцкевіча ў канцы 1819 г. Чачот піша верш на беларускай мове «На прыезд Адама Міцкевіча», у якім выкарыстоўвае беларускія вясельныя песні. Польская мова для выказвання шчырых сардэчных пачуццяў да сябра была залішне афіцыйнай, таму Чачот напісаў верш па-беларуску. Таксама па-беларуску напісаны верш «Да пакіньце ж горла драць» і інш. Гэтым ён паказаў філаматам шлях да сапраўднай народнай паэзіі, але ніхто з іх у творчасці не перайшоў на беларускую мову. Надзвычай важную ролю адыгралі балады Я. Чачота ў творчай біяграфіі яго славутага сябра А. Міцкевіча, які вельмі зацікавіўся магчымасцю выкарыстоўваць матывы і вобразы вуснай паэзіі беларускага народа ва ўласнай творчасці.

Захавалася шмат твораў рознай тэматыкі на польскай мове: «Дума над магіламі французаў», «Ой ты, край мой нешчаслівы», «Мамка», «Сярмяга», «Вандроўная пташка», «Малацьбіты», інш.

У 1823 г. Я. Чачот быў зняволены па справе філаматаў, знаходзіўся ў дэпрэсіўным стане, з якога яго вывела Зося Малеўская. У выніку ўзніклі пяць рукапісных томікаў пад назвай «Зосіны песенькі» – паэт на ўзор народных песень складаў уласныя вершы.

Пасля турмы і адбыцця высылкі на Урале Я. Чачот на працягу амаль дзесяці год выдаў шэсць зборнікаў, вядомых пад загалоўкам «Сялянскія песні з-пад Нёмна і Дзвіны», куды ўвайшлі народныя песні, прыказкі, прымаўкі, слоўнік беларускай мовы (200 слоў). У адным з гэтых зборнікаў (1844) Чачот змясціў 28 уласных беларускіх вершаў: «Покуль сонца ўзыдзе...», «Нашто нам дым выядае вочкі», «Як то добра, калі мужык...», «Быў я колісь кавалём...», «Да мілых мужычкоў» і інш. У творах адчуваецца спачуванне паэта мужыку, аднак

Чачот выступае найперш з асветніцкай місіяй. Вершы вызначаюцца маралізатарствам, дыдактызмам.

У 1841 г. Я. Чачоту было дазволена вярнуцца пад нагляд паліцыі на Беларусь, у мястэчка Лепель. Пасля цяжкая хвароба прывяла яго ў Друскенікі, «на воды», але лячэнне не дало ніякага выніку. 23 жніўня 1847 г. Я. Чачота не стала.

***Ян Баршчэўскі*** *(1794 ? – 1851)*

Родам Я. Баршчэўскі з маляўнічай Полаччыны, з вёскі Мурагі на рацэ Няшчардзе (цяперашні Расонскі раён). Вучыўся ў Полацкай езуіцкай калегіі, хацеў паступіць у Віленскі ўніверсітэт, але не меў грошай і стаў зарабляць прыватнымі ўрокамі. Каля 1817 г. пераязджае ў расійскую сталіцу Санкт-Пецярбург, дзе зарабляе на пражыццё рэпетытарствам, гувернёрствам, выкладае грэчаскую і лацінскую мовы.

Выступаць у друку Я. Баршчэўскі стаў ужо ў сталым узросце – пасля сарака гадоў. Літаратурную творчасць пачаў з беларускамоўных вершаў, першыя з якіх – «Дзеванька», «Гарэліца», «Бунт хлопаў» (або «Рабункі мужыкоў»). Аднак беларускамоўныя творы, якіх, відаць, было нямала, паэт пісаў не для друку, бо добра разумеў, што для іх не прыйшла яшчэ пара. На той час апублікаваць ён мог толькі польскамоўныя творы.

З 1840 г. пісьменнік пачаў выдаваць польскамоўны літаратурны альманах-штогоднік «Незабудка» (выйшла пяць нумароў). У «Незабудцы» Я. Баршчэўскі змясціў свае балады («Русалка-спакусніца», «Дзявочая крыніца», «Дзве бярозы»), напісаныя на аснове народных паданняў, і каля пяцідзесяці вершаў. У 1844 г. у альманаху Баршчэўскі надрукаваў празаічную аповесць «Драўляны дзядок і кабета Інсекта» і першы том кнігі «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях», які пачынаўся прадмовай Р. Падбярэскага «Беларусь і Ян Баршчэўскі» (першы літаратурна-крытычны агляд новай беларускай літаратуры). У пачатку 1845 г. апублікаваны другі том, у 1846 г. – яшчэ два тамы.

У наш час кніга разглядаецца як паўнавартасны мастацкі твор, вобразна-выяўленчыя сродкі якога скіраваны на сцвярджэнне нацыянальнай ідэі. Асабліва ярка выказалася беларуская нацыянальная ідэя ў вобразе Плачкі. Ва ўсіх апавяданнях мінулае Беларусі малюецца «залатым векам», часам дабрабыту і ўзаемапаразумення паміж панамі і сялянамі. Тым не менш зварот Я. Баршчэўскага да мінулага Беларусі ажыццёўлены не з мэтай яго ідэалізацыі, а дзеля таго, каб паказаць, што ў ім, у патрыярхальным ладзе жыцця, знаходзяцца асновы нацыянальнага быцця беларусаў. Нягледзячы на выхаванне ў езуіцкай калегіі, пісьменнік не размяжоўвае хрысціянскае і паганскае, што з'яўляецца адметнасцю нацыянальнага светапогляду, які праўдзіва перададзены ў кнізе. Аўтар адмаўляе каталіцызм, бо бачыць у ім сілу, якая разбурае спрадвечныя ісціны, нівеліруе вызначальныя рысы нацыянальнага характару, вядзе, урэшце, да знікнення самога народа.

Усе апавяданні кнігі маюць адзнакі прытчы. Твор можа разглядацца як гістарычны, у якім адлюстроўваецца гісторыя Беларусі. Пісьменнік, на першы погляд, пазбягае гісторыка-канкрэтнай рэальнасці, але яго проза з'яўляецца міфалагізаванай рэальнасцю.

Аўтар нідзе не ўказаве даты і не апісвае рэальных падзей, аднак ёсць падставы гаварыць пра гістарызм яго прозы: у ёй створана духоўная атмасфера пэўнага гістарычнага адрэзку, праз рамантычна-прытчавую форму ўзноўлены пераломны перыяд у жыцці Беларусі – I-ы падзел Рэчы Паспалітай (1772). Сутнасць гістарычнай канцэпцыі, выкладзенай у кнізе «Шляхціц Завальня...»: на Беларусь прыходзяць чужынцы, з дапамогай подкупу атрымліваюць уладу спачатку над асобнымі панамі і сялянамі, а ўрэшце і над усім краем, дзе мяняецца спрадвечны жыццёвы парадак.

Пасля таго, як Ян Баршчэўскі закончыў працаваць над кнігай «Шляхціц Завальня...», ён пераехаў на Валынь. Памёр ад сухотаў у 1851 г.

***Уладзіслаў Сыракомля** (1823 – 1862)*

Уладзіслаў Сыракомля – псеўданім (ад назвы герба «Сыракомля» – «сыры камель»?) Людвіка Францішка Уладзіслава Кандратовіча. Шчыры

абаронца простага люду, выдатны паэт, вядомы краязнавец Уладзіслаў Сыракомля, імя якога ў сярэдзіне XIX ст. было добра вядома на Беларусі, стаяў у самым цэнтры антыпрыгонніцкага руху.

«Я – ліцвін», – неаднаразова зазначаў паэт і падкрэсліваў, што і яго прапрадзед быў «шчырым ліцвінам». «Літоўскім лірнікам», «літоўскім паэтам» называлі яго ў польскім, рускім і замежным друку. Аднак Літвою Сыракомля называў Беларусь, дзе нарадзіўся і правёў усё жыццё, па якой многа вандраваў.

Нарадзіўся будучы «лірнік вясковы», як называлі яго сучаснікі, 29 верасня 1823 г. у фальварку Смольгаў (сучасная  Любаншчына). Паходзіў са старабеларускай апалячанай шляхты, якая да таго часу страціла свае землі, бацька паэта быў арандатарам. У 1844 г. Сыракомля ажаніўся з 16-гадовай Паўлінай Мітрашэўскай і стаў арандаваць фальварак Залучча ў Навагрудскім павеце. Апошнія дзесяць гадоў жыцця (1853 – 1862) У. Сыракомля пражыў у фальварку Барэйкаўшчына пад Вільняй, куды пераехаў пасля таго, як у 1852 г. на працягу тыдня раптоўна памерлі тры малалетнія дачкі (спачатку пераехаў у Вільню, але там не прыжыўся).

У. Сыракомля пісаў на польскай мове, мове тагачаснага пісьменства і справаводства на Беларусі, але былі ў яго і беларускія вершы. На жаль, да нас дайшла толькі мізэрная частка беларускай спадчыны вясковага лірніка – вершы «Добрыя весці» і «Ужо птушкі пяюць усюды». Але ў сапраўднасці беларускіх твораў было значна больш, паэт нават задумваў асобную кніжку беларускамоўных вершаў, пра што гаварыў свайму сакратару В. Каратынскаму.

Паэтычны талент У. Сыракомлі раскрыўся ў часы яго жыцця ў фальварку Залучча. Адзін з першых яго твораў – вершаваная гутарка «Паштальён», надрукаваная ў віленскім часопісе «Атэнэум» у 1844 г., пасля смерці аўтара была перакладзена рускім паэтам Трэфалевым і стала шырока вядомай рускай народнай песняй «Ямщик».

Шматлікія польскія творы паэт напісаў у жанры гавэнды, або гутаркі. Так, у аснову гавэнды «Хадыка», набліжанай да вершаванай аповесці, пакладзена палескае паданне пра чалавека, які, забіўшы пана-лоўчага, трыццаць год

хаваўся ў пушчы і там займаўся бортніцтвам. (У сапраўднасці ўрочышча з назвай Хадыка ёсць у адным з лясніцтваў Салігорскага раёна.). Герой твора – неардынарная асоба – трыццаць год пакутуе ад згрызот сумлення і ўрэшце не вытрымлівае: ідзе на суд да князя, расказвае пра сваё жыццё і просіць справядлівага пакарання.

Менш, чым гавэнды, вядомыя лірычныя вершы паэта, многія з якіх маюць народна-песенную аснову: «Жніўная» – суперажыванне перапёлцы, што пазбавілася свайго гнязда; «Вячорная» – стылізацыя пад дажынкавую песню. Да народнай песні набліжаецца верш «Не я пяю – народ Божы...» (1844), перакладзены на беларускую мову Я. Лучынам, якому прыпісвалі аўтарства твора.

Ліра-эпічны верш «Лірнік вясковы» сугучны многім іншым творам Сыракомлі («Не я пяю – народ Божы...», «Прысвячэнне ліцвінам народных гутарак»). У «Лірніку вясковым» паэт гаворыць пра сваё прызначэнне – пець для простых людзей, выказвае запаветную мару, каб памяць пра яго захавалася на роднай зямлі.

У. Сыракомля напісаў шэраг празаічных, навуковых і публіцыстычных твораў, прысвечаных праблемам гісторыі, этнаграфіі і мовы беларусаў («Вандроўкі па маіх былых ваколіцах», «Кароткае даследаванне мовы і характару паэзіі русінаў Мінскай правінцыі», нататкі аб мінулым Нясвіжа). У 1855 – 1861 гг. у польскай прэсе У. Сыракомля змясціў чатыры артыкулы аб творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча.

У. Сыракомля захварэў на сухоты і памёр на 40-м годзе жыцця.

## Тэма 6. Літаратурны працэс ХХ стагоддзя (лекцыя 1)

Беларуская літаратура пач. ХХ ст. – цалкам новая старонка ў гісторыі нацыянальнай літаратуры. Навізна абумоўлена значнымі зменамі ў гістарычных абставінах, сутнасцю тагачасных сацыяльных і грамадска-палітычных працэсаў. Паняцце «беларускі літаратурны працэс пач. ХХ ст.» падразумявае кароткі па часе спрыяльны этап: сем-восем гадоў – паміж рэвалюцыяй

1905−1907 гг. і Першай сусветнай вайной (1914) (далейшыя падзеі мала спрыялі нармальнаму развіццю літаратуры).

У пач. XX ст. кнігі беларускіх аўтараў, якія выходзілі ў друк, звычайна маскіраваліся якім-небудзь адмысловым спосабам. Так, зборнік Я. Лучыны «Вязанка» выйшаў у 1903 г. у Пецярбургу як кніга балгарскіх, а не беларускіх вершаў (недасведчаны цэнзар не заўважыў розніцы). Ва ўмовах нацыянальнага прыгнёту літаратурна-грамадскі рух на Беларусі да 1905 г. быў дастаткова слабы. Вестуном уздыму, які наступіць пасля 1905 г., быў хіба што «Кружок беларускае народнае асветы» (створаны ў 1902 г. пецярбургскімі студэнтамі-беларусамі). Да выхаду ўласна беларускіх газет станоўчую рэвалюцыйна-дэмакратычную ролю адыграла газета «Северо-Западный край» (1902−1905, Мінск). Тут дэбютаваў Я. Купала, змяшчаліся рэвалюцыйныя вершы Цёткі, нарысы і беларускія легенды К. Каганца. У канцы 1905 г. газета была закрыта за рэвалюцыйныя погляды аўтараў і выдаўцоў.

1905−1907 гг. сталі для беларускага літаратурна-грамадскага руху і самой літаратуры рэзка пераломнымі. Рэвалюцыя 1905 г. зняла забарону з беларускага друкаванага слова. 1 верасня 1906 г. выйшаў першы нумар газеты «Наша доля». У ім былі змешчаны верш «Наш палетак» і апавяданне «Прысяга над крывавымі разорамі» Алаізы Пашкевіч (Цёткі), а таксама ў гэтым нумары дэбютаваў як публіцыст А. Луцкевіч з артыкулам «Што будзе?». Ініцыятары выдання – група дзеячаў Беларускай сацыялістычнай грамады, а больш дакладна адзін з лідараў Грамады і ўсяго нацыянальна-адраджэнскага руху – І. Луцкевіч. Апошні (шосты) нумар «Нашай долі» выйшаў 1 снежня 1906 г.

10 лістапада 1906 г. пачала выходзіць штотыднёвая грамадска-палітычная газета «Наша ніва». Нярэдка пач. XX ст. называюць «нашаніўскім» перыядам у развіцці нацыянальнай літаратуры, а саму літаратуру − «нашаніўскай». Такая назва не толькі апраўданая, але і найбольш дакладная, таму што змест і пафас большасці твораў пач. XX ст. самым непасрэдным чынам быў абумоўлены ідэалогіяй выдаўцоў газеты «Наша ніва». Як і «Наша доля», газета выдавалася ў

Вільні па ініцыятыве кіраўнікоў Беларускай сацыялістычнай грамады. Рэдактарамі былі А. Уласаў (1906–1914), Я. Купала ( з 1914 г.).

Неацэнным быў уклад «Нашай нівы» ў працэс развіцця беларускай літаратуры: тут упершыню былі апублікаваны некаторыя творы Ядвігіна Ш., У. Галубка, Я. Коласа (урыўкі з «Новай зямлі»), Я. Купалы (паэмы «Курган», «Бандароўна»), М. Багдановіча, А. Гаруна, М. Гарэцкага, Ц. Гартнага і інш. «Наша ніва» выконвала таксама функцыі кніжнага выдавецтва. У 1907–1913 гг. былі апублікаваны зборнікі «Песні жальбы» і «Апавяданні» Я. Коласа, «Вянок» М. Багдановіча, «Бярозка» Ядвігіна Ш., «Чыжык беларускі» Г. Леўчыка, беларускія календары і альманахі.

Праіснавала «Наша ніва» да жніўня 1915 г. За няпоўныя дзевяць гадоў на старонках газеты былі сфармуляваны ідэі, задачы і перспектывы нацыянальнага адраджэння, закладзены асноўныя кірункі развіцця беларускай мастацкай літаратуры.

Акрамя «Нашай нівы», напярэдадні Першай сусветнай вайны з’яўляліся іншыя перыядычныя выданні (сатырычны часопіс «Крапіва, газета «Беларус», сельскагаспадарчы часопіс «Саха», часопіс для моладзі «Лучынка», інш.). Першая сусветная вайна спыніла існаванне выданняў.

Акрамя перыядычных выданняў, магутную галіну літаратурна-грамадскага руху на пач. ХХ ст. прадстаўлялі шматлікія беларускія выдавецкія таварыствы. У 1906 – 1914 гг. існавала пецярбургская суполка «Загляне сонца і ў наша аконца». Яна выдала падпісную серыю «Беларускія песняры», а таксама наступныя падручнікі: «Беларускі лемантар, або Першая навука чытання» (аўтарам лічаць К. Каганца); «Першае чытанне для дзетак беларусаў» Цёткі; «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» Я. Коласа. У 1910 – 1913 гг. у Пецярбургу існавала беларускае прыватнае выдавецтва А. Грыневіча. Тут убачылі свет дзве кнігі Я. Купалы – «Адвечная песня» і «Гусляр», а таксама «Нёманаў дар», «Тоўстае палена» Я. Коласа; «Апавяданні» У. Галубка і інш. У 1913 г. у Вільні распачало дзейнасць Беларускае выдавецкае таварыства, у якім былі выдадзены кнігі М. Гарэцкага «Рунь», Тараса Гушчы «Родныя з’явы»,

К. Буйло «Курганная кветка», «Беларускі каляндар» на 1914, 1915, 1916 гг. Акрамя выдання газет і кнігадрукавання, на літаратурна-грамадскі рух пач. ХХ ст. уплывалі шматлікія гурткі, таварыствы, клубы.

*Асноўныя заканамернасці літаратурнага працэсу пач. ХХ ст.*

- Важнай заканамернасцю беларускага літаратурнага працэсу пач. ХХ ст. з'яўляецца паскоранасць развіцця літаратуры.
- Вылучэнне творчых індывідуальнасцей – яшчэ адна з найважнейшых заканамернасцей развіцця беларускай літаратуры пач. ХХ ст.
- Шырокае творчае спалучэнне лепшых нацыянальных і агульначалавечых ідэйна-мастацкіх традыцый, арыентацыя на сусветную літаратуру – ад антычнасці да навейшага часу.
- Адной з самых агульных заканамернасцей развіцця беларускай літаратуры пач. ХХ ст. быў масавы прыток у яе творчых сіл.
- Для беларускай літаратуры пач. ХХ ст. характэрна спалучэнне і ўзаемаўзбагачэнне такіх літаратурных напрамкаў, як рэалізм і рамантызм.
- Этапнай заканамернасцю развіцця літаратуры быў працэс пераўтварэння беларускай літаратуры як пераважна народна-сялянскагага каларыту ў літаратуру паўнакроўнага, шматграннага адлюстравання жыцця.

Апрача рэалізму і рамантызму, у літаратуры пач. ХХ ст. назіраюцца праявы (толькі пэўныя элементы) іншых літаратурных напрамкаў: сентыменталізм (паэма «Зімою» Я. Купалы, асобныя апавяданні З. Бядулі, Ядвігіна Ш.); натуралізм (творы А. Пшчолкі); мадэрнізм (творы В. Ластоўскага, паэмы Я. Купалы «Сон на кургане», «Адвечная песня», п'есы Ф. Аляхновіча «Цені», «Страхі жыцця»).

*Паэзія пач. ХХ ст.* Паэзіі належала першынство сярод літаратурных родаў. «Нашаніўская» паэзія стала актыўнай грамадзянскай сілай. Многія вершы Цёткі, Я. Купалы, Я. Коласа ўспрымаліся як рэвалюцыйныя пракламацыі. Найважнейшай тэмай у паэзіі стаў пратэст супраць сацыяльнай

крыўды, абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці. Амаль ва ўсіх паэтаў вобразы вясны, вясновага абнаўлення, сонца былі сімвалам абуджэння свядомасці беларусаў. Вершаваная творчасць пач. XX ст. была цесна звязана з вуснай народнай творчасцю, паэты шырока выкарыстоўвалі традыцыйныя фальклорныя формы (песні, калыханкі, калядкі, голас жалейкі).

Адным з самых распаўсюджаных жанраў «нашаніўскай» паэзіі быў *лірычны верш.* Лірычным творам Я. Купалы, М. Багдановіча, А. Гаруна, К. Буйло ўласціва глыбокае пранікненне ва ўнутраны свет чалавека, цікавасць да індывідуальнага чалавечага лёсу. У творчасці нашаніўскіх паэтаў прысутнічала і *інтымная лірыка.* Часам яна перамяжоўвалася з нацыянальнай праблематыкай (творы Я. Купалы), была цесна звязана з *філасофскай лірыкай.* Паэтаў хвалявалі тэмы жыцця і смерці (М. Багдановіч), чалавека і прыроды (А. Гарун). Была распаўсюджана і *сацыяльна-палітычная лірыка* (творы Цёткі, Я. Купалы, А. Гаруна, Г. Леўчыка). Паэты вырашалі праблемы нацыянальнай ідэнтыфікацыі (шукалі адказ на пытанне «Хто мы?»), абаранялі «беларушчыну» ад рэнегатаў.

Этапнымі ў беларускай паэзіі пач. XX ст. сталі зборнікі Цёткі «Скрыпка беларуская» і «Хрэст на свабоду» (1906), Я. Купалы «Жалейка» (1908), «Гусляр» (1910), «Шляхам жыцця» (1913), Я. Коласа «Песні жальбы» (1910), М. Багдановіча «Вянок» (1913), К. Буйло «Курганная кветка» (1914), А. Гаруна «Матчын дар» (1918).

*Шляхі развіцця беларускай мастацкай прозы.* Пачатак XX ст. стаў перыядам станаўлення беларускай прозы. Першапачаткова нацыянальная проза абапіралася на традыцыі вусна-паэтычнай творчасці, на традыцыі казачнага эпасу. Гэтыя традыцыі значна паўплывалі на творчасць К. Каганца («Прылукі»), Ядвігіна Ш. («Суд»), У. Галубка («Марымонавы сабакі»). Паступова на першы план выходзіць індывідуальнасць, чалавек, складаная дыялектыка чалавечай натуры і знешніх абставін.

Пра развіццё беларускай прозы сведчыў выхад зборнікаў Я. Коласа «Апавяданні» (1912) і «Родныя з'явы» (1914) – абодва пад псеўданімам Тарас Гушча, М. Гарэцкага – «Рунь» (1914), З. Бядулі – «Абразкі» (1913).

Асноўным празаічным жанрам у літаратуры пач. ХХ ст. з'яўлялася апавяданне. Былі пашыраны наступныя жанравыя формы апавядання: сацыяльна-бытавая, псіхалагічная навела (Багдановіч, Бядуля, Гарэцкі, Колас); навела-прытча, навела-алегорыя (Бядуля, Гарун, Колас, Ядвігін Ш.); навела-імпрэсія (Бядуля, Гарэцкі, Колас, Палуян, Ядвігін Ш., Ластоўскі); абразок (Багдановіч, Бядуля, Гарэцкі, Ластоўскі); гумарыстычная навела, літаратурны анекдот (Галубок, Каганец, Колас, Ядвігін Ш.); навелы, у аснове якіх ляжаць казкі, легенды (Багдановіч, Гарун, Ластоўскі, Каганец); апокрыф (Багдановіч); мастацкі нарыс (Каганец, Пшчолка, Ядвігін Ш.).

Прыкметай сталасці літаратуры лічыцца з'яўленне буйных жанравых празаічных форм. Менавіта ў пач. ХХ ст. пачынаюць распаўсюджвацца буйныя празаічныя жанравыя формы. Сярод іх можна назваць: мемуары («Успаміны» Ядвігіна Ш.); дакументальна-мастацкія запіскі («На імперыялістычнай вайне» М. Гарэцкага); аповесць («Дзве душы», «Ціхія песні» М. Гарэцкага – дапрацаваная ў 1930 г., яна выйшла пад назвай «Ціхая плынь», «Меланхолія»); раман (незакончаны раман Ядвігіна Ш. «Золата», «Сокі цаліны» Ц. Гартнага).

*Драматургія пач. ХХ ст.* Значны ўплыў на развіццё драматургіі ў гэты час аказалі творы К. Каганца (п'есы «Модны шляхцюк», «Сын Даніла», «Двойчы прапілі»). Над драматычнымі творамі працавалі Я. Купала («Паўлінка», «Раскіданае гняздо», «Прымакі»), Я. Колас («Антось Лата», «На дарозе жыцця»), З. Бядуля («Смерць пастушка», «Спатканне»), К. Лейка (п'еса-казка для дзяцей «Снатворны мак»), У. Галубок, Ф. Аляхновіч.

Спецыфіка драматургіі пач. ХХ ст. заключалася ў тым, што яна была цесна звязана з паэзіяй і прозай. Таму ўласна драматычных твораў у гэты час было нямнога. Па сваёй структуры некаторыя драматычныя творы стаялі бліжэй да эпічных, толькі ў дыялагічнай форме (сямейна-бытавая драма «Любоў усё пераможа» А. Гурло). Структурныя і вобразна-стылявыя пачаткі

эпасу і драмы ўвабрала ў сябе драматызаваная аповесць «Антон» М. Гарэцкага. Прыкметнай з’явай часу былі драматычныя паэмы Я. Купалы «Адвечная песня», «Сон на кургане».

У пач. XX ст. у беларускай драме існавалі наступныя жанравыя формы: уласна драма («Страхі жыцця», «Цені» Ф. Аляхновіча, «Раскіданае гняздо» Я. Купалы); меладрама («Ганка», «Апошняе спатканне» У. Галубка); камедыя («На Антокалі» Ф. Аляхновіча, «Паўлінка» Я. Купалы); драматызаваная казка («Чорт і баба» Ф. Аляхновіча, «Хлопчык у лесе» А. Гаруна). драматычны абразок («Атрута», «Антон», «Чырвоныя ружы» М. Гарэцкага ).

*«Нашаніўская» літаратурная крытыка.* Найбольш актыўнай айчынная крытыка была ў 1913 – 1914 гг. У гэты час з высокім прафесіяналізмам выступалі ў друку маладыя прадстаўнікі крытыкі і літаратуразнаўства – такія, як М. Багдановіч, В. Ластоўскі, А. Навіна, М. Гарэцкі, інш.

Адным з самых прафесійных пачынальнікаў беларускай літаратурнай крытыкі быў С. Палуян. У «Нашай ніве» ў 1910 г. быў надрукаваны першы ў беларускай крытыцы аглядны артыкул «Беларуская літаратура ў 1909 г.». У артыкуле «Беларуская паэзія ў яе тыповых прадстаўніках» С. Палуян звяртаў увагу на эстэтычны ўзровень мастацкіх твораў 1909 г., на іх мастацкую дасканаласць, лічыў, што твор нельга зводзіць да люстранога адбітку рэальных з’яў.

Сярод жанравых форм крытыкі і літаратуразнаўства можна назваць наступныя: бібліяграфічная нататка; матэрыял, дапасаваны да асветных мэт; ідэйна-тэматычны разгляд твора; аператыўны водгук на новы твор; гісторыка-літаратурны нарыс; праблемны артыкул; палемічнае выступленне; гадавы агляд, рэцэнзія і інш.

Такім чынам, літаратурна-грамадскі рух пач. XX ст. уяўляў сабой шырокае кола рознабаковай адраджэнскай дзейнасці.

## Тэма 6. Літаратурны працэс XX стагоддзя (лекцыя 2)

У параўнанні з «нашаніўскім» перыядам літаратура 1920-х гг. больш мазаічная, унутрана палемічная. Літаратурны працэс пазначаны існаваннем многіх пісьменніцкіх арганізацый і аб’яднанняў, адрозным разуменнем месца і ролі мастацтва ў жыцці народа, адносінамі да традыцыі, да фальклору. Ускладняў і разнастаіў літаратурнае жыццё прыход новага пісьменніцкага пакалення. Побач з «нашаніўцамі» працавалі маладыя, што прыйшлі на хвалі рэвалюцыйнага абнаўлення рэчаіснасці.

*Літаратурныя аб’яднанні*

*«Маладняк»* існаваў з лістапада 1923 г. да лістапада 1928 г. Узнік як гурток маладых паэтаў пры часопісе «Маладняк». Заснавальнікі М. Чарот, А. Бабарэка, Я. Пушча, А. Дудар, А. Вольны, А. Александровіч. Меў студыі і гурткі ў многіх гарадах і мястэчках. Узначальвалі «Маладняк» у розны час М. Чарот, А. Вольны, У. Дубоўка, П. Галавач. Друкаваны орган − часопіс «Маладняк» (1923–1932). З мая 1925 г. выдаваў невялікія зборнікі сяброў арганізацыі (каля 60 кніг). Творчая праграма сфармулявана ў дэкларацыі 1924 г., удакладнялася ў 1925 і 1926 гг. «Асновай нашай маладнякоўскай формы, у якой мы ажыццяўляем нашы ідэі, з’яўляецца мастацка-праўдзівы вобраз, аб’ектыўна адпавядаючы рэальнасці... Наш асноўны прынцып: форма павінна адпавядаць зместу, выкладанне тэме» (1925). Дэкларацыя патрабавала «ўвасобіць у мастацка-праўдзівых вобразах штодзённы вопыт рабочых і сялян». Літаратура ў класавым грамадстве – важны сродак класавай барацьбы.Першы раскол − май 1926 г. Выйшлі К. Чорны, К. Крапіва, У. Дубоўка, А. Бабарэка, П. Глебка, Я. Пушча, М. Лужанін. Другі раскол − на мяжы 1927–1928 гг. Выйшлі М. Чарот, М. Зарэцкі, А. Вольны, В. Сташэўскі. У 1928 г. «Маладняк» рэарганізаваны ў БелАПП (Беларуская асацыяцыя пралетарскіх пісьменнікаў). Праіснавала да 1932 г.

*«Узвышша»* існавала з мая 1926 г. па снежань 1931 г. Створана па ініцыятыве былых маладнякоўцаў А. Бабарэкі, У. Дубоўкі, К. Крапівы, Я. Пушчы, К. Чорнага. Першапачатковая мэта: стварэнне невялікай групы

таленавітых пісьменнікаў, павышэнне эстэтычных якасцей мастацкіх твораў, крытыка арганізацыйнай структуры «Маладняка». Друкаваны орган – часопіс «Узвышша» (1927–1931). Згуртаванне найбольш выявіла сябе ў літаратуразнаўстве і крытыцы (спалучэнне агульнаэстэтычнага, сацыялагічнага, эстэтычнага аналізу твора, вылучэнне на першы план майстэрства і таленту, арыентацыя на смелы эксперымент), у прозе – наватарскія пошукі Чорнага, Мрыя, Бядулі, Калюгі, у паэзіі – арыгінальнасць паэм Дубоўкі, Пушчы.

Асноўны кірунак новага аб’яднання быў узяты на самабытна нацыянальны шлях развіцця, на засваенне мінулых здабыткаў роднай культуры, літаратурных дасягненняў іншых народаў. Выступалі за свабоду творчасці, незалежнасць літаратурнага згуртавання («Маладняк» працаваў пад апекай ЦК ЛКСМБ, а пасля і ЦК КП(б)Б). Заахвочвалі мастацкі пошук (эксперыментаванне). Заклікалі павышаць культуру творчасці, працавалі над мовай. Сваіх мэт імкнуліся дасягнуць праз: 1) развіццё культуры мовы; 2) жыццёвую сімволіку мастацкага твора (спалучэнне рэалістычных традыцый са смелым наватарствам); 3) канцэнтрацыйную вобразнасць (тэорыя распрацавана недастаткова, па Бабарэку, кантрасны вобраз уключае два аспекты: адмаўленне, непрыняцце, дэструкцыю і сцвярджэнне, пазітыўнасць, творчасць); 4) дынамічнасць кампазіцыі; 5) беларускую жанравасць (нацыянальная адметнасць формы); 6) адзінства творча-мастацкай ідэі; 7) разнастайнасць фармальных рэальнасцей (розныя стылі і метады); 8) аквітызм (тлумачаць як паказ неадназначнасці жыццёвых з’яў, разуменне жыцця як няспыннай плыні, руху).

У 1930 г. былі арыштаваны У. Дубоўка, Я. Пушча, У. Жылка, А. Бабарэка, у 1931 г. – А. Адамовіч, Ф. Купцэвіч, у 1933 г. – Л. Калюга, М. Лужанін, у 1934 г. – А. Мрый, С. Дарожны, у 1937 г. – В. Шашалевіч, Т. Кляшторны, у 1938 г. – К. Чорны. У снежні 1931 г. на агульным сходзе прынята рашэнне аб самароспуску аб’яднання.

*«Полымя»* існавала са снежня 1927 г. па май 1932 г. Члены згуртавання: Я. Купала, Я. Колас, Ц. Гартны, М. Грамыка, А. Гурло, У. Галубок,

Я. Нёманскі, М. Піятуховіч, а таксама нядаўнія маладнякоўцы М. Чарот, М. Зарэцкі, А. Вольны, А. Дудар (у 1929 г. быў выключаны), А. Александровіч (вярнуўся ў «Маладняк», стаў лідарам БелАПП), В. Сташэўскі. Імкнуліся ўраўнаважыць крайнія тэндэнцыі ў літаратуры, выступалі за творчае супрацоўніцтва ўсіх суполак. З 1922 г. (заснаванне часопіса) старэйшыя пісьменнікі групаваліся вакол друкаванага органа. Часопіс рэвалюцыйна-мастацкай думкі, непартыйны, дапускае пэўную свабоду думак, але ў рамках прызнання савецкай улады і пры ўмове падтрымкі нацыянальнай палітыкі партыі. Заснавальнікі заявілі, што будуць адкрыта змагацца супраць нацыяналістаў. Ліквідаваны ў сувязі з Пастановай ЦК КП(б)Б «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый БССР».

*Агульная характарыстыка «маладнякоўскай» літаратуры.* Найбольш развіта паэзія, што назіралася і ў «нашаніўскі» перыяд. Дамінуюць вершы-гімны новаму жыццю, адмаўленне жыцця старога, у якім нібыта было адно гора, пакуты. Рэчаіснасць успрымаецца абагульнена-рамантычна. Маладнякоўцы лічылі, што самой гісторыяй ім дадзена права прадстаўляць і ствараць новую літаратуру, быць лідарам літаратурнага працэсу. Яны не звязаны з мінулым, як старэйшыя пісьменнікі, жывуць сучаснасцю. Многім маладым аўтарам была ўласціва недаацэнка, а то і ўвогуле непрыманне мастацкага вопыту папярэднікаў, фальклору. Імкненне абнавіць вобразную паэтычную сістэму часта нараджала штампы, каноны, штучнасць якіх кідаецца ў вочы. Ад паэта да паэта, з верша ў верш пераходзілі адны і тыя вобразы, эпітэты, словы-наватворы: дні-сонцавеі; ірдзень-агні, агняцветы-зоры, кудлатая радасць, віхрамётныя хвалі, вогнесталь і інш. З мяккай іроніяй пісаў пра тую пару, на якую прыпала яго паэтычная маладосць, А. Куляшоў у аўтабіяграфічнай паэме «Далёка да акіяна» (1971).

Хутка ў творчасці маладых пісьменнікаў з’явілася паэма. У першай пал. 1920-х гг. М. Чаротам напісаны «Босыя на вогнішчы», «Беларусь лапцюжная», «Чырванакрылы вяшчун», «Карчма»; У. Дубоўкам − «Камсамолка Ганна»,

«Студэнт» – творы цікавыя формай і зместам. З эксперыментальна-наватарскімі паэмамі «Гвалт над формай» і «Крылан» выступіў М. Грамыка.

Рамантычна-ўзнёслы пафас, публістычная дэкларацыйнасць былі ўласцівы і празаічным творам маладнякоўцаў (М.Чарот, К.Чорны, М.Зарэцкі, В. Каваль, Б. Мікуліч, Р. Мурашка, С. Баранавых, М. Лынькоў і інш.). Тут таксама нейкі час галоўнай была тэма рэвалюцыі, класавага змагання, выяўлялася ўсеагульная «рэвалюцыйная радасць». Т. зв. маладнякоўская проза, як і паэзія, з'явы неаднародныя. Разам з тым і ў паэзіі, і ў прозе можна вылучыць нейкія агульныя рысы: 1. Рамантычная ўмоўнасць, абагульненасць вобразаў і падзей. 2. Не асэнсаванне, а ўзнаўленне жыцця і выяўленне аўтарскіх адносін да яго. 3. Сцвярджальны, аптымістычны пафас, пра што сведчаць нават назвы зборнікаў паэзіі і прозы: «Да сонца», «Веснаход» у М. Чарота, «Срэбра жыцця», «Свята працы і свету» ў К. Чорнага, «Вёска ў радасці», «Песні вясны» ў М. Нікановіча, «Пела вясна» ў М. Зарэцкага, «Як вясну гукалі» В. Каваля. «Раніца рыкае», «Vita» ў Я. Пушчы і г.д. Услаўляючы «вясну жыцця» – рэвалюцыю, пісьменнікі часта стваралі не класічнае сюжэтнае апавяданне з распрацаваным аб'ектывізаваным характарам у цэнтры, а імпрэсіі, замалёўкі. Жанравыя вызначэнні даваліся самыя розныя: абразок, быль, эцюд, малюнак, настрой, легенда, казка-быль, паэма і г.д. У празаічных творах досыць часта прысутнічала квяцістая вобразнасць, рытміка.

Маладнякоўцы ўвялі прыгодніцкую аповесць («Свінапас» М. Чарота, «Ваўчаняты» А. Александровіча, А. Вольнага, А. Дудара; «Два» А. Вольнага, «Мяцеліца» М. Нікановіча, «Затока ў буры» Я. Скрыгана).

## Тэма 6. Літаратурны працэс ХХ стагоддзя (лекцыя 3)

*Гуманістычны пафас літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны*

Літаратура 1941–1945 гг. прыкметна адрозніваецца ад літаратуры 1930-х і пасляваенных 1940-х сваёй тэматыкай і праблематыкай, родава-жанравымі прыкметамі, а часта і мастацкім узроўнем. У ваенныя гады дамінуе паэзія, як самы аператыўны род літаратуры. Эпас (проза) і асабліва драматургія

прадстаўлены асобнымі творамі. Т. зв. ваенны перыяд вылучаюць у творчасці амаль усіх майстроў слова, чый творчы шлях пачаўся у перадваенныя дзесяцігоддзі (К.Чорны, П. Броўка, А. Куляшоў, М. Танк, П. Панчанка, інш.). І. Шамякін, І. Мележ пачалі пісаць і друкавацца ў гады вайны. У 1939 г. (пачатак Другой сусветнай вайны) і 1940 г. у савецкай літаратуры з'явіліся т. зв. творы-прадбачанні – вершы, паэмы, нават раманы, былі зняты кінафільмы («Если завтра война»). У беларускай літаратуры гэта вершы і паэмы П. Панчанкі і А. Куляшова.

Вершы П. Панчанкі («Першыя кулі», «Паранены»), вершы і паэму «Хлопцы апошняй вайны» А. Куляшова поўніць патрыятычны пафас, у іх прысутнічае ўпэўненасць у тым, што вораг будзе пераможаны. З боку формы гэтыя творы – творы-прадчуванні, бо вайна яшчэ не пераступіла парог роднага дома. Але як абвастраюцца пачуцці лірычнага героя і П. Панчанкі, і А. Куляшова, калі гора стала родным. Вялікую Айчынную вайну Панчанка сустрэў у Беластоку. Цяжкая, доўгая дарога адступлення праз палаючыя гарады. Яе апіша паэт у вершы «Дарога вайны».

Літаратура адгукнулася на трагічныя падзеі не разгубленасцю, а заклікам да змагання з ворагам. У першыя ж дні вайны з'явіліся вершы Я. Купалы «Беларускім партызанам», М. Танка «Не шкадуйце, хлопцы, пораху…», Я. Коласа «Шалёнага пса – на ланцуг».

Драматычны лёс Беларусі, трывога за родных і блізкіх людзей, якія засталіся на акупаванай тэрыторыі, нарадзілі з'яўленне ў хоры лозунгавай паэзіі індывідуальныя галасы. Так, П. Броўка раскрываецца як лірык. Згадваючы лёс Беларусі, знаходзіць шчырыя, прачулыя словы і вобразы («Маці», «Роднае», «Байцам-беларусам», «Спатканне», «Будзем сеяць, беларусы!» і інш.). Вобраз Радзімы ў паэзіі ваеннага часу набыў сваю канкрэтнасць. Трагічна-гераічны вобраз: Беларусь-паланянка і Беларусь-змагарка, партызанка. У многіх творах паўстаюць як асаблівая каштоўнасць звычайныя «мірныя вобразы», якія сімвалізуюць радзіму і мірнае жыццё: у Я. Коласа – беларускія лясы, у

П. Панчанкі – сінія касачы, у В. Віткі – жоўты сланечнік, у П. Глебкі – акрайчык духмянага беларускага хлеба, пралескі ў М.Танка.

Многія творы ваеннага часу прывязаны да падзей і фактаў змагання з ворагам. З рэальнымі фактамі звязаны ці такімі фактамі падказаны хрэстаматыйныя творы А. Куляшова «Балада аб чатырох заложніках», «Ліст з палону», вершы П. Панчанкі «Саша», «Балада пра Міколу Сасноўскага», «Паэма пра Смалячкова» П. Броўкі). Гэтая асаблівасць – прывязанасць да жыццёвага факта, жыццёвай сітуацыі – характарызуе таксама апавяданні К. Чорнага і М. Лынькова. Побач з вершамі-заклікамі паэзія ВАв шырока прадстаўлена баладай («Балада аб чатырох заложніках», «Камсамольскі білет» А. Куляшова, «Коні», «Герой», «Балада пра Міколу Сасноўскага» П. Панчанкі, «Рана», «Надзя-Надзейка», «Кастусь Каліноўскі» П. Броўкі, «Балада аб уральскім танку» А. Вялюгіна, «Маці» М. Танка і многія іншыя творы).

Паэзія ваеннага перыяду побач з вершамі прадстаўлена шэрагам паэм. Усе творы ўзнаўляюць ваенныя падзеі. З-пад пяра народнага паэта Беларусі Я. Коласа з’явіліся паэмы «Суд у лесе» і «Адплата». Змаганне з ворагам на акупаванай тэрыторыі ўзнаўляецца ў паэме «Янук Сяліба» М.Танка. У гады вайны А. Куляшовым створаны «Сцяг брыгады», «Прыгоды цымбал» і «Дом нумар 24». Час напісання паэм П. Панчанкі «Іспанская ноч» і «Маладосць у паходзе» – пераможны 1945. Другі з названых твораў – аўтабіяграфічны. У гады вайны Панчанкам была створана яшчэ адна паэма, «Падарожжа ў нянавісць». Аднак яна была надрукавана ў апошнім складзеным аўтарам прыжыццёвым зборніку «Зямля ў мяне адна» (1996). У канцы 1960-х гг. была надрукавана паэма «Эдэм» загінуўшага ў 1944 г. З. Астапенкі. Падзеі ў творы таксама адбываюцца ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Набыткі прозы ў дадзены перыяд прыкметна меншыя. Выйшлі зборнікі апавяданняў К. Чорнага «Вялікае сэрца», М.Лынькова «Астап», першы зборнік І. Мележа «У завіруху». Аднак менавіта ў гады вайны К. Чорны стварае свае лепшыя раманы «Пошукі будучыні», «Млечны шлях», «Вялікі дзень», у якіх

уздымаецца да філасофскага асэнсавання гістарычнага лёсу народа, раскрывае сутнасць фашызму.

У гады вайны з’явіліся п’есы К. Крапівы «Проба агнём», «Валодзеў гальштук», «Мілы чалавек».

*Тэма абпаленага вайной маленства.* У пасляваенны перыяд у літаратуры актыўна працуе некалькі пісьменніцкіх пакаленняў. Прадстаўлена адзінкамі старэйшае пакаленне «нашаніўцаў» і «маладнякоўцаў-узвышанцаў» (Я. Колас, М. Лынькоў, К. Крапіва, М. Лужанін). Пакаленне франтавікоў (І. Шамякін, І. Мележ, П. Панчанка, А. Куляшоў, М. Танк, Я. Брыль, В. Быкаў, І. Навуменка, А. Макаёнак і інш.). Філалагічнае пакаленне (У. Караткевіч, Р. Барадулін, Я. Сіпакоў, Н. Гілевіч, Г. Бураўкін, А. Вярцінскі, В. Адамчык, В. Карамазаў, А. Кудравец, І. Пташнікаў, І. Чыгрынаў, В. Зуёнак, М. Стральцоў, А. Петрашкевіч, М. Матукоўскі і інш.). Умоўная назва пакалення – з-за філалагічнай адукацыі. Пісьменнікаў таксама называюць «дзецьмі вайны», у гэтым выпадку далучаецца яшчэ некалькі прозвішчаў – В. Казько (1940 г.н.), А. Сербантовіч (1941 г.н.).

У гэтых двух пакаленняў павышаная ўвага да падзей вайны. Дзякуючы іх творам жыццё народа асэнсавана рознабакова. Разам з тым асабісты ваенны вопыт пісьменнікаў адрозніваецца. Нейкі час, калі «дзеці вайны» загаварылі пра «сваю» вайну, да іх твораў ставіліся з пэўнай доляй насцярогі: ці ёсць у іх што сказаць? Ужо склалася думка, што пра мінулую вайну праўдзіва могуць расказаць толькі яе ўдзельнікі і сведкі. Ці могуць быць удзельнікамі і сведкамі тыя, каму ў 1941-м было дзевяць і менш гадоў? Гэтай насцярогай народжаны верш Н. Гілевіча «Ты кажаш, я не ведаю вайны...».

Вельмі эмацыянальна пра памяць вайны пісаў самы малады прадстаўнік «дзяцей вайны» А. Сербантовіч (зб. «Міннае поле» (1968), па назве аднайменнай паэмы). «Немастацкія» ўражанні дзяцінства ўзноўлены ў аўтабіяграфіях В. Адамчыка , Я. Сіпакова, Г. Бураўкіна.

Да тэмы *дзеці і вайна* ў нацыянальнай літаратуры першым звярнуўся К. Чорны (раманы «Трэцяе пакаленне», «Пошукі будучыні», «Млечны шлях»).

Пісьменнік увёў у літаратуру філасофска-сімвалічныя вобразы ўкрадзенага маленства і вялікага злодзея. Расказваючы пра дзяцінства Міхалкі Тварыцкага, Зосі, Ірынкі Назарэўскай, у 1930-я гг. К. Чорны верыў, што лёс іх дзяцей, лёс «трэцяга пакалення», будзе іншым. У творах ваеннага часу пісьменнік вымушаны быў канстатаваць, што вялікі злодзей аб'явіўся зноў, каб забіраць маленства ў саміх дзяцей і маленства дзяцей у бацькоў. Зазначым, што «зялёным падлеткам» у час Першай сусветнай вайны быў і сам К. Чорны. Вопыт дзяцей Другой сусветнай вайны яшчэ больш трагічны (верш «Маё і тваё маленства» П. Пінчанкі).

Тэма абпаленага вайной маленства шырока ці больш вузка прасутнічае ў творах, бадай, усіх пісьменнікаў філалагічнага пакалення. Так, у І. Чыгрынава ўласна перажытае ажывае ў першых апавяданнях («Бульба», «За сто кіламетраў на абед»). Вайна раскрываецца праз штодзённыя, часта побытавыя моманты.

Народ не толькі змагаўся з ворагам, але і жыў. Менавіта жыццё народа ў гады вайны ў цэнтры ўвагі прадстаўнікоў філалагічнага пакалення. Яно ўзноўлена ў апавяданнях «На чацвёртым годзе вайны» М. Стральцова, «Холад на пачатку вясны» А. Кудраўца, «Салодкія яблыкі», «Раяль з адламаным вечкам» В. Адамчыка, «Алёшка» І. Пташнікава.

Пісьменнікі ўзнаўляюць звычайныя жыццёвыя сітуацыі. Аднак за гэтай звычайнасцю паўстае складанасць і трагізм вайны, безабароннасць дзіцячага свету. Гераізм дзяцей, іх смелыя ўчынкі, тым больш подзвігі абыходзяцца ўвагай. Сярод твораў В. Адамчыка, І. Пташнікава, І. Чыгрынава і інш. не знойдзем праблемна падобных апавяданню «Васількі» М. Лынькова, дзе хлопчык здзяйсняе гераічны ўчынак. Адбываецца нават пераасэнсаванне некаторых калізій ваеннага часу. У вершаванай аповесці Н. Гілевіча «Сто вузлоў памяці» дзяўчынка-падлетак дабіла параненага немца. Яе ўчынак жахае вясковых жанчын.

Н. Гілевіч, І. Пташнікаў нарадзіліся на Лагойшчыне, у т. зв. партызанскім краі. Рэальныя падзеі жыцця бацькоўскай сям'і ў гады вайны шырока ўводзіць ў творы Н. Гілевіч (аўтабіяграфічная аповесць «Перажыўшы вайну»,

вершаваныя аповесці «Недзяленя», «Сто вузлоў памяці»). Творы І. Пташнікава цесна прывязаны да жыццёвай канкрэтыкі (гэта адна з асаблівасцей прозы пісьменніка), аднак аўтабіяграфізм іх прыхаваны. І ён часцей унутраны (адчуванні, перажыванні), чым знешні (падзеі, сітуацыі).

Разам з «Алёшкам» з'явіліся таксама апавяданні І. Пташнікава «Алені» і «Бежанка». У іх паказваюцца першыя пасляваенныя гады. Апавяданне «Алені» стаіць ля вытокаў т. зв. экалагічнай тэмы. Але ў ім выразна гучыць водгулле вайны. Па-іншаму, чым у творах 1960-х гг., праблема «дзеці і вайна» ўбачылася І. Пташнікаву праз два дзесяцігоддзі (апавяданне «Эфка», 1983). На вобразе Толіка Вайды пісьменнік паказаў, якое душэўнае калецтва спараджала вайна.

У паэзіі тэма абпаленага вайной маленства найшырэй прадстаўлена творамі Р. Барадуліна (вершы «Палата мінёраў», «Бацьку», «Труба», «Стэарынавая свечка», «Хлебнічак», паэмы «Трыпціх», «Блакада»).

Тэма абпаленага вайной дзяцінства раскрываецца як на матэрыяле падзей ваеннага часу, так і першых пасляваенных гадоў (аповесць М. Стральцова «Адзін лапаць, адзін чунь», аповесць Я. Сіпакова «Крыло цішыні»).

У 1970-х гг. тэму абпаленага вайной маленства падхапіў і па-новаму раскрыў В. Казько (рускамоўныя творы «Високосный год», «Здравствуй и прощай», аповесць «Суд у Слабадзе»). Вайна ў В. Казько прыкметна трагедызуецца, скіроўваецца ў аналітычна-філасофскае рэчышча. У цэнтры аповесці «Суд у Слабадзе» – трагічны лёс абяздоленага вайной падлетка. Рэаліі абпаленага вайной маленства прысутнічаюць і ў пазнейшых творах пісьменніка: у раманах «Хроніка дзетдомаўскага саду», «Бунт незапатрабаванага праху».

### Тэма 6. Літаратурны працэс ХХ стагоддзя (лекцыя 4)

Тэрмін «філалагічнае пакаленне» ўзнік у другой пал. 1960-х гг. і меў знешнія прыкметы − большасць прадстаўнікоў скончыла філфак БДУ (калі яшчэ не было журфака). «Філалагічнае пакаленне» загаварыла ўголас пра культуру творчасці, узбагаціла зведзеную да прымітывізму моўную практыку за

кошт багаццяў народнай мовы. Да «філалагічнага пакалення» адносяцца пісьменнікі У. Караткевіч, Н. Гілевіч, Р. Барадулін, І. Пташнікаў, В. Зуёнак, М. Стральцоў, І. Чыгрынаў, Я. Сіпакоў, Г. Бураўкін, А. Вярцінскі і інш.

***Уладзімір Караткевіч*** *(1930–1984)*

Нарадзіўся ў Оршы ў сям'і служачага. Перад пачаткам вайны У. Караткевіч быў у Маскве, у студэнткі-сястры, такім чынам апынуўся ў дзіцячым доме. Некалькі разоў уцякаў на фронт. Доўгі час не ведаў пра лёс бацькоў. У жніўні 1943 г. разам з сястрой дабраўся да Арэнбурга, дзе ў эвакуацыі жылі бацькі. У 1944 г. разам з маці апынуўся ў Кіеве. У 1954 г. скончыў філалагічны факультэт Кіеўскага ўніверсітэта імя Шаўчэнкі. З 1962 г. жыў у Мінску. Зборнікі паэзіі: «Матчына душа» (1958), «Вячэрнія ветразі» (1960), «Мая Іліяда» (1969), «Быў. Ёсць. Буду» (1986). Зб. прозы: «Блакіт і золата дня» (1961), «Чазенія» (1970), «Вока тайфуна» (1974). П'есы: «Званы Віцебска» (1977), «Кастусь Каліноўскі», «Маці ўрагану», «Калыска чатырох чараўніц». Прарочай аказалася назва апошняй паэтычнай кнігі пісьменніка «Быў. Ёсць. Буду».

Тэматыка вершаў У. Караткевіча разнастайная. У яго чатырох зборніках ёсць цудоўныя прыродаапісальныя вершы («Лісце», «Бацькаўшчына», «***У векавечнай бацькаўшчыне клёны» і інш.), вершы-прызнанні ў любові да роднай зямлі («Мокрыя травы», «Беларуская песня», «На Беларусі Бог жыве» і інш.), вершы інтымнай лірыкі («***За старым, закінутым млынам», «Цягнікі заспявалі, заплакалі», «Зімняя элегія», цыкл у трэцім зборніку «Калі памірае каханне»). У лірыцы паэта шырока прадстаўлена тэма горада – «Орша», «Размова з Кіева-Пячорскім сланом», «Вільня ў дождж», «Панна Варшава» і інш.

Самы ранні перыяд гісторыі народа знайшоў увасабленне ў рамане «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», аповесцях «Сівая легенда», «Ладдзя Роспачы», «Легенда аб бедным д'ябле і адвакатах Сатаны». Гэта – эпоха Адраджэння на землях Беларусі, XVI стагоддзе. Зварот да эпохі Рэнесансу невыпадковы, бо менавіта яна аказалася прыдатным матэрыялам для пастаноўкі і асэнсавання

філасофскіх, маральных, псіхалагічных праблем, актуалізаваных у другой палове XX ст.

Самае «любімае» стагоддзе У. Караткевіча – XIX, у якім «прапісаны» героі рамана «Каласы пад сярпом тваім», аповесцей «Зброя», «Дзікае паляванне караля Стаха», драмы «Кастусь Каліноўскі», апавяданняў «Паляшук», «Кніганошы», пралога да рамана «Нельга забыць», вядомага пад назвай «Паром на бурнай рацэ».

Пісьменнік меў адрозны ад савецкай гістарыяграфіі погляд на ролю шляхты. Прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя ён разглядаў як частку нацыі, адкрыта сімпатызаваў тым з іх, хто заставаўся сынам сваёй зямлі, не парываў сувязей з народам. Такімі з'яўляюцца Раман Ракутовіч з «Сівой легенды», Міхал Яноўскі з «Цыганскага караля», Гервасій Выліваха з «Ладдзі Роспачы», многія героі рамана «Каласы пад сярпом тваім». Гэта эліта, інтэлект нацыі, бо ў яе асяроддзі стваралася і яе намаганнямі распаўсюджвалася навука, пісьмовая культура, нараджаліся ідэі адраджэння дзяржаўнасці, вызвалення народа з-пад сацыяльнага прыгнёту. Аднак героі-шляхціцы ў творах У. Караткевіча моцныя тады, калі іх падтрымлівае народ.

Аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха» з'яўляецца адным з самых ранніх і самых вядомых твораў У. Караткевіча. Гэтым творам пісьменнік уводзіў у беларускую літаратуру жанр гістарычнага дэтэктыву. Падзеі, якія адбываюцца ў 80-я гады XIX і на пачатку XVII ст., трымаюць у напружанні ад першай да апошняй старонкі. Аднак мэта У. Караткевіча была не ў тым, каб прымусіць чытача суперажываць мужным, сумленным, знешне і ўнутрана прыгожым персанажам у іх змаганні з сіламі зла. У аповесці пісьменнік паказаў пачварны і трагічны зыход з гістарычнай арэны беларускай шляхты.

Беларускі пісьменнік шмат зрабіў, каб сфарміраваць у чытача ўяўленне пра штодзённае жыццё нашых продкаў (шляхты і сялян, гараджан і вяскоўцаў), пра іх культуру, працу, быт, барацьбу з ворагам, пра выгляд старажытных беларускіх гарадоў і селішчаў. Дзякуючы яго творам, мінулыя эпохі ў іх беларускім варыянце пачалі набываць канкрэтныя абрысы. У. Караткевіч,

імкнучыся да дакладнасці ў перадачы вобліку эпохі, пакідаў за сабой права змяняць рэчаіснасць у адпаведнасці з задумай і ідэяй твора. Яго аповесці, раманы, п’есы, нягледзячы на часта драматычны характар узноўленых падзей, маюць адносна шчаслівы канец. Такое вырашэнне сацыяльна-грамадскіх і асабіста-чалавечых канфліктаў магчыма тады, калі сюжэт не прывязаны да рэальных гістарычных сітуацый.

У канцы 1960-х – 1970-я гады У. Караткевіч шмат падарожнічаў: са здымачнымі групамі кінадакументалістаў (па яго сцэнарыях было знята некалькі фільмаў), як член экспедыцыі «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», у складзе пісьменніцкіх дэлегацый – што, аднак, не перашкаджала яму актыўна і плённа працаваць. З’явіліся аповесці «Чазенія», «Лісце каштанаў», зборнікі апавяданняў «Вока тайфуна», «З вякоў мінулых», раман «Чорны замак Альшанскі», п’есы «Званы Віцебска», «Кастусь Каліноўскі», «Маці ўрагану», «Калыска чатырох чараўніц». У тым жа 1967 г., калі вырашаўся лёс кнігі «Каласы пад сярпом тваім», пісьменнік працаваў над сцэнарыем фільма «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (сцэнарый не адзін раз перапісваўся). У час здымкаў у Крыме быў створаны вядомы цыкл вершаў «Таўрыда», які ўвайшоў у зборнік «Мая Іліяда». Цалкам завершаны фільм намаганнямі цэнзуры апынуўся на паліцы, і У. Караткевіч на аснове сцэнарыя стварыў раман пра «мужыцкага Хрыста».

***Ніл Гілевіч*** *(1931–2016).* Народны паэт (1991) Беларусі Ніл Гілевіч нарадзіўся 30 верасня 1931 г. у вёсцы Слабада Лагойскага раёна Мінскай вобласці. У сям’і Гілевічаў было васьмёра дзяцей. У 1947 г. Н. Гілевіч паступіў у Мінскае педагагічнае вучылішча. Пасля заканчэння гэтай установы яго як выдатніка без экзаменаў залічылі на філалагічны факультэт Беларускаага дзяржаўнага ўніверсітэта. Потым былі гады вучобы ў аспірантуры, абарона кандыдацкай дысертацыі, дваццаць шэсць гадоў працы выкладчыкам кафедры беларускай літаратуры БДУ. З 1980 па 1989 г. Н. Гілевіч на пасадзе першага сакратара праўлення СП БССР. У гады перабудовы ён узначальвае рэспубліканскае Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны, пастаянную

Камісію Вярхоўнага Савета БССР па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны, меў іншыя важкія грамадскія пасады і абавязкі. Памёр 29 сакавіка 2016 г.

Першы надрукаваны верш «Яблынька» −1946 г. (часопіс «Бярозка»). Першы зборнік «Песня ў дарогу» – 1957 г. 1959 г. – «Прадвесне ідзе па зямлі». Крытыкі адзначалі няпросты ўваход у літаратуру пакалення Н. Гілевіча – тых пісьменнікаў, якія пачалі друкавацца ў 1940-х – пачатку 1950-х гг. (А. Лойка, М. Арочка, С. Гаўрусёў). Сярод вершаў гэтага перыяду ў Н. Гілевіча ёсць творы пра шчаслівае бесклапотнае жыццё, пра цуда-ўраджаі. З сумам і гаркотай паэт скажа пра ўласны адыход ад жыццёвай праўды ў паэме «Сто вузлоў памяці».

У многіх вершах, паэмах, вершаваных апавяданнях і аповесцях («Ты кажаш, я не ведаю вайны…», «Зямля бацькоў, Лагойшчына мая...», «А раніцы ўжо не было», «Недзяленя», «Сто вузлоў памяці» і інш.), у аўтабіяграфічнай кнізе «Перажыўшы вайну» пісьменнік звяртаецца да гераічных і трагічных падзей мінулай вайны, вядомых яму не з чужых слоў. Успаміны пра той час ажывуць таксама ў 1960-я г. у «маленькай аповесці» «Заручыны», праз тры дзесяцігоддзі – у рамане «Родныя дзеці».

Паварот да надзённасці, да жыццёвай праўды адбываецца ў зборніках 1960-х гг. «Неспакой», «Бальшак», «Перазовы». Паэта трывожыць становішча вёскі, яе старэнне, неразумныя адносіны да прыроды (вершы «Раўняюць хлопцы рэчку», «Даруйце, родныя палі і гоні», інш.) У вершы «Пра дзядоў і зямлю» – трывога за тое, што маладыя пакідаюць вёску. У вершы «Ах, якая над Гайнай купальская ноч!..» уздымаецца праблема пераемнасці народных традыцый.

Н. Гілевіч добра ведаў вусную народную творчасць, з’яўляўся даследчыкам і збіральнікам беларускага фальклору, шмат гадоў выкладаў гэту дысцыпліну студэнтам БДУ. Навуковыя кнігі «Наша родная песня», «З клопатам пра песню народа», «Паэтыка беларускай народнай лірыкі».

Праз усю творчасць Н. Гілевіча прыходзіць тэма роднай мовы (верш 1947 г. «Родная мова», пазнейшыя «Мова майго народа», «Мара Скарыны» і інш.).

У 1980–1990-я гг. Н. Гілевіч актыўны абаронца роднай мовы. У гэты перыяд творчасці пераважае лірыка публіцыстычная.

Лірыка Н. Гілевіча моцна прывязана да Лагойшчыны, малой радзімы пісьменніка. Тэма малой радзімы з’яўляецца скразной у творчасці і раскрываецца яна шматаспектна, living рознабакова. Адзін з аспектаў – прыродаапісальныя вершы, якія маюць выразны патрыятычны змест. Шмат іх ў зборніку лірычных мініяцюр «Актавы» (1976).

Зборнікі канца 1980–1990-х гг.: «Адраджэнне», «Жыта, сосны і валуны», «Талісман», «На высокім алтары».

Паэзія Н. Гілевіча тэматычна і стылёва рознапланавая. У ёй спалучаюцца грамадзянская мужнасць, устурбаванасць сённяшнім днём і сцішаны, мяккі лірызм, гарачае захапленне прыгажосцю і такое ж гарачае непрыняцце заганных з’яў, роздум над складанасцю, неадназначнасцю жыцця і дыдактызм, павучальнасць.

Аўтар некалькіх сатырычных зборнікаў («Званковы валет», «Да новых венікаў» і інш.).

«Родныя дзеці» – першы ў нашай літаратуры раман у вершах. Форма твора наклала адбітак на змест. Вершаваная мова і ў эпічным творы застаецца лаканічнай, вобразнай, эмацыянальна афарбаванай, інфармацыйна насычанай. У параўнаўча невялікім па памеры творы пісьменнік змог сказаць пра многія сучасныя маральна-этычныя, сацыяльныя, экалагічныя праблемы, стварыць галерэю непадобных чалавечых характараў. Кампазіцыя рамана «Родныя дзеці» ўскладняецца лірычнымі адступленнямі, у якіх слова бярэ аўтар. Іх шэсць, і кожнае адступленне мае сваю тэму і праблему, што пашырае і паглыбляе праблематыку твора. Праз лірычныя адступленні раскрываецца вобраз аўтара, выяўляюцца яго адносіны да Бацькаўшчыны, яе мінулага і сучаснасці, да народнай спадчыны, да мастацтва і літаратуры. Пазіцыя пісьменніка па-грамадзянску прынцыповая, разам з тым ён зыходзіць з нормаў народнай маралі і этыкі.

***Рыгор Барадулін (1935–2013).*** Нарадзіўся на хутары Верасовачка Ушацкага раёна. У 1939 г. сям'я перабралася ў мястэчка Ушачы. У гады Вялікай Айчыннай вайны бацька змагаўся ў партызанскім атрадзе і загінуў у час блакады. Хату немцы спалілі перад адступленнем. Пасля заканчэння Ушацкай сярэдняй школы (1954) – вучоба на філфаку БДУ. У год яго заканчэння (1959) выйшаў першы зборнік паэта «Маладзік над стэпам».

Р. Барадулін вельмі пладавіты творца. Калі ўлічваць зборнікі сатыры і гумару (а паэт з поспехам карыстаецца і гэтымі жанрамі), то пасля «Маладзіка над стэпам» новыя кнігі ў яго з'яўляюцца амаль кожны год. «Рунець, красаваць, наліваццa», 1961; «Нагбом», 1963; «Неруш», 1966; «Адам і Ева», 1968; «Лінія перамены дат», 1969; «Вяртанне ў першы снег», 1972; «Рум», 1974; «Абсяг», 1978; «Вечалле», 1980; «Амплітуда смеласці», 1983; «Маўчанне перуна», 1986, «Самота паломніцтва», 1990; «Евангелле ад Мамы», 1995. Адзін з апошніх зборнікаў – «Ксты». Даведнік «Беларускія пісьменнікі» (1994 г.) называе яшчэ восем кніг гумару і сатыры і дзесяць зборнікаў паэзіі для дзяцей. У творчым набытку пісьменніка таксама некалькі паэм: «Трыпціх», «Вяртанне ў першы снег», «Балада Брэсцкай крэпасці», «Блакада», «Смаргонская акадэмія», «Самота паломніцтва», «Аблачына-самабранка», «Удакладненні да асабовага ліста па ўліку партызанскіх атрадаў», «Буслова нарачонка» і інш. Некаторым з іх аўтар дае арыгінальныя жанравыя вызначэнні: «Смаргонская акадэмія» – наравістая паэма, «Удакладненні да асабовага ліста па ўліку партызанскіх атрадаў» – паэма смутку, «Буслова нарачонка» – паэма кону.

Вобраз дома ў лірыцы Р. Барадуліна асацыіруецца з радзіннай вясковай хатай, а не з гарадской кватэрай (вершы «Трэба дома бываць часцей», «Наведвайце бацькоў...»).

Вобраз маці, памяць пра маці асабліва шырока прысутнічае ў апошніх па часе кнігах «Маўчанне перуна», «Самота паломніцтва», «Міласэрнасць плахі». Зборнік 1995 г. мае назву «Евангелле ад Мамы» (Евангелле тут у значэнні запавет, скарбніца мудрасці, маралі, этыкі). Лёсам Р. Барадуліну было наканавана гаварыць і пісаць пра «матчыну хату» (хата, зробленая рукамі

бацькі, згарэла ў вайну). Гэты вобраз глыбока раскрываецца ў паэме 1960-х гадоў «Трыпціх». Твор выразна аўтабіяграфічны. У «хату матчыну» імкнецца ва ўспамінах лірычны герой паэмы «Вяртанне ў першы снег».

З маці, з вёскай паэт звязвае родную мову. Верш «Мая мова» быў напісаны ў сярэдзіне 1960-х гадоў, калі «будаўнікі камунізму» загаварылі пра зліццё моў як адзін з этапаў фарміравання новага грамадства. Р. Барадулін, як і П. Панчанка, М. Танк, У. Караткевіч, не мог пагадзіцца з гэтым.

Віцебшчына, радзіма паэта, панесла вельмі вялікія страты ў гады вайны з фашызмам. Пра жыццё ў акупацыі, блакаду, страх Р. Барадулін ведае не з чужых слоў, таму тэма Вялікай Айчыннай вайны займае значнае месца ў яго творчасці (паэмы «Блакада», «Балада Брэсцкай крэпасці», вершы «Віцебшчына», «Гналі роднай зямлёй палонных», «Могільнік вёсак», «Партызанка», інш.). Паэт услаўляе мужнасць і гераізм народа, паказвае, што на барацьбу з чужынцам узняліся не толькі людзі, але і дрэвы («Яліна цвіце»). Паэт ганарыцца славай радзімы-партызанкі, радзімы-змагаркі. Аднак у творах ён часцей паказвае трагедыю вайны («Брыдуць глыбокім снегам чараты...», «Вёска Гвазды»).

Яшчэ ў студэнцтве выявілася ў Р. Барадуліна любоў да жывога слова. «З гадамі ўцяміў, што аснова празаіка ці паэта ў сваёй, хатняй мове... Проста, як той бурштын, след шліфаваць кожнае хатняе слова, каб здзіўляла яно сваёй непаўторнай самабытнасцю». За паэтам усталявалася слава ствавальніка аўтарскіх неалагізмаў. Сярод т. зв. аўтарскіх неалагізмаў − вялікая доля слоў мясцовых, дагэтуль не ўжываных у літаратуры. Яны арганічна загучалі ў вершах Р. Барадуліна і надалі свежасці і моцы нашай мове. Паэт плённа выкарыстоўвае народна-песенныя вобразна-выяўленчыя сродкі. Легенды, казкі, прымаўкі, прыказкі, песні арганічна ўваходзяць у яго творчасць (вершы «Чышчу бульбу», «Веды», інш.).

Надзвычай разнастайны рытмічна-інтанацыйны лад вершаў і паэм Р. Барадуліна, выкарыстоўваюцца як традыцыйныя для нашай паэзіі формы арганізацыі вершаванага радка, так і нетрадыцыйныя. Пісьменнік звяртаецца да

верлібра, досыць часта ўжывае ламаны радок, т. зв. лесвічку («Наведвайце бацькоў...», «Вяртанне ў першы снег», «Мая мова»). Класічныя формы (санет, раманс і інш.) ён часта мадэрнізуе. Апошнім часам паэт прапанаваў сваю арыгінальную форму – ясачкі – вершы-трохрадкоўі.

***Міхась Стральцоў*** *(1937–1987).* Нарадзіўся ў в. Сычын Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і настаўнікаў. У 1959 г. скончыў аддзяленне журналістыкі БДУ. Працаваў у рэдакцыях беларускіх перыядычных выданняў («ЛіМ», «Полымя», «Маладосць», «Нёман»).

Пачаў друкавацца ў 1957 г. Зборнікі апавяданняў: «Блакітны вецер», 1962; «Сена на асфальце», 1966. Аповесць «Адзін лапаць, адзін чунь», 1970. Зборнікі паэзіі: «Ядлоўцавы куст», 1973; «Цень ад вясла», 1979; «Мой свеце ясны», 1986. Зборнікі эсэ і літаратурнай крытыкі: «Жыццё ў слове», 1965; «У полі зроку», 1976; «Пячатка майстра», 1986; эсэ «Загадка Багдановіча», 1968.

Раннія апавяданні «Дома», «Восеньскі ўспамін» пазначаны рысамі тонкага псіхалагізму, філасафічнасці, а таксама лірызмам. Сюжэт апавяданняў (сістэма дзеяння ў творы), канфлікт, як адзін з асноўных элементаў сюжэта, своеасаблівыя. Сюжэт малападзейны. Канфлікт унутраны, г. зн. герой супрацьстаіць самому сабе. Згаданыя асаблівасці характарызуюць т. зв. лірычную прозу. Проза М. Стральцова вылучаецца настраёвасцю, эмацыянальнасцю, у ёй амаль адсутнічаюць яркія кантрасныя фарбы, рэзкае супрацьстаянне герояў, падзейная насычанасць сюжэта. Героі большай часткі апавяданняў, а таксама аповесці «Адзін лапаць адзін чунь» знаходзяцца ў канфлікце не са знешнім светам, а са сваім уласным «я».

Як творчую ўдачу маладога пісьменніка крытыкі ў свой час адзначалі апавяданні «Перад дарогай» і «Блакітны вецер». У апошнім адкрыты новы сацыяльны тып – інтэлігент-гараджанін у першым пакаленні. Ён жыве ў горадзе, але востра адчувае сваю вясковую генетычнасць. Адсюль найперш – жыццёвая непрыкаянасць, разлад у думках і пачуццях.

Героі М. Стральцова (апавяданні «Блакітны вецер», «На вакзале чакае аўтобус», «Там, дзе зацішак, спакой», «Сена на асфальце», «Што будзе сніцца»,

«Свет Іванавіч, былы донжуан», «І зноў, зноў горад») сапраўды не задаволены сабой, чагосьці, галоўнага ў жыцці, не дасягнулі, не знайшлі. Некаторыя з іх ужо развіталіся з юнацтвам, маюць сям’ю, але існуюць у стане вечнага пошуку. Ці вінаваты ў гэтым горад? Досыць часта ў герояў М. Стральцова з’яўляецца жаданне яго пакінуць, кудысьці з’ехаць. Здараецца, што яны вяртаюцца ў вёску, нават з думкай застацца там назусім («І зноў, зноў горад», «Там, дзе зацішак, спакой»). Але з вёскі героі апавяданняў ужо нібыта выраслі, яны там адчуваюць сябе гасцямі. Іх вяртанне вяскоўцам незразумелае. У творах М. Стральцова праблема факусіруецца на самім героі. Яны імкнуцца адшукаць душэўны камфорт, пазбыцца сваёй непрыкаянасці. Аднак ні вёска, ні горад самі па сабе ім гэтага прапанаваць не могуць.

У адрозненне ад многіх іншых беларускіх і небеларускіх аўтараў М. Стральцоў імкнуўся парадніць, зблізіць вёску і горад, бачыў у кожным з іх сваё, адметнае і неабходнае сучаснаму чалавеку. Напрамую гэта думка выказваецца героем апавядання «Сена на асфальце». У творы прапанаваны і вобраз-сімвал такога прымірэння – сена на асфальце.

Тэма Вялікай Айчыннай вайны, асабіста перажытай пісьменнікам, стала галоўнай у апавяданні «На чацвёртым годзе вайны».

«Адзін лапаць, адзін чунь» – светлая і горкая аповесць-роздум пра чалавечы лёс на зямлі, пра абавязак чалавека перад жыццём, замешаная на пасляваенным дзяцінстве.

«Смаленне вепрука» – форма апавяданне ў апавяданні. У ім у сціслым выглядзе – тэмы, праблемы, настраёвая гама ўсіх празаічных твораў М. Стральцова.

## Тэма 7. Літаратурны рух канца XX – пачатку XXI стст.

Сучасны літаратурны працэс вылучаюць з сярэдзіны 1980-х гг. Пачала мяняцца грамадска-палітычная сітуацыя ў краіне, з чым у многім звязаны змены і ў літаратуры. Аднак заявілі аб сабе таксама ўласна літаратурныя тэндэнцыі.

Адзін з істотных момантаў развіцця літаратуры – змена пісьменніцкіх пакаленняў. Яна звычайна суправаджаецца пераглядам традыцый, адмаўленнем ад творчых набыткаў папярэднікаў, імкненнем да наватарства. Гэта назіралася выразна ў 1920-я гг. і ў 1980-я. Калі ўваходзіла ў літаратуру пакаленне франтавікоў (1930 – 1940-я гг.), змяняць, па сутнасці, не было каго, бо ад «нашаніўцаў» і «маладнякоўцаў-узвышанцаў» засталося некалькі чалавек. Прыход у літаратуру філалагічнага пакалення (Н. Гілевіч, Р. Барадулін, В. Адамчык, У. Караткевіч, І. Пташнікаў і інш.) па часе аказаўся вельмі блізкім да першых публікацый і першых зборнікаў маладзейшых прадстаўнікоў «франтавога» пакалення (А. Макаёнка, І. Шамякіна, І. Мележа, І. Навуменкі і інш.). Гэтыя пісьменнікі аднолькава супрацьстаялі тэорыі бесканфліктнасці, ідэалізацыі і прыхарошванню жыцця. Новае пісьменніцкае пакаленне, якое актыўна заявіла аб сабе ў 1970-я гг. – А. Разанаў, Я. Янішчыц, Р. Баравікова, В. Іпатава, А. Дудараў, В. Гігевіч, А. Жук, інш., – у сваёй масе абапіралася на традыцыі папярэднікаў. Таму канфрантацыі − старэйшыя – маладыя пісьменнікі − не назіралася. Самым яркім наватарам не толькі ў асяроддзі творцаў, народжаных у першыя пасляваенныя гады, але і ўвогуле ў другой палове ХХ ст. з’яўляецца А. Разанаў.

Сярэдзіна 1980-х гг. характарызуецца актывізацыяй моладзі і ўтварэннем шэрагу нефармальных арганізацый, як у сталіцы, так і за яе межамі, – «Талака», «Тутэйшыя», «Паходня», «Майстроўня», «Світанак», «Маладзік». Члены маладзёжных суполак змагаліся за захаванне беларускай мовы, нацыянальнай культуры, помнікаў гісторыі, за экалогію.

Літаратурная суполка «Тутэйшыя» ўзнікла ў 1987 г., праіснавала да 1992 г. «Гэта былі дзеці перабудовы, якія абвяшчалі гучныя маніфесты, шмат чаго дэкларавалі, браліся, як і «маладнякоўцы» ў 20-я гг., «у рожкі са старымі» (А. Бельскі). Зразумела, час маніфестаў для гэтага пакалення даўно мінуў, паўстае пытанне пра набыткі. Даследчыкі літаратуры вылучаюць празаікаў А. Федарэнку, У. Арлова, А. Наварыча, А. Асташонка, паэтаў Л. Дранько-Майсюка, А. Сыса, А. Пісьмянкова, Л. Галубовіча.

У літаратуры выразна вылучаюцца два этапы, мяжой паміж якімі – сярэдзіна 1990-х. Першы этап характарызуецца публіцыстычнасцю ў паэзіі, грамадзянскім пафасам, зваротам да рэальных фактаў, да раней забароненых тэм, пераасэнсаваннем падзей савецкай гісторыі, пашырэннем тэматыкі і праблематыкі. Ён пазначаны вяртаннем забароненых твораў (Я. Купалы, М. Гарэцкага) і пісьменніцкіх імёнаў (А. Гаруна, В. Ластоўскага, Ф. Аляхновіча, А. Мрыя), знаёмствам з шырокай плынню беларускай эміграцкай паэзіі і прозы.

Паэты актыўна выступалі ў абарону роднай мовы і культуры, дбалі пра нацыянальнае адраджэнне. Асабліва шмат вершаў адраджэнскай тэматыкі ў зборніках канца 1980-х – пачатку 1990-х гг. Н. Гілевіча («На высокім алтары», «Адраджэнне», «Жыта, сосны і валуны»), Р. Барадуліна («Самота паломніцтва», «Міласэрнасць плахі»), П. Панчанкі («І вера, і вернасць, і вечнасць», «Горкі жолуд», «Высокі бераг»).

У паэзіі 1980-х – першай палове 1990-х гг. назіраецца часты зварот да постацей пракаў нацыянальнага Адраджэння, да іх запаветаў, твораў і вобразаў. Да сучаснага чытача вяртаюцца і звяртаюцца Ф. Скарына («Гравюры Скарыны», «Слова да Скарыны» М. Танка і інш.), Я. Купала, М. Багдановіч, П. Багрым, Ф. Багушэвіч, К. Каліноўскі, Г. Леўчык. У зборніку А. Сыса «Пан лес» (1989) можна вылучыць нават спецыфічную жанравую форму – верш-маналог: «Маналог Сяргея Палуяна», «Маналог Уладзіміра Жылкі», «Маналог Язэпа Драздовіча», «Маналог Алеся Гаруна», «Маналог Апанаса Філіповіча» і г.д. У другой палове ХХ ст. гістарычна-мастацкі летапіс жыцця народа стварыў У. Караткевіч, на новым этапе працягваючы традыцыі М. Багдановіча, Я. Купалы, В. Ластоўскага. Актыўна звяртаюцца да гістарычных падзей і асоб А. Лойка, М. Арочка. Цікавасць да мінулага асабліва шырока выявілася ў маладзейшых аўтараў – А. Сыса, А. Пісьмянкова, І. Багдановіч, Л. Рублеўскай, Э. Акуліна і інш. Беларуская мінуўшчына ў творах сучасных паэтаў гераізуецца і рамантызуецца, што сведчыць пра наследаванне традыцый У. Караткевіча (творчасць У. Арлова, В. Іпатавай, К. Тарасава, В. Чаропкі, Л. Дайнекі).

Надзённай і балючай тэмай паэзіі згаданага перыяду была т. зв. чарнобыльская і шырэй – экалагічная тэма. Ідэя верша М. Танка «Пасля аварыі»: на свет сёння нельга глядзець так, як мы глядзелі на яго ўчора.

Вобраз-матыў мёртвай, атручанай чарнобыльскім атамам зямлі часты ў сучаснай паэзіі (творы А. Канапелькі, Л. Дранько-Майсюка, З. Дудзюк, паэмы «Чорная быль», «Зязюля» С. Законнікава, «Одзіум» Я. Сіпакова, К. Жука «Галгофа», «Не хварэй!» Н. Гілевіча, М. Мятліцкага «Няходжанае поле» і інш.).

У прозе першым «чарнобыльскім» творам стала апавяданне І. Пташнікава «Львы». Самыя розныя аспекты трагедыі ўзноўлены ў рамане І. Шамякіна «Злая зорка», аповесцях В. Быкава «Ваўчыная яма», В. Карамазава «Краем белага шляху», В. Казько «Выратуй і памілуй нас, чорны бусел», апавяданні А. Федарэнкі «Бляха». Жорсткія рэаліі паслячарнобыльскага жыцця − у «Чарнобыльскай малітве» С. Алексіевіч. На чарнобыльскую тэму напісаны таксама п'есы І. Чыгрынава «Хто вінаваты», «Толькі мёртвыя не вяртаюцца», А. Ждана «Сылгалі Богу, сылгалі», А. Дударава «Адцуранне», В. Ткачова «Усміхаўся месяц белай вішні», М. Матукоўскага «Бездань».

Гарбачоўская перабудова дазволіла выказацца былым вязням ГУЛАГа. Выйшлі зборнікі С. Грахоўскага («І радасць, і боль»), П. Пруднікава («Позні ягады»), А. Звонака («Светлацені»), С. Новіка-Пеюна («Песні з-за кратаў»). Былі надрукаваны «лагерныя» (напісаныя ў зняволенні і захаваныя часткова ў памяці вязняў) вершы Л. Геніюш (зб. «Белы сон»). Тэму сталінскіх рэпрэсій і т. зв. гулагаўскую (лагерную ці закратную) тэму адкрыла (1986) паэма С. Грахоўскага «Балючая памяць». Былі апублікаваны дакументальна-мастацкія творы Б. Мікуліча («Аповесць для сябе»), Л. Геніюш («Споведзь»), П. Пруднікава («У яжовых рукавіцах»), А. Кавалёва («Колокол мой – правда»). Найшырэй тэма рэпрэсій прадстаўлена ў трылогіі С. Грахоўскага («Зона маўчання», «З воўчым білетам», «Такія сінія снягі»).

Пакутліва шукае адказы на актуальныя для беларусаў пытанні: ці могуць яны адбудаваць свой Дом, ці здольны абараніць і захаваць уласную адметнасць, ці маюць права на Будучыню, Юры Станкевіч (нар. у 1945). Жанрава

разнастайная творчасць пісьменніка ўяўляе сабой роздум над няпростымі праблемамі жыцця свайго народа і ўсёй сучаснай цывілізацыі. «...На гэтай зямлі аб'явіўся народ, які забівае сябе сам і наблізіўся да той здрады, якой, магчыма, яшчэ не ведала людства. <...> Я не разумею, навошта такі народ існуе. <...> Хіба што сцерагчы свае рэкі, лясы, азёры, берагчы жывёл? Але ён не сцеражэ і не беражэ і не імкнецца. Не імкнецца нават імкнуцца», – характарызуе супляменнікаў адзін з герояў аповесці «Псеўда». Гэта абагульненая характарыстыка канкрэтызуецца ў рамане «Любіць ноч – права пацукоў», у творах «Прузі», «Збіральнік страху», «Бесапатам», «Армагедон – 1895», «Зямля Запаветная».

Інтэнсіўны пошук нетрадыцыйных мастацкіх шляхоў нярэдка адбываецца пры поўным адмаўленні ад нацыянальнай і класічнай традыцый. Сярод пачаткоўцаў (і не толькі) шырыцца колькасць прыхільнікаў постмадэрнізму: маладыя і маладзейшыя аўтары арыентуюцца на тую плынь у заходнееўрапейскай літаратуры, якая зыходзіць з уяўленняў пра закончанасць развіцця мастацтва, пра тупік культуры. Але калі ў амерыканскай, англійскай, французскай, нават у суседняй рускай літаратуры, у якой постмадэрнізм заявіў пра сябе пазней, у другой палове XX ст., гэты напрамак мае свой «твар», то нашы прэтэндэнты на «самае сучаснае мастацтва» часта задавальняюцца звычайным эпатажам. Такімі, прынамсі, уяўляюцца «перформансы» і іншыя публічныя выступленні сяброў «Бум-Бам-Літа» – літаратурнай групоўкі, якая абвясціла аб сваім існаванні ў 1995 г. гучным біццём у стары пакарабачаны таз. Як тлумачыць эсэіст і даследчык літаратуры Ю. Барысевіч, «назва «Бум-Бам-Літ» нарадзілася з назвы змакетаванага, але так і не надрукаванага зборніка авангардных тэкстаў «Неа-літ» і гукаў алюміневага тазіка – рэінкарнацыі першабытных тамтамаў і шаманскіх бубнаў – які скарыстоўваўся ў якасці гонга на нашых першых канцэртах».

Нашы авангардысты (маюцца на ўвазе найперш бумбамлітаўцы) добра засвоілі адзін з асноўных постмадэрнісцкіх прынцыпаў – моўнай гульні, – яны «гуляюць» з вобразамі, матывамі, сюжэтамі, замацаванымі ў свядомасці

ўяўленнямі, з постацямі і фактамі біяграфіі пісьменнікаў і г.д., вываручваючы іх звыклую сутнасць, свядома робячы стаўку на дэманстрацыю і эпатаж.

Нейкі час бумбамлітаўцы шукалі «альтэрнатыўныя прасторы пісьма», замяняючы друкаваныя тэксты творамі візуальнага, выяўленчага і нават слыхавога «мастацтва», сцвярджалі, што «скасаванне шлюбу з паліграфіяй вяртае літаратарам свабоду ў выбары арфаграфіі, колькасці копій, формы і зместу твораў». Аднак урэшце традыцыйныя формы існавання твораў слоўнага мастацтва – надрукаваныя на старонках часопісаў і ў выглядзе звыклых кніг, – калі і не перамаглі зусім, то, па крайняй меры, занялі свае месца ў творчасці сяброў суполкі поруч з нетрадыцыйнымі. Варта адзначыць, што многія бумбамлітаўцы (З. Вішнёў, І. Сін, В. Жыбуль, А. Бахарэвіч, С. Мінскевіч, У. Гарачка) выступаюць літаратурнымі «шматстаночнікамі» – пішуць паэзію, прозу, а таксама тэарэтычныя маніфесты і праграмы. Пры ўсіх бачных фармальна-змястоўных адрозненнях твораў жанравыя вызначэнні іх досыць умоўныя, паколькі вельмі мала стыкуюцца з распрацаванай пераважна на вопыце рэалістычнай літаратуры сістэмай жанраў.

# Всемирная литература

## Тема 8. Основные тенденции и этапы развития всемирной литературы: эстетические направления, течения, школы

Термином «литературный процесс» обозначается, во-первых, подвижная литературная жизнь определенной страны и эпохи (во всей совокупности ее явлений и фактов), во-вторых, многовековое развитие литературы в мировом масштабе (мировой литературный процесс). Термин применяется как в широком, так и в узком значении. Литературный процесс − историческое развитие мировой литературы в целом и национальных литератур в частности, их связи, взаимодействие, формирование традиций.

Литературный процесс существует как изменение определенных этапов, или периодов, художественно-исторического развития. В определенные эпохи в литературе разных народов возникали общие (подобные и близкие) качества и черты. Русский ученый Г. Поспелов назвал их *стадиальными общностями* национальных литератур. В возникновении стадиальных общностей (конкретизированы национальными особенностями литератур разных народов) исследователь видит основную закономерность мирового литературного процесса. Стадии литературного процесса связываются с определенными этапами истории человечества, которые наиболее отчетливо проявились в западноевропейских (романских) странах. Выделяются литературы *древние*, *средневековые* и литературы *Нового времени* с их собственными этапами. Стадиальные различия между литературами Нового времени и прежними, которые им предшествовали, особых споров не вызывают. Для древних и средневековых литератур характерен синкретизм (сочетание в произведениях функций эстетически-художественных и нехудожественных). Рядом с эстетическими и этическими элементами литературы включали богословские и философские, исторические и правовые, естественные и географические, медицинские, юридические и другие сведения. Литературы Нового времени − явление собственно художествен-

ное (избавились от синкретизма), за редким исключением − это литература индивидуальная, открыто авторская. В словесном искусстве преобладает письменная форма. Литературное развитие приобретает заметный динамизм.

***Литература древних восточных цивилизаций***: шумерско-аккадская (к. 4 – нач. 3 тыс. до н. э. – сказание о Гильгамеше); персидская (IX−VI вв. до н. э., «Авеста»); египетская (3 тыс. до н. э. – IV в. н. э. − «Книга пирамид», «Книга мертвых», дидактическая литература, «Прославление писцов», миф об Осирисе, мистерии, «Герметический свод»); индийская (3 тыс. до н. э. – V в. н. э. − «Махабхарата», «Бхагават-гита», «Рамаяна»); китайская (XV в. до н. э. – V в. до н. э. – «Книга перемен», «Книга песен», конфуцианский и даосский каноны).

***Античность*** в широком и узком понимании (древность − в узком смысле, в широком смысле − классическая античность – культура Древней Греции и Древнего Рима). Античная литература создавалось древними греками и римлянами, которые жили в условиях рабовладельческого строя, в течение тысячелетия: с VII в. до н.э. по III в. н.э. Наивысший расцвет древнегреческой литературы в VI−IV вв. до н.э. Написаны поэмы Гомера, заявили о себе поэты-лирики Алкей, Пиндар, Сапфо, Анакреонт. Афинские драматурги Эсхил, Софокл, Еврипид, Аристофан. Расцвет римской литературы в I в. до н.э. Поэты Вергилий, Гораций, Овидий и др. Основные черты: литература в основной массе мифологическая по своей образности, почти полностью стихотворная по форме. Писатели усваивали современную им реальную жизнь как данное в своей сути богами и героями. Возникают многие жанры всех трех литературных родов (поэма, роман, трагедия, комедия, ода, элегия, дифирамбы и др.). Начинает складываться наука о литературе.

***Средневековье*** (IV−V в. − XV в.) – традиции народного творчества, культурное влияние античного мира и христианства. *Периодизация средневековой литературы:* 1) раннее Средневековье начинается с падения Римской империи и охватывает промежуток с V по X века. В литературе этот период представлен архаическим эпосом; 2) зрелое Средневековье (XI – XII вв.). В это время актив-

но развиваются героический эпос и рыцарская литература; 3) позднее Средневековье (XII – XVI) Расцвет городов и, следовательно, городской литературы. Далее Средневековье сменяется Ренессансом (начало XIV- начало XVII вв.). Черты общности присутствуют в развитии европейских литератур раннего Средневековья (с V по X вв.). Правда, с V по VIII вв., «эпоха великого переселения народов», были малопродуктивными для литературы и, по существу, выпадают из рассмотрения.

Мировоззрение человека эпохи позднего Средневековья или, как его называют сегодня, ренессансного (возрожденческого) гуманизма, существенно отличается от предыдущих исторических периодов. Новое мировоззрение было подготовлено крушением сословной замкнутости средних веков, большими географическими открытиями Колумба, Васко да Гама, началом книгопечатания, развитием точных и естественных наук, прорывом в изучение Вселенной, мироздания вообще (открытия в астрономии Д. Бруна, Н. Коперника, Г. Галилея). Возрожденческий гуманизм нес моральное раскрепощение личности от церковных догм, утверждал ее право на инициативу действий, на удовлетворение естественных потребностей и склонностей. Вместе с тем в новом мировоззрении мирно уживались философский материализм, апология «здравого смысла» и мистика, например, вера в козни дьявола. Именно эпоха Ренессанса отмечена кострами инквизиции, на которых горели книги и люди. Среди них − идеолог чешской реформации Ян Гус (1371−1417), народная французская героиня Жанна д’Арк (1412−1431), итальянский философ и поэт Джордано Бруно (1548−1600).

***Возрождение*** (XIV − XVII вв.) − конкретно-историческая литературная эпоха и парадигма в развитии национальных литератур в разные исторические времена. В развитии культуры Ренессанса выделяют три периода: Ранний Ренессанс (Петрарка, Боккаччо, Альберти); Высокий Ренессанс (Леонардо да Винчи, Микеланджело, Рафаэль, Франсуа Рабле); Поздний Ренессанс (Шекспир, Сервантес).

Эпохами в развитии литературы считаются Ренессанс (XIV – XVII вв.), Просвещение (XVIII в.). В основе литературоведческого понимания эпохи лежит общность философских и эстетических взглядов на построение гармоничного и справедливого общества, на утверждение идеи свободного человека, на определение места искусства в общественной жизни и специфики его сущности. Представители Ренессанса и Просвещения предлагали отличные пути совершенствования общества и человека. Раскрепощение личности, вера в возможности «естественной природы» человека – у первых. У вторых – вера в человеческий разум, в положительное воздействие на человека, на общество в целом научных открытий, просвещения, образования.

Совершенно иное выделение этапов литературного процесса в литературе Нового времени. Формируются и заменяют один другого литературные направления.

*Литературное направление* – совокупность основных идейно-эстетических принципов, присущих многим писателям в течение какого-то значительного временного отрезка. Творческие принципы сформированы в виде теоретических программ и манифестов. Категория направления предусматривает объединение художников на основе единства метода, а также определенную (большую или меньшую) похожесть индивидуальных стилей.

*Барокко* (от итал. barocco, фр. baroque – странный, неправильный) – литературное и общехудожественное направление и стиль. Зародилось в Италии и Испании в середине XVI в. В европейских литературах существовало в XVII–XVIII вв. Термин «барокко» возник в XVIII в. благодаря классицистам, которые видели в нем полностью негативное явление. Сначала им характеризовался стиль в архитектуре. Со временем барокко соотнесли и с другими видами искусства. С конца XIX в. исследователи стали говорить о барокко в литературе. Для барокко как стиля, рожденного переходными эпохами, характерным является разрушение антропоцентричных представлений эпохи Возрождения, доминирования божественного начала в его художественной системе.

Стиль барокко вобрал в себя философские и морально-этические представления об окружающем мире и месте человеческой личности в нем. Среди виднейших писателей европейского барокко – испанский драматург П. Кальдерон, итальянские поэты Марино и Тассо, английский поэт Д. Донн, французский романист О. Дъюрфе и некоторые другие. Барочные традиции нашли дальнейшее развитие в европейских литературах XIX–XX ст. В XX ст. появилось и литературное течение необарокко, которое связывают с авангардной литературой начала XX ст. и постмодерной конца XX ст.

*Классицизм* (фр. classicisme, от лат. classicus — образцовый) – литературное направление, возникшее в XVII в. во Франции и существовавшее в литературе Европы до середины XIX в. В творчестве писателей-классицистов царит культ «классиков» (прежде всего – античных), культ разума, нормативность и регламентированность. Основные его приметы определялись в соответствии с драматической теорией XVII века и с основными идеями трактата Н. Буало «Поэтическое искусство» (1674). Классицизм рассматривался как направление, ориентирующееся на античное искусство. В определении классицизма выделяли прежде всего стремление к ясности и точности выражения, равнение на античные образцы и строгую подчиненность правилам. В эпоху классицизма обязательными были принципы трех единств (единство времени, единство места, единство действия), которые стали условным обозначением трех правил, определяющих организацию художественного времени, художественного пространства и событий в драматургии.

*Сентиментализм* (от французского sentiment – чувство) – литературное направление второй половины XVIII – нач. XIX в. Не все исследователи выделяют сентиментализм в качестве самостоятельного направления. Многие называют его предромантизмом. Характеризуется стремлением воссоздать мир чувств простого человека и вызвать сочувствие к героям у читателя. Термин произошел от названия романа английского писателя Лоренса Стерна «Сентиментальное путешествие по Франции и Италии» (1768). По сравнению с классицизмом сентиментализм был более прогрессивным направлением, ибо в нем

были ощутимы элементы реализма, связанные с изображением человеческих эмоций, переживаний, расширением внутреннего мира человека

Поскольку сентиментализм провозглашал право писателя на проявление в искусстве своей авторской индивидуальности, в сентиментализме возникают жанры, способствующие выражению авторского «я», а значит, использовалась форма повествования от первого лица: дневник, исповедь, автобиографические мемуары, путешествие (путевые записки, заметки, впечатления). В сентиментализме на смену поэзии и драматургии приходит проза, которая располагала большей возможностью для передачи сложного мира душевных переживаний человека, в связи с чем возникли новые жанры: семейный, бытовой и психологический роман в форме переписки, «мещанская драма», «чувствительная» повесть, «буржуазная трагедия», «слезная комедия»; получили расцвет жанры интимной, камерной лирики (идиллия, элегия, романс, мадригал, песня, послание), а также басня.

*Романтизм* (по-французски romantique, по-английски romantic) − литературное направление, возникшее в конце XVIII в., существовал в литературах Европы и Америки в первой половине XIX в. Основной художественный принцип романтизма – принцип пересоздания и преображения реальности. Романтики показывают жизнь не такой, какой её можно увидеть, они открывают скрытую её мистическую, духовную сущность, как они её понимают. Правда окружающей нас реальной жизни для любого романтика – это скучно и неинтересно. Писатели эпохи романтизма делают упор на то, что главная ценность в жизни – личность человека. Каждая личность – это отдельный мир, полный удивительной красоты. Именно оттуда черпается все вдохновение и возвышенные чувства, а также появляется склонность к идеализации.

Основным является конфликт человека с миром. Возникает психология бунтующей личности, которую наиболее глубоко отразил Лорд Байрон в произведении «Путешествие Чайльд-Гарольда». Романтических героев объединяет чувство собственной исключительности. «Я» − это осознается как высшая ценность, отсюда эгоцентризм романтического героя. Сосредоточившись на себе,

человек вступает в конфликт с действительностью. Действительность − это мир странный, фантастический, необыкновенный, как в сказке Гофмана «Щелкунчик», или уродливый, как в его сказке «Крошка Цахес». В этих сказках происходят странные события, предметы оживают и вступают в пространные беседы, основной темой которых становится глубокий разрыв между идеалами и действительностью. И этот разрыв становится основной темой лирики романтизма.

*Реализм* (от позднелат. keālis − вещественный) – направление в литературе и искусстве, ставящее целью правдивое воспроизведение действительности в ее типических чертах. Термин «реализм» имеет несколько отличительных значений (реалистический метод, стиль, направление). Реалистическое направление в литературе заявляет о себе в 1830-е гг., когда «принцип жизненно-правдивого воссоздания мира утвердился с наибольшей полнотой, в наиболее развитых формах» (А. Аникст). Молодой реализм порубежной эпохи обладал всеми признаками преобразующегося, идущего и обретающего истину искусства, причем его создатели шли к своим открытиям путем субъективных мироощущений, раздумий, мечтаний. Для реализма характерно художественное изображение жизни в образах, соответствующее сути явлений самой жизни. Реальность является средством познания человеком себя и окружающего мира. Типизация образов достигается через правдивость деталей в конкретных условиях. Реализму присуще стремление рассматривать действительность в развитии, способность обнаруживать развитие новых социальных, психологических и общественных отношений. Даже при трагическом конфликте искусство жизнеутверждающее. К самым известным и выдающимся представителям реализма относятся Стендаль, Ч. Диккенс, О. Бальзак, Л. Н. Толстой, Г. Флобер, М. Твен, Ф. М. Достоевский, Т. Манн, М. Твен, У. Фолкнер и др.

*Модернизм* (от лат. modernus — «современный, недавний») − общий термин для многих литературных направлений и школ конца XIX и XX вв. Свойственно формотворчество, экспериментирование, обращение к средствам условности, антиреалистическая направленность. Новизна и антитрадиционализм − определяющие черты модернизма. Вместе с тем модернизм никогда не пory-

вает с литературной традицией полностью. Основной задачей модернизма является проникновение в глубины сознания и подсознания человека, передача работы памяти, особенностей восприятия окружающего, в том, как в «мгновениях бытия» преломляется прошлое, настоящее и провидится будущее. Основным приемом в творчестве модернистов становится «поток сознания», позволяющий запечатлеть движение мыслей, впечатлений, чувств. Модернистские писатели видят себя как авангард, откинувший буржуазные ценности, и заставляют читателя задуматься, применяя сложные новые литературные формы и стили. Писатели экспериментировали с формами, способами, приемами, техниками, чтобы дать миру новое звучание, но темы их оставались вечными. Чаще всего это проблема одиночества человека в разноцветном мире, несовпадение его собственного темпа с темпом окружающей действительности. Основоположниками модернизма являются М. Пруст «В поисках утраченного времени», Дж. Джойс «Улисс», Ф. Кафка «Процесс». Этапы истории литературы, предваряющие модернизм, – декадентство и авангардизм, иногда рассматривают в качестве ранних стадий модернизма. Модернизм объединяет различные течения и идеи (импрессионизм, символизм, экспрессионизм, футуризм, дадаизм, акмеизм, экзистенциализм и др.), но общим для всех его представителей остаётся вера в то, что современный человек оторван от общества, в котором он живёт, от окружающего мира, он замкнут, одинок, постоянно ощущает свою беспомощность и абсурдность своего существования.

*Постмодернизм* (фр. *postmodernisme* − после модернизма) − термин, обозначающий структурно сходные явления в мировой общественной жизни и культуре второй половины XX−XXI вв. Термин употребляется как для характеристики постнеклассического типа философствования, так и для комплекса стилей в художественном искусстве. Постмодерн − состояние современной культуры, включающее в себя своеобразную философскую позицию, допостмодернистское искусство, а также массовую культуру этой эпохи. В переводе с немецкого постмодернизм означает «то, что следует после модерна». Как это часто случается с «изобретенной» в XX в. приставкой «пост» (постимпрессио-

низм, постэкспрессионизм), термин постмодернизм указывает как на противопоставление модерну, так и на его преемственность. Таким образом, уже в самом понятии «постмодернизм» отразилась двойственность (амбивалентность) породившего его времени. Неоднозначны, зачастую прямо противоположны и оценки постмодернизма его исследователями и критиками.

Литература постмодернизма, по сути, является антилитературой, так как преобразует бурлеск, гротеск, фантастику и иные литературные формы и жанры в антиформы, несущие в себе заряд насилия, безумия и апокалиптичности и превращающие космос в хаос. По убеждению теоретиков постмодернизма, язык, вне зависимости от сферы своего применения, функционирует по своим законам. Мир постигается человеком лишь в виде той или иной истории, рассказа о нем или, иными словам, в виде «литературного» дискурса (от латинского discurs – «логическое построение»).

## Тема 9. Античная литература

*Понятие об античности* – термин «античность» характеризует культуру Древней Греции и Древнего Рима, употребляется с XV в., когда итальянские гуманисты разделили прошлое и настоящее человечества на Античность (древнюю эпоху), Средние века и Новое время.

*Хронологические рамки античной литературы* охватывают период IX−VIII вв. до н. э. − V в. н. э. включительно.

*Значение античной литературы* для мирового литературного процесса: оказала огромное влияние на развитие европейской литературы, в ее русле зародились и оформились такие науки, как теория литературы, историческая наука, теория красноречия, философские учения, филология, грамматика, все стихотворные размеры носят греческие наименования: ямб, хорей, дактиль, анапест и амфибрахий.

*Греческая литература архаического периода (VIII−VI вв. до н.э)*

*Истоки древнегреческой литературы*: возникла и сформировалась на базе устного народного творчества, где наиважнейшую роль сыграла древнегре-

ческая мифология. *Мифы* – произведения устного народного творчества, в которых отражаются наивные фантастические представления людей об окружающем мире – о его происхождении, о природе, об устройстве общества. Греческие мифы содержат рассказы о богах, созданных по образу и подобию людей; на богов и героев греки перенесли все черты их собственной земной жизни (антропоморфный политеизм).

***Гомеровский эпос (VI в. до н. э.)*** и его главные черты: *метонимичность* (обозначение предмета или явления по одному из его признаков, замена предмета его частью), *эпичность*, *описательность, соотнесенность с мифологической системой, связь с фольклорными средствами.*

*Поэмы «Илиада» и «Одиссея»*

***«Илиада»*** (тема – Троянская война, идея – закономерность победы в этой войне греков, поддерживаемых олимпийскими богами; две сюжетные линии – земная и небесная, две системы образов – людей и богов: главный герой греков Ахилл, предводитель греческих войск Агамемнон, воин троянцев Гектор, боги Зевс, Фетида, Аполлон, Афродита).

***«Одиссея»*** (тема – возвращение Одиссея на родной остров Итаку к жене Пенелопе и сыну Телемаку после победы греков над троянцами; меньше по объему, больше места отведено мифологическим существам – олимпийские боги, сирены, Скилла и Харибда, циклоп Полифем, волшебница Цирцея, нимфа Каллипсо; Одиссей показан героем, способным противостоять богам и чудовищам). Образ Одиссея и его символическое понимание в литературе XX в. Художественные особенности произведений.

**Формы бягучай атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне.** Прымяняюцца такія віды кантролю ведаў, як франтальнае апытванне, дыскусія па праблемных пытаннях, літаратуразнаўчы аналіз тэксту, калёквіум, літаратуразнаўчы дыктант, водзыў на прачытаны твор, рэферыраванне навуковых работ, праверка чытацкіх дзённікаў, выкананне заданняў па самастойнай рабоце, тэсціраванне, складанне храналагічнай табліцы жыцця і творчасці пісьменніка.

**Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне дысцыпліны.** У вучэбным працэсе выкарыстоўваюцца мультымедыйныя сродкі, аўдыя- і відэазапісы, факсімільныя выданні, мастацкія тэксты, вучэбныя дапаможнікі, дадатковая навуковая і вучэбна-метадычная літаратура, слоўнікі і энцыклапедыі. Студэнтам прапануецца рэкамендацыйны спіс літаратуры з улікам новых выданняў і іх наяўнасці ў бібліятэцы Інстытута і Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь.

**Структура зместу вучэбнай дысцыпліны.** У аснову структуравання зместу вучэбнага матэрыялу пакладзены гісторыка-храналагічны прынцып. Па кожнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый праектуюцца і рэалізуюцца канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі. Асноўнымі метадамі (тэхналогіямі) навучання, якія адпавядаюць зместу дысцыпліны «Беларуская і сусветная літаратура», з'яўляюцца: праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне лекцыйнага матэрыялу, часткова – пошукавы і даследчы метад), камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах работы (дыскусія, круглы стол, прэзентацыя, мазгавы штурм, вучэбныя дэбаты, работа ў групах), тэхналогія развіцця крытычнага мыслення праз ацэнку твораў.

*Размеркаванне вучэбных гадзін.* Дысцыпліна разлічана на 232 вучэбныя гадзіны; вывучаецца на працягу першага-трэцяга семестраў. Дзённая форма атрымання адукацыі: 102 аўдыторныя гадзіны, з якіх 56 – лекцыйных, 46 – семінарскіх; 72 гадзіны адводзіцца на падрыхтоўку да 2-х экзаменаў, 58 – на самастойную работу студэнтаў. Завочная форма атрымання адукацыі: 18 аўдыторных гадзін (14 – лекцыйных, 4 – семінарскіх), 72 гадзіны – падрыхтоўка да экзаменаў, 142 – самастойная работа студэнтаў.

Выніковы кантроль ведаў – экзамен у І-ым і ІІІ-ім семестрах.

Па рашэнні складальніка ІІ-і раздзел праграмы («Сусветная літаратура») падрыхтаваны на рускай мове, на якой будзе чытацца.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел І. Беларуская літаратура

### Тэма 1. Літаратура як частка сусветнай мастацкай культуры

Прадмет і задачы курса «Беларуская і сусветная літаратура». Роля дысцыпліны ў працэсе духоўнага ўдасканалення асобы, у развіцці творчага мыслення студэнтаў, у актывізацыі іх навукова-даследчага пошуку.

Узнікненне літаратуры як мастацтва слова. Міф і міфалогія ў працэсе станаўлення і развіцця літаратуры. Старажытныя міфалогіі свету. Славянская міфалогія. Вечныя вобразы антычнай міфалогіі ў беларускім кантэксце. Класіфікацыя відаў культуры. Спецыфіка і прызначэнне літаратуры. Літаратура ў сувязях з іншымі відамі мастацкай культуры (музыка, выяўленчае мастацтва, кінематограф і інш.).

### Тэма 2. Старабеларуская літаратура

Перыядызацыя даўняй беларускай літаратуры, генетычная сувязь паміж перыядамі, асаблівасці развіцця, кантакты з літаратурамі іншых народаў.

Узнікненне славянскага пісьменства. Асветніцкая дзейнасць Кірыла і Мяфодзія. Крыніцы і паходжанне літаратуры ўсходніх славян. Роля хрышчэння Русі і балгарскага пасрэдніцтва. Паняцце літаратурнай трансплантацыі. Тэацэнтрычная сістэма духоўных каштоўнасцей. Спецыфічныя рысы старажытнай літаратуры. Манументальна-гістарычны стыль у літаратуры ранняга Сярэднявечча. Сістэма жанраў. Выдатныя помнікі ўсходнеславянскай літаратуры – царкоўна-рэлігійнай і свецкай, перакладной і арыгінальнай. «Слова пра паход Ігара» – «залатое слова» славянскай паэзіі.

Зараджэнне пісьменства і літаратуры на беларускіх землях. Вядучыя цэнтры кніжнай культуры сярэднявечнай Беларусі. Роля старажытнарускіх традыцый у станаўленні беларускай літаратуры. Творчая спадчына *Кірыла Тураўскага*. Ранняя беларуская агіяграфія. Культурна-гістарычныя ўмовы і асаблівасці развіцця беларускай літаратуры ў эпоху позняга Сярэднявечча. Творчасць *Кіпрыяна і Рыгора Цамблака*. Узнікненне агульнадзяржаўнага беларуска-літоўскага летапісання. Справавое пісьменства. Хаджэнні. Стыль «пляцення славес». Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці. Перадумовы гуманізму.

### Тэма 3. Літаратура эпохі Адраджэння

Асноўныя рэнесансныя ідэі, іх выяўленне ва ўмовах старабеларускай рэчаіснасці. Спецыфіка беларускага Адраджэння. Прадстаўнікі Рэнесансу на землях ВКЛ.

Біяграфія *Ф. Скарыны* ў дакументах і матэрыялах яго часу і ў пазнейшых даследаваннях. Маштабнасць асобы асветніка. Выдавецкая і літаратурная дзейнасць. Светапогляд, грамадскія і эстэтычныя ідэалы. Гісторыка-культурнае значэнне прадмоў і пасляслоўяў Ф. Скарыны. Тлумачэнне першадрукаром

біблейскай сімволікі. Тэматыка і кампазіцыя «Малой падарожнай кніжкі». Мова твораў Ф. Скарыны. Вобраз асветніка і першадрукара ў мастацкай літаратуры XX ст.

Новалацінская паэзія Беларусі. Прычыны ўзнікнення, крыніцы, асаблівасці. «Неаантычны стыль» у паэзіі. Асноўныя жанры. Біяграфічныя звесткі, творчасць *Я. Вісліцкага і М. Гусоўскага*. Кампазіцыя, змест паэмы «Пруская вайна». Зварот Я. Вісліцкага да мінулага Радзімы («сваёй антычнасці»). «Песня пра зубра» М. Гусоўскага – шэдэўр даўняй беларускай літаратуры. Творчая гісторыя, эстэтычны ідэал і сродкі яго мастацкага пераствараэння. Сістэма сімвалаў і тропаў. Паэты-новалацінікі П. Раізій, Ф. Градоўскі, Г. Пельгрымоўскі і інш. Падзейны змест, мастацкія асаблівасці героіка-эпічнай паэмы Я. Радвана «Радзівіліяда…».

Рэфармацыйная публіцыстыка. С. Будны, В. Цяпінскі, А. Волан – прадстаўнікі рэфарматарскай плыні на Беларусі. Гуманістычныя погляды і ідэалы *Л. Сапегі*. «Статут Вялікага Княства Літоўскага» 1588 г. як помнік справавога пісьменства, юрыдычнай і публіцыстычнай думкі XVI ст.

Жанравая сістэма літаратуры Адраджэння і Рэфармацыі: паэтычныя жанры, гістарыяграфія, гісторыка-мемуарная літаратура, эпісталаграфія, перакладная белетрыстыка. Узнікненне тэатра і драматургіі.

## Тэма 4. Літаратура XVII – XVIII стагоддзяў

*Барока ў беларускай літаратуры.* Адметнасць светапоглядных арыенціраў, эстэтыкі і паэтыкі мастацтва барока. *М.К. Сарбеўскі* – тэарэтык і практык мастацтва барока на Беларусі. Барока як першы агульнанацыянальны стыль беларускай літаратуры. Перыядызацыя літаратуры барока. Выявы новага літаратурнага стылю ў творах М. Сматрыцкага, Л. Карповіча, А. Філіповіча. Спецыфіка беларускага барока. Прадстаўнікі і творы «высокага», «сярэдняга», «нізкага» барока. Асветніцкая дзейнасць *С. Полацкага* ў Маскоўскай дзяржаве. Агульная характарыстыка паэзіі (кнігі «Вертоград многоцветный», «Рифмологион», сатырычныя вершы і паэмы). Асоба *Ф.У. Радзівіл*. Змест, своеасаблівасць формы яе паэтычных і драматычных твораў. Школьны тэатр і жанравая эвалюцыя беларускай інтэрмедыі. Палемічная літаратура: асноўныя напрамкі, этапы, прадстаўнікі.

*Літаратура эпохі Асветніцтва.* Канчатковы пераход ад сярэднявечных ідэй і мастацкіх форм да ідэй і форм Новага часу. Неспрыяльныя ўмовы для развіцця нацыянальнага мастацтва, станаўлення беларускай нацыі ўвогуле. Пераважна ананімны характар беларускамоўных твораў. Адсутнасць ва ўласнабеларускай літаратуры «высокіх» (трагедыя, ода) і выяўленасць «нізкіх» (інтэрмедыя, камедыя, сатырычная паэзія) жанраў, бурлескная аднастылёвасць мастацтва слова, прычыны гэтага.

Дастаткова шырокая вядомасць і ўплыў на літаратуру Беларусі твораў Вальтэра, Ж.Ж. Русо, А. Радзішчава. Суіснаванне ў літаратуры розных мастацкіх напрамкаў – барока, класіцызму, сентыменталізму. Ідэя абароны Айчыны ў «Песні беларускіх жаўнераў 1794 года». «Авантуры майго жыцця» *С. Пільштыновай-Русецкай*: асаблівасці жанру (раман-біяграфія, раман

прыгод), характарыстыка вобраза галоўнай гераіні, «геаграфія» твора. Старыя (барочныя) і новыя (класіцыстычныя і сентыменталісцкія) тэндэнцыі ў «Камедыі» *К. Марашэўскага*. «Камедыя» як твор новай беларускай літаратуры.

### Тэма 5. Літаратура XIX стагоддзя

*Агульная характарыстыка.* Гістарычныя ўмовы развіцця тагачаснага грамадства. Барацьба польскай і расійскай ідэалогій на Беларусі. Шматмоўнасць. Адсутнасць перыядычных выданняў на беларускай мове. Два асноўныя этапы ў развіцці ўласнабеларускай літаратуры XIX ст., іх прадстаўнікі. Сувязь літаратуры з вуснай народнай творчасцю. Уплыў суседніх літаратур. Паскоранасць у развіцці. Станоўчыя і адмоўныя моманты гэтага працэсу. Праблема творчага метаду. Перыядызацыя.

*Станаўленне новай беларускай літаратуры.* Фарміраванне беларускай нацыі. Перадумовы ўзнікнення новай літаратуры. Вытокі і крыніцы. Літаратурныя ўплывы. Творчасць пісьменнікаў з папярэдняга стагоддзя. Ліцвінскі патрыятызм лідараў рэвалюцыйнага і літаратурнага руху Беларусі. Віленскі ўніверсітэт і яго роля ў адраджэнні беларускай культуры і літаратуры (таварыствы шубраўцаў, філаматаў і філарэтаў). Творчасць сяброў таварыстваў (А. Міцкевіч, Т. Зан, Я. Чачот, І. Дамейка і інш.). Вобраз філамата ва ўяўленні сучаснікаў.

*Ананімная літаратура XIX ст.* Прычыны шырокага бытавання ананімных твораў. Фальклярызацыя арыгінальных (аўтарскіх) тэкстаў. Жанравая шматстайнасць, арыентацыя на вусна-паэтычныя формы. Пафас, падзеі і рэаліі беларускага жыцця ў вершах і гутарках. Гутаркі дарэформеннага і паслярэформеннага часу. «Энеіда навыварат»: праблема аўтарства, ідэйны змест паэмы, сувязь з першакрыніцай. Беларуская «Энеіда» ў кантэксце парадыйных твораў на паэму Вергілія. Месца твора ў новай беларускай літаратуры. Версіі аўтарства паэмы «Тарас на Парнасе». Ідэйная скіраванасць твора супраць афіцыйнай народнасці і славянафільства. Моўна-стылёвыя асаблівасці паэмы.

*Творчасць пісьменнікаў-рамантыкаў.* Ідэйна-эстэтычная праграма філаматаў як пачатак рамантызму ў беларускай літаратуры. Прыярытэтнае становішча паэзіі. Шырокі зварот аўтараў да фальклору. Мастацкае спасціжэнне мінулага народа. Праблема беларуска-польскага двухмоўя.

Пачынальніцкая роля *Я. Чачота* ў стварэнні літаратуры на беларускай мове. Філамацкі перыяд творчасці. Спалучэнне элементаў эстэтыкі класіцызму, сентыменталізму і рамантызму ў польскамоўных баладах. Вершы на беларускай мове. Дзейнасць Чачота-фалькларыста. Факты біяграфіі і творчага шляху *Я. Баршчэўскага*. Пісьменнік пра Беларусь, духоўнае жыццё народа, пра свой твор у прадмове да кнігі «Шляхціц Завальня…». Фальклорныя матывы, сюжэты, вобразы ў творах, іх аўтарская інтэрпрэтацыя. Прытчавы характар апавяданняў пісьменніка. Уклад пачынальніка польскага рамантызму *А. Міцкевіча* ў станаўленне беларускай літаратуры. Ліцвінскі патрыятызм паэта. Легенды і гістарычная праўда пра *П. Багрыма*. Верш «Зайграй, зайграй, хлопча малы…». Трагізм светаадчування лірычнага героя.

*Беларуская літаратурная класіка XIX ст.* Асаблівасці светапогляду *В. Дуніна-Марцінкевіча*. Культурна-асветніцкая дзейнасць. Класічныя і народныя традыцыі ў творчасці пісьменніка. Ідэя класавага міру ў дарэформенны перыяд, перагляд яе на апошнім этапе творчасці. Аналіз вершаваных («Гапон», «Шчароўскія дажынкі», інш.) і драматычных («Ідылія», «Пінская шляхта», «Залёты») твораў пісьменніка. Майстэрства В. Дуніна-Марцінкевіча-камедыёграфа. Значэнне творчасці.

Жыццёвы шлях *Ф. Багушэвіча*. Адраджэнская ідэя, абвостраная сацыяльнасць як адметныя рысы светабачання і зместу твораў пісьменніка. Праблема мастацкага метаду. Змест прадмоў да зборнікаў «Дудка беларуская», «Смык беларускі». Тэматыка, жанравыя, моўна-стылёвыя асаблівасці вершаваных твораў. Пачынальніцкая роля Ф. Багушэвіча ў станаўленні беларускай прозы.

*Творчасць пісьменнікаў-дэмакратаў.* Сувязь польскамоўных твораў *У. Сыракомлі* з жыццём беларускага народа. Праблемнае і стылёвае наватарства вершаў на беларускай мове. У. Сыракомля і літаратурнае асяроддзе. Вобраз «вясковага лірніка» ў творах сучаснікаў і нашчадкаў. Паказ прыгонніцкай рэчаіснасці, вера ў надыход справядлівасці на зямлі як асноўныя тэмы зборніка *В. Каратынскага* «Чым хата багата, тым рада». Паэма «Таміла». Тэма страчанай радзімы ў элегіі «Туга на чужой старане».

Жыццёвы шлях *К. Каліноўскага*. Светапогляд. «Мужыцкая праўда» Яські-гаспадара з-пад Вільні. Асноўныя праблемы, узнятыя ў нумарах газеты. «Пісьмо з-пад шыбеніцы» як запавет К. Каліноўскага беларускаму народу. Верш «Марыська чарнаброва, галубка мая…». Вобраз К. Каліноўскага ў творах пісьменнікаў розных пакаленняў (М. Танк, А. Куляшоў, У. Караткевіч, А. Наварыч, інш.).

*А. Абуховіч* як адзін з заснавальнікаў жанру байкі. Гісторыя напісання і публікацыі мемуараў пісьменніка. Лёс *А. Гурыновіча* і яго твораў. Грамадзянская і прыродаапісальная лірыка паэта. Творчасць на польскай, беларускай і рускай мовах *Я. Лучыны*. Зборнік «Вязанка». Вобраз роднага краю, паэтызацыя прыроднага свету ў лірыцы і ў паэме «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся». Культура паэтычнай творчасці.

*Літаратура мяжы XIX–XX стагоддзяў.* Ажыўленне грамадска-палітычнага і літаратурнага жыцця напрыканцы 1880-х гг. Публіцыстыка. Навуковая дзейнасць Я. Карскага, Е. Раманава, А. Багдановіча, М. Доўнар-Запольскага, інш. Рускамоўныя перыядычныя выданні на тэрыторыі Беларусі. Выхад да чытача кніг на беларускай мове. Праблема польска-руска-беларускага полілінгвізму ў тагачаснай літаратуры. *А. Ельскі*: падзвіжніцкая праца па збіранні і захаванні культурнай спадчыны народа. Дзейнасць рускамоўных пісьменнікаў Беларусі.

**Тэма 6. Літаратурны працэс XX стагоддзя**

Тэндэнцыі і заканамернасці літаратурнага развіцця. Перыядызацыя. Працяг традыцый мінулага стагоддзя і нараджэнне новых. Станаўленне нацыянальнай жанравай сістэмы.

*«Нашаніўскі» перыяд.* Гістарычныя ўмовы развіцця літаратуры на пачатку ХХ ст. Газеты «Наша доля» і «Наша ніва», кансалідацыя творчых сіл на платформе «нашаніўства». Пафас, вядучыя матывы, вобразы беларускай літаратуры пачатку ХХ ст. Развіццё лірычнай паэзіі, зараджэнне нацыянальнага ліра-эпасу, станаўленне прозы і драматургіі. Узнікненне крытыкі і публіцыстыкі, разгортванне перакладчыцкай справы. Паскоранасць літаратурнага працэсу. Засваенне вопыту фальклору. Праблема метаду і стылю. Вядучае месца твораў рэалістычнай скіраванасці. Рамантычныя формы спасціжэння свету. Праявы мадэрнізму.

*Пісьменнікі-пачынальнікі навейшай літаратуры.* Уплыў фальклору на фарміраванне таленту *Ядвігіна Ш.* Гуманістычная скіраванасць сацыяльна-псіхалагічных апавяданняў. Алегарычныя творы, імпрэсіі. Ідэйна-эстэтычныя вытокі творчасці *Цёткі.* Цётка як пачынальніца беларускай палітычнай лірыкі. Элегічная і медытатыўная лірыка перыяду эміграцыі. Цётка-празаік. Вобраз пісьменніцы і рэвалюцыянеркі ў літаратуры і мастацтве.

Шматграннасць творчай асобы *У. Галубка.* Адлюстраванне мінулага і сучаснасці ў п’есах «Ганка», «Пан Сурынта», «Суд», «Пісаравы імяніны», інш. Зварот да розных жанравых формаў. Майстэрства стварэння камедыйных сітуацый. Уклад у станаўленне беларускага тэатра і драматургіі. Літаратурная і тэатральная дзейнасць *Ф. Аляхновіча.* Тэма горада, паказ жыцця інтэлігенцыі ў п’есах «Страхі жыцця», «Цені», «Няскончаная драма» і інш. Зварот да фальклору. Ф. Аляхновіч як пачынальнік «новай драмы» ў беларускай літаратуры. Дакументальна-мастацкая аповесць «У капцюрох ГПУ». Кніга Ф. Аляхновіча ў кантэксце «гулагаўскай» літаратуры.

Ідэйна-творчыя ўстаноўкі *В. Ластоўскага* і дыскусія 1913 г. Жанравая разнастайнасць твораў пісьменніка, іх праблемна-тэматычнае наватарства. Адметнасць мастацкай інтэрпрэтацыі падзей беларускай гісторыі. Месца аповесці «Лабірынты» ў нацыянальнай прозе. Рысы мадэрнізму ў творах пісьменніка. Жыццёвыя «ўніверсітэты» *З. Бядулі.* Адметныя рысы Бядулі-апавядальніка. Тэма мастака і мастацтва ў творчасці. Лірыка перыяду Першай сусветнай вайны. Казачная ўмоўнасць і яе роля ў сюжэтна-кампазіцыйным афармленні аповесці-казкі «Сярэбраная табакерка». Думы аб Беларусі – лейтматыў паэзіі *А. Гаруна.* Вобраз выгнанніка-рэвалюцыянера і вобраз Радзімы ў творах зборніка «Матчын дар». Гісторыя напісання і выдання кнігі. Проза А. Гаруна (І. Жывіцы): жанравая шматстайнасць, праблемна-тэматычнае наватарства.

Уклад у развіццё паэзіі, прозы, драматургіі, крытыкі і літаратуразнаўства К. Каганца, Ц. Гартнага, К. Сваяка, З. Верас, К. Буйло, А. Навіны, С. Палуяна.

*Творчасць пісьменнікаў-класікаў.* Роля *Я. Купалы* ў развіцці беларускай паэзіі і драматургіі. Пераемнасць традыцый папярэднікаў і іх узбагачэнне. Творчая эвалюцыя Купалы-лірыка. Наватарская сутнасць драматычных паэм «Адвечная песня», «Сон на кургане». Праблемы духоўнага абуджэння народа ў паэмах «На Куццю», «На Дзяды». Арыгінальнасць зместу і формы паэмы «Яна і я». Праблематыка, тыпажы п’ес «Паўлінка», «Раскіданае гняздо», «Тутэйшыя».

Майстэрства Купалы-драматурга. 1930-я гады ў лёсе і творчасці Я. Купалы. Лірыка і публіцыстыка перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

Традыцыі рускай літаратуры ў фарміраванні творчай асобы *Я. Коласа*. Дамінантныя матывы і вобразы ў лірыцы. Агульнае і адрознае з Я. Купалам. Паэма «Новая зямля» як этапная з’ява ў творчасці Я. Коласа і ўсёй беларускай літаратуры. Паэма «Сымон-музыка»: канцэпцыя мастака і мастацтва, адметнасць кампазіцыі. Празаічная спадчына Я. Коласа. Эвалюцыя і адметнасць коласаўскага псіхалагізму ў «малой» прозе. Філасофскія навелы-прытчы (зборнік «Казкі жыцця»). Апавяданні «курскага» цыкла. Трылогія «На ростанях».

Нетрадыцыйнасць постаці *М. Багдановіча* ў нацыянальнай літаратуры. Дыскусія 1913 г. і пазіцыя пісьменніка. Праблема красы ў творах «Апокрыф», «Апавяданне аб іконніку і залатару», інш. Творчая гісторыя зборніка «Вянок». Ідэйна-мастацкая цэласнасць кнігі. Паэтычнае майстэрства аўтара. Жанравая і тэматычная навізна прозы. Ідэя «нацыянальнага стылю» ў артыкуле «Забыты шлях». М. Багдановіч – крытык.

Навізна тэматыкі і праблематыкі ранніх твораў *М. Гарэцкага*. Зборнік «Рунь» у кантэксце нацыянальнага эпасу пачатку ХХ ст. Падзеі Першай сусветнай вайны ў асэнсаванні М. Гарэцкім. Творы М. Гарэцкага і пісьменнікаў «страчанага пакалення». Лёс народа ў прозе першых паслярэвалюцыйных гадоў. Апошнія творы пісьменніка («Скарбы жыцця», «Лявоніус Задумекус», «Кіпарысы»): зварот да прытчы, алегорыі, сімволікі. Роля М. Гарэцкага ў развіцці нацыянальнай прозы.

*Літаратурна-грамадскі рух 1920-х – пачатку 1930-х гг.* Грамадска-культурная сітуацыя на Беларусі ў 1920-я гг. Далучанасць да падзей айчынных пісьменнікаў. Стварэнне літаратурных аб’яднанняў «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», інш. Ідэйна-эстэтычныя праграмы арганізацый. Агульная характарыстыка творчасці маладнякоўцаў і ўзвышаўцаў. Іх лёс у 1930-я гг. Уклад у літаратурны працэс пісьменнікаў старэйшага пакалення (Я. Купалы, Я. Коласа, М. Гарэцкага, З. Бядулі, Ц. Гартнага і інш.). Паэзія 1920-х гг.: пафас, матывы, асаблівасці паэтыкі.

*Творчыя індывідуальнасці пісьменнікаў «Маладняка» і «Узвышша».* Месца *М. Чарота* ў літаратурным працэсе 1920-х гг. Вызначальныя рысы лірыкі. Паэма «Босыя на вогнішчы» як твор новай пралетарскай літаратуры. Трагедыя Чарота-мастака. Дыяпазон творчых пошукаў *У. Дубоўкі.* Жанравае наватарства паэмнага трыпціху («Кругі», «І пурпуровых ветразей узвівы», «Штурмуйце будучыні аванпосты!»). Працяг класічных традыцый у паэзіі *У. Жылкі.* Гістарычны лёс Беларусі, адраджэнскія матывы ў творчасці. Танальнасць філасофскай лірыкі. Светапоглядная эвалюцыя лірычнага героя *Я. Пушчы.* Пафас, вобразная спецыфіка твораў «маладнякоўскага» і «ўзвышаўскага» перыядаў.

Адметнасць таленту *А. Мрыя.* Гратэскава-камічны свет персанажаў у рамане «Запіскі Самсона Самасуя». Твор А. Мрыя ў кантэксце сатырычнай прозы 1920–1930-х гг. Мастацкая эвалюцыя *К. Чорнага.* Погляды пісьменніка на чалавека, на гістарычны шлях беларусаў. Майстэрства псіхалагічнага аналізу

ў творах празаіка. Чорны і Дастаеўскі. Праблемна-тэматычнае наватарства, гуманістычны пафас, мастацкія асаблівасці «малой» прозы *М. Зарэцкага.* Раман «Вязьмо» ў кантэксце літаратуры пра калектывізацыю. Этапы творчага шляху *К. Крапівы.* Крапіва – байкапісец. Драматургічная спадчына пісьменніка. Час, канфлікты, характары ў камедыях «Хто смяецца апошнім», «Мілы чалавек», «Брама неўміручасці».

Пошукі і набыткі ў паэзіі, прозе, драматургіі Т. Кляшторнага, П. Труса, М. Лынькова, С. Баранавых, В. Каваля, Л. Калюгі, Б. Мікуліча, Е. Міровіча, В. Шашалевіча і інш.

*Заходнебеларуская літаратура.* Прычыны вылучэння дзвюх літаратур. Адрознасць шляхоў развіцця мастацтва слова ў Заходняй і Усходняй Беларусі. Грамадска-палітычнае жыццё на «крэсах усходніх». Перыядычныя выданні на беларускай мове. Праца ў драматургіі 1920-х гг. Л. Родзевіча і Ф. Аляхновіча. «Віленскі» перыяд у творчасці М. Гарэцкага, У. Жылкі. Асэнсаванне лёсу Бацькаўшчыны, дзяржаўнасці народа публіцыстыкай. Літаратурна-філасофскія эсэ І. Абдзіраловіча «Адвечным шляхам», Сулімы «Гэтым пераможаш!» як падсумаванне духоўнага вопыту нацыі. Этапы развіцця, ідэйна-мастацкія і стылёвыя плыні ў літаратуры Заходняй Беларусі, іх прадстаўнікі. Роля М. Танка ў заходнебеларускай літаратуры.

*Гуманістычны пафас літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны.* Тэма будучай вайны ў савецкай літаратуры і мастацтве канца 1930-х – пачатку 1940-х гг. Прадчуванне народнай трагедыі ў творах айчынных пісьменнікаў (вершы і паэмы П. Панчанкі, А. Куляшова, інш.). Трагічная неадпаведнасць пачатку вайны і ўяўленняў пра яе. Ваенныя дарогі беларускіх пісьменнікаў. Абарваныя вайной жыцці (М. Сурначоў, Л. Гаўрылаў, А. Коршак, З. Астапенка, інш.). Паэтычны зварот Я. Купалы да свайго народа («Беларускім партызанам»). Перавага лірыкі над іншымі родамі літаратуры. Паэтычны летапіс Вялікай Айчыннай вайны: паказ змагання на фронце і на акупіраванай тэрыторыі, жыцця тылу, вызвалення роднай зямлі (лірыка і ліра-эпас П. Броўкі, А. Куляшова, П. Панчанкі, М. Танка і інш.). Узнаўленне падзей вайны ў прозе (творы К. Чорнага, М. Лынькова, І. Мележа) і драматургіі (п’есы К. Крапівы).

*Паэты-класікі савецкага перыяду.* Асоба *П. Броўкі.* Эвалюцыя эстэтычных поглядаў, індывідуальнага мастацкага стылю паэта ў 1930–1940-я гг. «Вечныя» матывы ў кнігах другой паловы 1950–1970-я гг. Аб’ектыўныя і суб’ектыўныя прычыны нерэалізаваных да канца магчымасцей мастака. Этапы творчага шляху *М. Танка.* Праблематыка, мастацкія асаблівасці лірыкі і ліра-эпасу давераснёўскага перыяду. Месца паэмы «Люцыян Таполя» ў літаратуры свайго часу. Вызначальныя рысы лірыкі 1960–1990-х гг. М. Танк – майстар верлібра. Творчы шлях *А. Куляшова.* Панарама народнай трагедыі ў паэме «Сцяг брыгады» і баладах ваеннага часу. «Новая кніга» ў творчым лёсе пісьменніка. Шматстайнасць жанравых форм ліра-эпасу («Цунамі», «Далёка да акіяна», «Варшаўскі шлях», «Хамуціус»). Куляшоў і Твардоўскі. Адметнасць мастацкага голасу *П. Панчанкі.* Творчы ўзлёт паэта ў гады вайны. Аб’екты сатырычнага выкрыцця на розных этапах творчасці. Роздум пісьменніка над

лёсам бацькоўскай зямлі, роднай мовы, будучыняй народа ў зборніках 1980–1990-х гг.

*Абнаўленне рэалізму ў 1960-я гг.* Рэабілітацыя і вяртанне ў літаратурны працэс рэпрэсаваных пісьменнікаў. Паварот у мастацкай творчасці да праўды жыцця, праўды факта. Перагляд адносін да грамадскіх працэсаў, пераасэнсаванне эстэтычных крытэрыяў у паэзіі франтавога пакалення (П. Панчанкі, М. Танка, А. Куляшова, А. Пысіна, К. Кірэенкі і інш.). Сатырычная плынь у лірыцы. «Другое прачытанне» падзей Вялікай Айчыннай вайны. Першыя творы і кнігі прадстаўнікоў філалагічнага пакалення, узнаўленне ў іх асабіста пражытага ў дзяцінстве. Пашырэнне жанрава-тэматычных абсягаў прозы (раманы і аповесці І. Мележа, Я. Брыля, І. Шамякіна, У. Караткевіча і інш.). Інтэнсіўнае развіццё вялікай эпічнай формы. Паглыбленне псіхалагізму. Абнаўленчыя працэсы ў драматургіі. Першыя даследаванні творчасці рэабілітаваных пісьменнікаў. Новае прачытанне нацыянальнай класікі. Узаемадзеянне пісьменніцкіх пакаленняў.

*«Ваенная» і «вясковая» проза 1970–1980-х гг.* Вайна і вёска як магістральныя тэмы ў беларускай літаратуры. Асаблівасці мастацкага прачытання ваенных падзей у творах другой паловы 1940–1950-х гг. Прыход у літаратуру В. Быкава. Палемічнасць творчасці пісьменніка. Рознааспектнасць паказу вайны. Уклад у распрацоўку ваеннай тэматыкі І. Шамякіна, І. Навуменкі, А. Адамовіча і інш. Тэма «абпаленага вайной маленства» ў творчасці Р. Барадуліна, Я. Сіпакова, І. Пташнікава, В. Казько і інш. Працяг распрацоўкі «хатынскай» тэмы. Месца ў прозе пра вайну дакументальнай кнігі А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка «Я з вогненнай вёскі…».

Традыцыі нацыянальнай літаратуры ў паказе жыцця селяніна (класічныя творы Я. Коласа, М. Гарэцкага, К. Чорнага, М. Зарэцкага, І. Мележа, інш.). Узнаўленне жыцця вёскі ў творах ваеннай тэматыкі (раманы і аповесці А. Адамовіча, І. Чыгрынава, В. Адамчыка і інш.). Адлюстраванне лёсу сялянства, роздум над прычынамі вымірання традыцыйнай вёскі ў аповесцях А. Жука, раманах І. Пташнікава, А. Кудраўца, інш. Народныя характары ў творах.

*Творчасць пісьменнікаў франтавога пакалення.* Факты біяграфіі *Я. Брыля.* Узаемадзеянне лірычнага і эпічнага пачаткаў у творчасці. «Малыя» жанры ў мастацкім набытку празаіка. Праблемнае, жанрава-кампазіцыйнае наватарства рамана «Птушкі і гнёзды». Шлях у драматургіі *А. Макаёнка.* Месца камедыі «Выбачайце, калі ласка!» у літаратуры 1950-х гг. Тэматычны змест, жанравая навізна твораў 1960–1980-х гг. («Трыбунал», «Зацюканы апостал», «Пагарэльцы», інш.). Майстэрства Макаёнка-камедыёграфа. Станаўленне творчай індывідуальнасці *І. Мележа.* Задума «Палескай хронікі» і яе мастацкая рэалізацыя. Псіхалагічнае майстэрства пісьменніка. Раманы «Палескай хронікі» ў кантэксце літаратуры пра калектывізацыю. *І. Шамякін* пра лёс свайго пакалення ў пенталогіі «Трывожнае шчасце». Актуальнасць праблематыкі, асаблівасці канфліктаў у раманах пісьменніка. Адносіны празаіка да постсавецкай рэчаіснасці (аповесці 1990–2000-х гг.). Ваенная «адысея» *В. Быкава.* Роля пісьменніка ў мастацкім спасціжэнні падзей Вялікай Айчыннай

вайны. Пафас, тэматычная шматпланавасць твораў. Жанравая адметнасць быкаўскай аповесці. Лёс чалавека і народа ў творах 1980–2000-х гг. Выкарыстанне пісьменнікам вобразаў-сімвалаў, прытчы. В. Быкаў і экзістэнцыялізм. Антываенная скіраванасць творчасці *А. Адамовіча.* Роля дакумента ў мастацкім тэксце. Грамадзянская пазіцыя пісьменніка.

*Творчасць пісьменнікаў філалагічнага пакалення.* Рознабаковая выяўленасць таленту *У. Караткевіча.* Значэнне творчасці пісьменніка ў абуджэнні нацыянальнай самасвядомасці. Асаблівасці мастацкай інтэрпрэтацыі мінулага. Народ і шляхта ў паказе пісьменніка. Караткевічаўскія традыцыі ў сучаснай беларускай літаратуры. Шматграннасць творчай асобы *Н. Гілевіча.* Тэматычны дыяпазон паэзіі. Раман у вершах «Родныя дзеці»: кампазіцыя, праблематыка, ідэйны змест твора. Роля біяграфічнага фактару ў паэзіі *Р. Барадуліна.* Скразныя тэмы і матывы творчасці. Паэтычнае майстэртсва пісьменніка. Мастацкая спадчына *М. Стральцова.* Жанравыя і стылёвыя асаблівасці прозы пісьменніка. Стасункі горада і вёскі ў творах. Вобразы герояў-інтэлігентаў. Філасофскі змест аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь».

Уклад у нацыянальную паэзію, прозу, драматургію Г. Бураўкіна, А. Вярцінскага, Я. Сіпакова, В. Зуёнка, Б. Сачанкі, І. Пташнікава, І. Чыгрынава, В. Адамчыка, М. Матукоўскага, А. Петрашкевіча і інш. Філалагічнае пакаленне ў сучасных ацэнках.

### Тэма 7. Літаратурны рух канца XX – пачатку XXI стст.

*Сацыякультурная сітуацыя другой паловы 1980-х – пачатку 1990-х гг.* Зрухі ў грамадска-палітычным жыцці краіны. Вяртанне імёнаў і твораў, перагляд мастацка-эстэтычных крытэрыяў, пераасэнсаванне падзей савецкай гісторыі, з’яўленне новых тэм і праблем. Абноўленае прачытанне творчай спадчыны Я. Купалы, М. Гарэцкага, К. Чорнага, Я. Пушчы і інш. Змены ў творчасці прадстаўнікоў старэйшых пакаленняў. Выхад маладой літаратуры за межы нацыянальнай традыцыі, падключэнне да эстэтычных сістэм еўрапейскага і сусветнага мастацтва.

Грамадзянскі пафас, публіцыстычнасць тагачаснай паэзіі. Адраджэнскія матывы і вобразы ў творах П. Панчанкі, Н. Гілевіча, В. Зуёнка, Р. Барадуліна і інш. Тэма рэпрэсій (лірыка і ліра-эпас С. Грахоўскага, М. Танка, І. Багдановіч, інш.). Рознааспектнасць асэнсавання чарнобыльскай і экалагічнай тэмы. Палярызацыя поглядаў на развіццё паэзіі ў другой палове 1990-х гг: грамадзянскі і эстэцкі кірункі.

Праблемна-тэматычны змест празаічных твораў. Паказ жыцця горада і вёскі (раманы, аповесці, апавяданні В. Гігевіча, А. Жука, А. Федарэнкі, інш.). Асэнсаванне экалагічных праблем (творы І. Шамякіна, В. Казько, І. Пташнікава, С. Алексіевіч, В. Карамазава, інш.). Асэнсаванне трагічных падзей XX ст. (калектывізацыя, сталінскія рэпрэсіі, Вялікая Айчынная вайна) у творах В. Быкава, В. Адамчыка, В. Казько, А. Федарэнкі і інш. Публікацыя напісаных раней, з’яўленне новых твораў «гулагаўскай» тэматыкі. Прадстаўленасць ва ўсіх родах літаратуры гістарычнай праблематыкі. Працяг і

абнаўленне традыцый У. Караткевіча У. Арловым, К. Тарасавым, В. Іпатавай, Л. Дайнекам, інш.

Складанасці ў развіцці нацыянальнай драматургіі. Няпросты шлях беларускай п’есы да гледача. Сучаснасць і далёкае мінулае ў творах пісьменнікаў, актуалізацыя канфліктаў (п’есы М. Матукоўскага, А. Петрашкевіча, А. Дударава і інш.). Набыткі і страты драматургаў новай генерацыі (М. Арахоўскага, А. Курэйчыка, І. Сідарука, П. Васючэнкі, інш.).

Творчыя індывідуальнасці пісьменнікаў-сямідзясятнікаў: В. Казько, Ю. Станкевіча, А. Разанава, А. Жука, В. Гігевіча, Я. Янішчыц, А. Дударава, інш.

*Тэндэнцыі літаратурнага развіцця другой паловы 1990-х – пачатку 2000-х гг.* Крызісныя з’явы ў мастацтве мяжы стагоддзяў. Класічная і масавая літаратура. Спад цікавасці да прыгожага пісьменства. Суіснаванне ў адной мастацкай прасторы пісьменнікаў розных светапоглядных і творчых арыентацый. Пытанне пра новы ўзровень і новыя формы ўзнаўлення рэчаіснасці. «Стомленасць» рэалістычна-апісальнага напрамку ў беларускай прозе. Літаратурныя «традыцыяналісты» і «наватары». Пострэалізм, мадэрнізм, постмадэрнізм на беларускай глебе, іх асаблівасці. Прысутнасць у літаратурным працэсе суполак маладых пісьменнікаў. Заснаванне шэрагу перыядычных выданняў.

Змена літаратурных прыярытэтаў. Традыцыйныя і новыя героі ў жыцці і творчасці. Скіраванасць пісьменнікаў на абнаўленне формаў і сродкаў мастацкай выразнасці, на эксперымент. Трансфармацыя традыцыйных і асваенне нетрадыцыйных для нацыянальнай літаратуры жанраў. «Аўтарскія» жанравыя формы ў сучаснай літаратуры. Спроба стварэння рымейкавай драматургіі (творы С. Кавалёва, У. Бутрамеева). Абумоўленыя зменай грамадска-палітычнай і мастацкай сітуацыі зрухі ў творчасці прадстаўнікоў старэйшых літаратурных пакаленняў. Творчасць пісьменнікаў «новай хвалі» (В. Жыбуля, А. Хадановіча, З. Вішнёва, С. Мінскевіча і інш.).

Творчыя міні-партрэты прадстаўнікоў пакалення «Тутэйшых»: А. Асташонка, У. Бутрамеева, А. Пісьмянкова, Л. Дранько-Майсюка, А. Сыса, А. Наварыча, А. Федарэнкі, інш.

## Раздел II. Всемирная литература

### Тема 8. Основные тенденции и этапы развития мировой художественной литературы: эстетические направления, течения, школы

Стадиальность (периодизация) мирового литературного процесса: традиционные и новейшие точки зрения. Учение Г. Поспелова о стадиальных общностях национальных литератур. Понятия «всемирная литература», «мировой литературный процесс», «региональная (зональная) литература», «национальный литературный процесс». Стадии (этапы) в развитии мировой литературы. Античность в широком и узком понимании. Литература древних восточных циви-

лизаций (шумерская, аккадская, персидская, египетская и др.). Литература Древней Греции и Рима. Парадигматика литературы Средневековья. Возрождение: конкретно-историческая литературная эпоха и парадигма в развитии национальных литератур в разные исторические времена. Принципы выделения этапов в литературе Нового времени. Литература барроко, классицизма. Литературные общности XIX и XX вв.: романтизм, реализм, модернизм, постмодернизм. Основные эстетические течения, школы. Общая характеристика национальных литератур, предопределивших развитие мирового литературного процесса. Специфика их взаимосвязей с белорусской литературой.

### Тема 9. Античная литература

Понятие об античности. Хронологические рамки античной литературы. Значение античной литературы для мирового литературного процесса.

*Греческая литература архаического периода.* Истоки древнегреческой литературы. *Гомеровский эпос* и его главные черты. Поэмы «Илиада» и «Одиссея»: общее и особенное. Тема войны в героическом эпосе. Концепция эпического героя. Боги в поэмах, их отношение к людям. Разнообразие героев в поэме «Одиссея». Образ Одиссея и его символическое понимание в литературе XX в. Художественные особенности произведений. Гомеровский вопрос. Мотивы гомеровского эпоса в белорусской литературе. Послегомеровский эпос. Дидактический эпос («Труды и дни» Гесиода).

Лирическая поэзия. Песенное творчество народа как источник рождения жанров лирики. Основные виды древнегреческой лирики: элегия, ямб, хоровая и сольная мелика. Творчество *Сапфо* и *Анакреонта*: главная лирическая тема, жанры. Понятие «сапфической строфы», использование ее современными авторами. Анакреонтические мотивы в творчестве М. Богдановича.

*Греческая литература классического периода.* Возникновение драмы в древних обрядовых действах. Трагедия и ее эволюция. Жизнь и творчество *Эсхила*. Патриотические мотивы в исторической трагедии «Персы». Идея борьбы за свершение идеалов человечества в трагедии «Прикованный Прометей». Композиция произведения. Значение диалогов и монологов. Образ Прометея в белорусской поэзии. Трагедии *Софокла* («Антигона», «Царь Эдип»). Структура трагедий и ее роль в развитии действия. Героическая личность в произведениях. Драматургическое мастерство автора. Аристотель об искусстве перипетии у Софокла. Драматургия *Еврипида* (трагедия «Ипполит», «Медея»). Характер трагического конфликта в произведениях. Новаторская трактовка личности. Отношение автора к мифу и богам. Художественные нововведения Еврипида. Роль второстепенных образов трагедии. Литературная судьба произведения.

Древняя аттическая комедия. Комедийное мастерство *Аристофана* (комедии «Всадники», «Облака»). Особенности композиции аристофановской комедии. Фантастические сюжетные коллизии и их связь с современностью. Новоаттическая комедия: комедийное мастерство *Менандра*.

Особенности классической прозы. Зарождение и развитие историографии и философии. Загадка Сократа. Развитие ораторского искусства. Начало эстети-

ки в произведениях Платона. «Поэтика» *Аристотеля*, ее влияние на развитие эстетической мысли последующих эпох.

*Литература античного Рима «золотого века».* Истоки римской литературы. Искусство Древнего Рима и литература. Развитие жанров древнегреческой литературы в литературе Рима. «Энеида» *Вергилия* – национальный эпос римлян. Особенности сюжета и композиции. Мифологический материал и римская действительность в поэме. Сравнительный анализ образов богов и героев у Вергилия и Гомера. Использование автором «Энеиды» достижений культуры Греции эпохи эллинизма. Украинская (И. Котляревский) и белорусская (В. Равинский) травестации «Энеиды».

Элегии *Овидия*. «Любовные элегии». Творческая история первой книги «Скорбных элегий». Мотивы уединенности у Овидия-изгнанника. Тема дружбы в произведениях. Концепция поэта и творчества. Художественные особенности элегий Овидия.

Поэтическая система од *Горация*. Особенности построения произведений. Прием авторского обращения в них. Жанрово-тематическое разнообразие од писателя. Стихотворение «Памятник» и его литературная судьба. Образ настоящего поэта в произведениях. Эстетические принципы Горация. Гораций – теоретик римского классицизма.

*Роман в античной литературе.* Греческий роман. Новаторство *Лонга* в романе «Дафнис и Хлоя». Специфика исторического и географического фона. Психологизм произведения. Римский роман. Фольклорные и литературные источники сюжета в романе *Апулея* «Метаморфозы, или Золотой осел». Значение вставных новелл. Вставная сказка об Амуре и Психее. Новаторство Апулея в показе человека. Влияние произведений Лонга и Апулея на процесс становления новоевропейского романа.

## Тема 10. Литература европейского Средневековья

Периодизация. Христианская, античная и народная основы средневековой культуры. Сословный характер общества и наличие двух культур: официальной, религиозной и народной, смеховой. Культурные зоны (регионы) Средневековья. Специфика художественного метода и состав средневековой литературы. Символика Средневековья. Устойчивость сюжетов, типов героев, изобразительных средств.

*Народно-эпическая литература.* Типология эпоса. Периодизация, система мировосприятия в произведениях разных периодов. Парадигма эпического героя. Кельтский эпос: ирландские саги. Легендарный герой уладского цикла саг Кухулин. Исландские саги. Карело-финские руны. Французский национальный эпос «Песнь о Роланде». Образ народного героя-патриота Роланда. Сравнительный анализ «Песни о Роланде» и «Слова о полку Игореве». Немецкий героический эпос «Песнь о Нибелунгах». Южнославянский эпос (циклы о Косовом поле и о Марке Королевиче).

*Поэзия Средневековья.* Лирика вагантов. Истоки поэзии вагантов, фигуры ее создателей. Художественное мастерство вагантов. Сборник поэзии вагантов «Carmina Burana». Влияние творчества вагантов на лирику эпохи Возрождения,

мировую литературу. Поэзия трубадуров, труверов, миннезингеров: рыцарский кодекс поведения, культ Прекрасной Дамы в произведениях.

*Рыцарский (куртуазный) роман.* Истоки рыцарского романа. Немецкий рыцарский роман. Циклы французского рыцарского романа. «Роман о Тристане и Изольде»: основные версии сюжета. Противостояние Тристана и Изольды религиозно-феодальным догмам. Моральный выбор в средневековом понимании. Белорусская версия произведения. М. Богданович о романе.

*Городская литература.* Культура средневекового города. Сатира и дидактика как ведущие направления средневековой городской литературы. Основные жанры: фаблио, шванки, сатирические стихотворения. Животный эпос и дидактико-аллегорическая поэма. Творчество Ф. Вийона. Жанры драматургии.

## Тема 11. Литература эпохи Возрождения

Основные понятия Возрождения. Три основных этапа в развитии ренессансной культуры. Новая система литературных жанров. Концепция человека и ее воплощение на разных этапах Ренессанса.

*Итальянская литература эпохи Возрождения.* Личность *Данте* в истории итальянской литературы. «Божественная комедия» как синтез двух культур – средневековой и ренессансной. Архитектоника поэмы. Аллегории и символы в арсенале художественных средств произведения. Функция лирического героя в поэме. Гуманизм Данте, его понимание человека и человеческого счастья. Образ Данте в произведениях М. Танка, В. Короткевича. Инфернальные мотивы в белорусской поэзии. *Ф. Петрарка*: жизнь и главные произведения. Сонеты Петрарки – вершина любовной лирики раннего Возрождения. Образ Лауры. *Дж. Боккаччо* как создатель новеллы Возрождения. «Декамерон» – основная книга автора. Повесть «Фьяметта» – первое психологическое произведение нового времени.

*Французская литература эпохи Возрождения.* Место Франции в ренессансной культуре. *Ф. Рабле.* «Гаргантюа и Пантагрюэль»: стилевая многоплановость романа. Место смеховой стихии в произведении. М. Бахтин о творчестве Ф. Рабле. Б. Деперье и сборник новелл «Новые забавы и веселые разговоры». *М. Наваррская.* «Гептамерон». Автобиографическая основа сборника. Моралистическая литература как жанр. «Опыты» М. Монтеня – наиболее значительное произведение заключительного этапа французского Возрождения.

*Испанская литература эпохи Возрождения.* «Золотой век» Возрождения в Испании. Место и роль плутовского романа в испанской литературе. *Мигель де Сервантес.* «Дон Кихот» как сочетание плутовского, рыцарского, пасторального жанров. Многоликость художественного образа и языковой стихии в произведении. Природа комического в романе. Эволюция главных героев. Роман Сервантеса как фактор своего времени и будущего. Понятие «донкихотства». Вечный образ Дон Кихота в мировой литературе. Расцвет испанского театра. *Лопе де Вега.* Тема любви и ее воплощение в пьесе «Собака на сене». *Тирсо де Молина.* Драма «Севильский озорник, или Каменный гость» – начало бесконечной галереи дон жуанов в мировой литературе. Сравнительный анализ развития темы любви у Лопе де Веги и Тирсо де Молины.

*Английская литература эпохи Возрождения.* Социально-политические условия развития литературы в Англии времен Ренессанса. Роль и место театра в английской культуре. Творчество *В. Шекспира.* Жанровое многообразие художественного наследия писателя (сонеты, комедии, трагедии, хроники и др.). Шекспировский вопрос. «Гамлет»: основные фабульные элементы знаменитой трагедии. Сюжетообразующая роль монолога «Быть или не быть?». «Гамлет» – драма поэтическая (античные образы, исторические предания, аллегории, песенный фольклор). «Гамлет» – драма философская. Переводы В. Шекспира на белорусский язык. Обзор творчества Дж. Чосера, Т. Мора.

## Тема 12. Литература XVII–XVIII веков

*Барокко.* Кризис гуманизма. Литературная борьба. Формирование основных литературных направлений. Барокко в Испании. *П. Кальдерон*, его историко-философские драмы. Жанр плутовского романа в испанской литературе. Барокко в Германии. Поэзия Тридцатилетней войны (М. Опиц, П. Флеминг, А. Грифиус, народная песня): основные мотивы, образы. Роман *К. Гриммельсгаузена* «Симплициссимус»: двойственность человека и мира. Барокко у славян.

*Классицизм.* Философская основа классицизма. Исторические этапы в развитии классицизма во Франции. Теория классицизма Н. Буало. Оды Ф. Малерба, басни Ф. Лафонтена, проза Ф. Ларошфуко и др. Жанры трагедии и комедии. Пьеса «Сид» П. Корнеля и «Андромаха» Ж. Расина как образец воплощения эстетических принципов классицизма. *Ж.Б. Мольер* и французский классицизм. Драматургическая реформа Мольера. История создания, сценическая судьба комедии «Тартюф». Основной конфликт произведения. Особенности композиции. Многозначность финала комедии. Тартюф как вечный образ. «Мещанин во дворянстве»: история создания пьесы, журденовский идеал образованного и воспитанного человека. Традиции Мольера в творчестве Ф.У. Радзивилл, В. Дунина-Марцинкевича.

*Просвещение.* XVIII в. и его место в истории мировой литературы. Просвещение как комплекс идей в культурном движении Европы. Связь литературы с философией и эстетикой. Основные литературные направления. Понятие о просветительском классицизме и просветительском реализме. Сентиментализм как направление Зрелого Просвещения. Предромантизм. Литературные жанры.

Особенности Просвещения в Англии. Становление романного жанра (Д. Дефо, Дж. Свифт, С. Ричардсон, Г. Филдинг). Роман странствий и приключений. Робинзонада в мировой литературе. Английская поэзия XVIII в. Лирика *Р. Бернса* как летопись родного края и биография времени. Жанровое новаторство творчества поэта.

Просвещение во Франции. Философские основы французского Просвещения: Вольтер, Д. Дидро, Ж.Ж. Руссо. Общественно-политическое значение деятельности французских просветителей. Литературное творчество идеологов Просвещения. Появление социально-политической комедии во французской литературе («Севильский цирюльник», «Женитьба Фигаро» П. де Бомарше). Популярность идей французского Просвещения в Европе (в т.ч. Беларуси).

Просвещение в Германии. Успехи немецкого Просвещения в области философии и теории искусства (труды Г.Э. Лессинга). Национально-культурное движение «Буря и натиск». Гете и Шиллер как представители штюрмерства. Творческая эволюция *Ф. Шиллера*. Художественный мир баллад. Мировое значение драматургии писателя. Этапы творчества *И.В. Гете*. Многогранность творческой личности писателя. Трагедия «Фауст» – вершина и синтез немецкого и общеевропейского Просвещения. Творческая история произведения. Художественный универсализм «Фауста». Философская насыщенность образов. Путь Фауста как парадигма судьбы человека и всего человечества. Влияние произведения Гете на дальнейшую литературную традицию.

### Тема 13. Литература Западной Европы XIX – начала XXI веков

*Всемирная литература XIX в. Романтизм.* Новый этап в развитии мирового литературного процесса. Формирование основных литературных направлений (романтизм, реализм) в европейских литературах. Социально-политические, эстетические предпосылки возникновения романтизма. Философское обоснование идей романтизма. Романтизм как литературно-художественное направление.

*Романтизм в литературе Германии.* Программные труды («Фрагменты» Ф. Шлегеля). Поэзия немецкого романтизма. Цикл баллад «Немецкие народные предания» А. Шамиссо. Творческое наследие *Г. Гейне*. Поэтическое новаторство писателя. Жанровые особенности «Книги песен». Доминантные темы и образы. Эволюция романтического мироощущения лирического героя. Проза немецкого романтизма. Творчество *Э.Т.А. Гофмана*. Романтические произведения писателя (повести-сказки «Золотой горшок», «Крошка Цахес…», «Щелкунчик», роман «Житейские воззрения кота Мура» и др.). Гофмановская концепция романтического героя. Эстетическая сущность романтической иронии. Тема творчества в произведениях Гофмана. Роль фантастики и авантюрности.

*Романтизм в литературе Англии.* Расцвет поэзии в творчестве представителей «Озерной школы». Своеобразие лирики *Дж.Г. Байрона*. Жанровое новаторство поэмы «Паломничество Чайльд Гарольда». Лирический и эпический планы повествования. Концепция романтического героя в поэме. Восточные поэмы «Корсар», «Гяур». Байронизм как специфическое направление европейской романтической мысли. Влияние байронизма на белорусскую поэзию. Английская романтическая проза: *В. Скотт* – создатель жанра исторического романа. «Шотландские» и «английские» циклы романов. Особенности воссоздания истории в произведениях писателя. В. Скотт и В. Короткевич.

*Романтизм в литературе Франции.* Предисловие к драме *В. Гюго* «Кромвель» как литературный манифест французского романтизма. Жанр исторического романа в творчестве В. Гюго. «Собор Парижской Богоматери»: эстетическая и философская идеи романа. Демонический характер любви в произведении. Роль и место Собора в структуре романа. Исключительность характеров и обстоятельств. Синтез искусств. *Ж. Санд* и романтизм. Лирико-романтический характер женских образов писательницы. Романы «Консуэлло», «Графиня Ру-

дольштадт». Роль мистических элементов в раскрытии образа Консуэлло. Утопический характер мироздания в творчестве Ж. Санд.

*Литература XIX в.: реализм.* Основные принципы реализма. Типология литературно-художественного направления. Понятие «критический реализм». Реализм в литературе Франции. Главные принципы реалистического искусства в творчестве *О. де Бальзака*. «Гобсек» и «Шагреневая кожа» в контексте «Человеческой комедии» писателя. Образ Гобсека и тема власти денег. «Шагреневая кожа» – философский «этюд». Роль фантастического в романе. Многозначность символики. Мастерство *Ф. Стендаля* и реалистически-психологический роман XIX в. «Красное и черное»: творческая история произведения. Влияние революционной эпохи Наполеона на формирование характера Жюльена Сореля. Эволюция духовной жизни героя. Значение символики в романе. Эстетические взгляды, литературное наследие *Г. Флобера*. Образ госпожи Бовари в одноименном романе. Особенности исторического романа в творчестве писателя («Саламбо»).

